Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 МАЯ 2017 г. СУБОТА №94 (28458)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ХАКЕЙНАЕ СВЯТА ВЯРТАЕЦЦА Ў БЕЛАРУСЬ

### Наша краіна сумесна з Латвіяй прыме чэмпіянат свету ў 2021 годзе

**Такое рашэнне было прынята па выніках галасавання ў ходзе кангрэса Міжнароднай федэрацыі хакея ў Кёльне.**

Галасаванне праходзіла ў два кругі, у ім прымалі ўдзел дэлегаты з 67 нацыянальных асацыяцый, а таксама члены Савета ІІХФ. У першым раўндзе заяўка Мінска і Рыгі набрала 54 галасы супраць 53-х за тое, каб чэмпіянат прымала Фінляндыя. Па правілах ІІХФ такой мінімальнай розніцы недастаткова, каб аддаць мундыяль камусьці з бакоў, таму галасаванне было праведзена яшчэ раз. І зноў перавага была на нашым баку: 55 супраць 52 галасоў. Тэрміны правядзення мінска-рыжскага планетарнага форуму — 7—23 мая 2021 года. У Беларусі матчы чэмпіянату прыме «Мінск-Арэна», якая змяшчае 15 086 гледачоў, у Латвіі — «Арэна-Рыга», на трыбунах якой 10 300 глядацкіх месцаў. Матчы групавой стадыі і па два чвэрцьфінальныя паядынкі прымуць абедзве сталіцы, а паўфінальныя матчы, гульні за «бронзу» і «золата» адбудуцца ў Мінску.

Слоганам заявачнай кампаніі, а цяпер ужо і самога чэмпіянату свету стаў «Passion. No Borders» (Захапленне. Без меж). Ён адлюстроўвае запал беларускага і латвійскага народаў да хакея і спорту ўвогуле.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

2021 IIHF ICE HOCKEY WORLD CHAMPIONSHIP BELARUS - LATVIA Minsk - Riga Applicant

# АПОРА ГРАМАДСТВА

### Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з кіраўніком Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі

**Аб'яднанні працоўных — магутная сіла. Нездарма агульная колькасць членаў, што ўваходзяць у Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі (ФПБ), — амаль палова ўсяго насельніцтва нашай краіны і 95% усіх эканамічна актыўных грамадзян. Учора кіраўнік нашай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Міхаілам Ордам, старшынёй ФПБ, і абмеркаваў з ім шэраг важных для грамадства тэм.**

### Ад «пярвічкі» да кіраўніцтва

Першае пытанне, якое захацеў абмеркаваць Прэзідэнт, — гэта ўпарадкаванне структуры прафсаюзных арганізацый.

— Больш за чатыры мільёны чалавек у прафсаюзе — гэта і партыя, і грамадскі рух, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Справа ў тым, што партыйная сістэма ў Беларусі ніякая, і штучна мы яе ствараць не будзем. Калі партыі здольныя да ўзнаўлення, умацавання, мы будзем гэты працэс падтрымліваць. Але ёсць дзве магутныя арганізацыі ў краіне: гэта прафсаюз — больш за чатыры мільёны — і грамадская арганізацыя «Белая Русь».

Па словах кіраўніка дзяржавы, прафсаюзныя арганізацыі іграюць істотную ролю ў жыцці нашага грамадства:

— Я не толькі кажу па тых пытаннях, якімі традыцыйна прафсаюзы займаліся і займаюцца, але і ўвогуле — у грамадска-палітычным жыцці. Я, напрыклад, хацеў бы гэтага. Таму для мяне вельмі важна, як ідзе структурная перабудова, пра якую мы некалі з вамі дамаўляліся. Перш за ўсё ўнізе: як ствараюцца пярвічныя арганізацыі на прадпрыемствах прыватнай формы ўласнасці, як там ідзе працэс, ці няма тармажэння. А наверсе — мы казалі пра галіновыя прафсаюзы. У нас ужо занадта іх было шмат.

Прэзідэнт нагадаў, што аб'яднанне галіновых прафсаюзаў павінна ісці на карысць.

— Паколькі, яшчэ раз падкрэсліваю, я буду значную ўвагу надаваць развіццю прафсаюзнага руху, — патлумачыў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта наша апора. І мая, як Прэзідэнта. Я назіраю за тым, што адбываецца ў прафсаюзах.

### Народны кантроль за цэнамі

Другім блокам размовы стаў удзел прафсаюзнага руху ў дасягненні найважнейшых сацыяльных мэт:

— Я бачу ў сродках масавай інфармацыі і вам удзячны за тое, што ініцыятыўным чынам вы далучаецеся да кантролю ў выкананні пастаўленых трох задач: цэнаўтварэнне, занятасць, заработная плата.

Прэзідэнт расказаў, што чуў аб ініцыятыве ФПБ арганізаваць народны кантроль за цэнамі ў магазінах.

— Усё ў справаздачах, у статыстыцы і правільна, і добра па методыках, і цэны не вельмі растуць, але ў магазінах па асноўных таварах, па асноўных прадуктах харчавання сітуацыя можа быць іншая, — прызнаў кіраўнік краіны. — Якая яна? Хто як не прафсаюз гэта лепш за ўсё ведае? Вельмі падтрымліваю гэтую ініцыятыву аб кантролі за цэнаўтварэннем — народным кантролем. Нават не цэнаўтварэннем, а за цэнамі ў гандлёвых арганізацыях непасрэдна — там, дзе людзі набываюць гэты тавар. СТАР. 2

## РЭФАРМАВАННЕ МУС — НА КАНТРОЛІ ПРЭЗІДЭНТА

**Падчас рабочай сустрэчы з міністрам унутраных спраў Ігарам Шуневічам Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся тэндэнцыямі і насцярожваючымі фактарамі ў праваахоўнай сферы. У размове была закранута і тэма аптымізацыі ў сілавой галіне.**

— Армія па сваім плане скарачаецца, даўно гэты план зацверджаны. Для МУС таксама мы з вамі дамовіліся аб планах аптымізацыі. Гэта аптымізацыя МУС пачалася даўно, і яна працягваецца. Як зараз ідуць справы? — спытаў Прэзідэнт.

Ён звярнуўся і да тэмы рэфармавання сістэмы праваахоўных органаў:

— Ёсць праблемы ці іх няма? Яны пераадольныя або не? Якія ёсць пытанні ў гэтым плане? Для мяне гэта вельмі важна, я гэта трымаю на кантролі. Можа, патрэбна ўжо і маё ўмяшальніцтва па нейкіх пытаннях? Або пакуль час церпіць і справы ідуць нармальна?

Ігар Шуневіч прапанаваў скараціць — у тым ліку цэнтральны апарат МУС — амаль на 10%. Па яго словах, падлягае скарачэнню пасада аднаго з намеснікаў міністра, таксама будзе рэфармаваны шэраг падраздзяленняў органаў унутраных спраў.

Падчас сустрэчы абмяркоўваўся і спартыўны складнік.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Руплівым гаспадарам

# ВІТАМІННЫ КАНВЕЕР




Так мы садзілі міні-ківі.

Фота Надзеі БУЖАН.

**Калі беларусы выязджаюць на адпачынак, звяртаюць увагу ў гіпермаркетах на ўпакоўкі з міні-ківі. Гэта актынідыя — культура, якая паспяхова пакарае еўрапейскія сады. Сёння яе можна вырошчваць і ў Беларусі як альтэрнатыву ківі, па смаку яны падобныя.** СТАР. 5

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Рэнэ ФАЗЕЛЬ, прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі хакея (ІІХФ)**

*«Федэрацыя хакея Беларусі правяла сур'ёзную работу для атрымання чэмпіянату свету 2021 года. Перамога Мінска і Рыгі была нечаканай для многіх. У ходзе галасавання адбыўся невялікі канфуз. Прыйшлося правесці другі раўнд, які толькі пацвердзіў вынікі першага тура. Гэта гаворыць толькі пра тое, якую сур'ёзную працу правялі федэрацыі хакея абедзвюх краін, як добра яны папрацавалі. Упэўнены, што турнір будзе не менш паспяховы, чым турніры ў Рызе ў 2006 годзе і ў Мінску ў 2014 годзе».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.05.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8609 | ▼ |
| Еўра | 2,0751 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0325 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0705 | ▼ |

■ Круглы стол

# ПОСТАЦЬ, ЯКАЯ ЯДНАЕ

### Ці з'явіцца ў сталіцы плошча імя Эдварда Вайніловіча?



**Шчодры мецэнат, яркі грамадскі дзеяч свайго часу, Эдвард Вайніловіч пакінуў па сабе выключна станоўчыя ўспаміны. Яго постаць асацыюецца толькі са стваральнай дзейнасцю, а асоба лічыцца прыкладам высокай маральнасці, духоўнасці, хрысціянскага светапогляду. Ён годна пражыў жыццё, вытрымаў усе ўдары лёсу, у тым ліку страшную трагедыю — смерць дзяцей і жонкі. Больш як год назад быў распачаты працэс беатыфікацыі (прызнання святым) Эдварда Вайніловіча, і ўжо сёння пройдзены першы этап — каталіцкай царквой ён лічыцца блаславёным.**

**Два гады таму «Звязда» ўжо ўздымала тэму значнасці шырокай папулярызацыі спадчыны мецэната, грунтоўнага даследавання яго жыцця і дзейнасці. Сёлета, калі мы будзем адзначаць 170-годдзе Эдварда Вайніловіча, гэтая тэма зноў набывае важнасць. Тым больш істотная ініцыятыва надання яго імя адной з плошчаў сталіцы. Таму, каб абмеркаваць за круглым сталом зробленае за два гады і пагутарыць пра перспектывы далейшых даследаванняў, мы зноў запрасілі ў рэдакцыю экспертаў. Да нас завіталі: дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, прафесар, доктар філалагічных навук Адам МАЛЬДЗІС і загадчык аддзела гісторыі Беларусі Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук Андрэй УНУЧАК.**

### Ён беларус, з нашых земляў

***— Колькі месяцаў таму пачала гучна прамаўляцца ідэя аб наданні плошчы ў Мінску, непадалёк ад касцёла Святых Сымона і Алены, імя фундатара гэтага храма Эдварда Вайніловіча. Крок цалкам лагічны, бо Вайніловіч шмат зрабіў дзеля развіцця духоўнасці не толькі сталіцы, але і іншых гарадоў Беларусі. Як навукова-гістарычная супольнасць успрыняла гэтую ініцыятыву, і што ў цэлым варта зрабіць для яшчэ больш шырокай папулярызацыі спадчыны нашага выдатнага земляка?***

**Вячаслаў Даніловіч:**

— 2017 год абвешчаны ў Беларусі Годам навукі, і вельмі сімвалічна, што якраз на гэты год прыпадае шэраг знакавых для нашай гісторыі юбілеяў. Гэта 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, 950-годдзе Мінска, 100-годдзе лютаўскай і кастрычніцкай рэвалюцый, сёлета мы адзначым і 170-годдзе з дня нараджэння Эдварда Вайніловіча. Таму ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі мы асабліва шмат увагі ўдзяляем пашырэнню звестак і папулярызацыі айчыннай гісторыі. Робім гэта, каб выхоўваць падрастаючае пакаленне, даносіць да шырокай грамадскасці звесткі пра знакавых постацяў гісторыі, якія звязаныя са стваральнай дзейнасцю, з'яўляюцца выдатным прыкладам служэння радзіме, таму месцу, дзе нарадзіліся. Эдвард Вайніловіч, безумоўна, адна з такіх асоб.

Таму, натуральна, на наш погляд, варта назваць адну са сталічных вуліц ці плошчаў або сквер (гэта ўжо будзе рашэнне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта) у гонар Эдварда Вайніловіча. Гэта будзе знакавае рашэнне. Я хацеў бы падкрэсліць, што гэты чалавек быў перадусім стваральнікам. Ён адзін з нямногіх прадстаўнікоў нашай шляхты, які адкрыта казаў, што ён беларус і паходзіць з нашай мясцовасці. Для яго беларуская зямля родная. У сваіх успамінах Вайніловіч пісаў: «Род наш ні перад кім не здымаў шапкі, Вайніловічы не прыйшлі ні з захаду, ні з усходу, яны карэнныя, мясцовыя, кроў ад крыві і косць ад косці гэтага народа, які калісьці хаваў сваіх прадстаўнікоў у гэтых курганах, а цяпер на вясковых могілках, і родную сваю зямлю беларускую арэ сахой». Мы бачым, што Вайніловіч выдатна ўсведамляў: тут яго карані, ён паходзіў з гэтай зямлі і па магчымасці рабіў усё, каб умацаваць яе, усю краіну, садзейнічаць дабрабыту людзей, якія тут жывуць, і даць ім магчымасць плённа развівацца і надалей. СТАР. 6




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Парламент Грэцыі падтрымаў новы пакет мер жорсткай эканоміі



Дакумент прадугледжвае павышэнне падаткаў і скарачэнне памеру пенсій. Пры неабходных для прыняцця 151 галасе законапраект падтрымалі 153 дэпутаты з 300. Галасаванне прайшло напярэдадні пасяджэння Еўрагрупы, падчас якога 22 мая ўдзельнікі павінны будуць ацаніць эфектыўнасць рэформаў у Грэцыі і вырашыць пытанне аб прадастаўленні Афінам чарговага траншу ў 7,5 млрд еўра.

### Урад Японіі ўхваліў законапраект аб адрачэнні імператара Акіхіта

Законапраект дазваляе адрачэнне імператара Акіхіта і перадачу трона яго старэйшаму сыну — наследнаму прынцу Нарухіта. Дакумент перададзены на зацвярджэнне ў парламент. Як паведамляе інфармацыйнае агенцтва Kyodo, ён можа быць прыняты ў сярэдзіне чэрвеня. Законапраект распрацаваны спецыяльна для 83-гадовага імператара Акіхіта, які ў жніўні мінулага года ў відэазвароце да народа выказаў жаданне адысці ад спраў з-за сталага ўзросту.

### Мадура заявіў пра неабходнасць змяніць канстытуцыю Венесуэлы

Прэзідэнт лічыць, што трэба ўмацаваць канстытуцыю 1999 года і замацаваць у ёй усе сацыяльныя правы і праграмы, каб даць народу Венесуэлы максімальную бяспеку і сацыяльную стабільнасць. Пра гэта ён заявіў падчас сустрэчы з рабочымі і студэнтамі, трансляцыю якой вёў тэлеканал Venezolana de Television. У пачатку месяца кіраўнік краіны падпісаў указ аб скліканні Канстытуцыйнай асамблеі — выбарнага органа, які можа рэфармаваць асноўны закон.

### Перамовы па выхадзе Вялікабрытаніі з ЕС запланаваны на 19 чэрвеня

Галоўны перамоўшчык ЕС па Brexit Мішэль Барні запланаваў пачаць перамовы па выхадзе Вялікабрытаніі з Еўрасаюза 19 чэрвеня, праз 11 дзён пасля правядзення пазачарговых парламенцкіх выбараў у Злучаным Каралеўстве. Пра гэта паведамляе газета The Guardian. Паводле яе інфармацыі, раніцай гэтага дня ён сустрэнецца з брытанскім міністрам па пытаннях Brexit Дэвідам Дэвісам, каб выпрацаваць магчымыя варыянты выхаду. ЕС пры гэтым настойвае на падзеле перамоў на чатыры цыклы па тыдні, кожны з якіх будзе прысвечаны аднаму ключавому пытанню, дадае выданне. Так, першы тыдзень будзе ўключаць у сябе палітычную падрыхтоўку, далей тыдзень, падчас якога абодва бакі абнародуюць звязаныя з Brexit дакументы. На трэцім тыдні Барні і Дэвіс правядуць перамовы ў Бруселі, а таксама, магчыма, у Лондане. І, нарэшце, падчас чацвёртага тыдня галоўны перамоўшчык ЕС па Brexit прадставіць даклад аб выніках узаемнай праведзенай работы перад Саветам ЕС і Еўрапарламентам, піша Guardian.

ISSN 1990 - 763X

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Дзіцячая міграцыя б'е рэкорды

Колькасць непаўналетніх беженцаў і мігрантаў, якія перасоўваюцца без суправаджэння дарослых, за апошнія 5 гадоў павялічылася ў 5 разоў. Такія звесткі ўтрымліваюцца ў дакладзе дзіцячага фонду ААН ЮНІСЕФ, у якім указваецца, што, калі ў 2010—2011 гадах у 80 краінах свету было зарэгістравана 66 тысяч такіх дзяцей, то за апошнія два гады — 300 тысяч. Напярэдадні саміту «вялікай сямёркі» ў Італіі ЮНІСЕФ прапанаваў сусветным лідарам зацвердзіць праграму па абароне дзяцей-мігрантаў. Яна, у прыватнасці, прадугледжвае прыняцце мер па прадухіленні эксплуатацыі і гвалту над імі, спынення іх утрымання пад вартай і забеспячэнне доступу да адукацыі, аховы здароўя.



## КОРАТКА

Чаканая працягласць жыцця беларусаў у 2017 годзе перасягне 74 гады, заявіў міністр аховы здароўя Валерый Малашка.

**Аб'ём фінансавання ў 2017 годзе праектаў па стварэнні ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі пілотных інавацыйных аб'ектаў складзе BYN 8,9 млн.**

Грамадзяне Беларусі з 19 мая могуць уязджаць, перамяшчацца транзітам і часова знаходзіцца на тэрыторыі Аргенціны без віз на працягу перыяду, які не перавышае 90 сутак з дня першага ўезду, паведамляецца на сайце пасольства Беларусі ў Аргенціне.

**Амаль 200 зваротаў паступіла на гарачую лінію Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю па фактах завышэння цэн.**

Алімпійская чэмпіёнка Юлія Несцярэнка афіцыйна аб'явіла аб завяршэнні спартыўнай кар'еры. Легендарная «белая маланка» заваявала залаты медаль на самай прэстыжнай дыстанцыі — у бегу на 100 метраў на летніх Алімпійскіх гульнях у Афінах у 2004 годзе.

**Класічная музыка будзе гучаць у сталічнай падземцы. Культурны праект «Гукі метро.**

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## АДЛЮСТРОЎВАЕЦЕ ЖЫЦЦЁ ПРОСТЫХ ЛЮДЗЕЙ

**Таццяна Васілеўна МІХЕЕВА, намеснік генеральнага дырэктара па кадрах, ідэалагічнай рабоце і сацыяльных пытаннях прадпрыемства «АМКАДОР» — кіруючая кампанія холдынгу»:**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— «Звязда», як і ўсе газеты, цікавая інфармацыйнымі матэрыяламі. Але гэта не галоўнае. Для мяне ваша газета — выток трапнага беларускага слоўца. На старонках я перш-наперш шукаю маленькія замалёўкі Валянціны Доўнар. Учора якраз перачытвала. У гэтых замалёўках адлюстроўваецца жыццё простых людзей, мне гэта вельмі падабаецца. Да таго ж я вырасла ў горадзе, і мне заўсёды было цікава, як размаўляюць у вёсцы, у глыбінцы. Хацела б падзякаваць Валянціне Доўнар за тое, як яна шануе слова, як працуе з ім. У яе творах я бачу сапраўднае жыццё беларускай мовы — не літаратурнай і замкнёнай, а народнай.

У юбілейны год «Звязды», хацела б пажадаць, каб газета жыла, каб у яе было сваё кола чытачоў. Інфармацыі ёсць дзе пачарпнуць, але тое, што «Звязда» піша аб падзеях у рэгіёнах, у невялічкіх вёсачках, адрознівае яе ад іншых выданняў. Няхай гэта ўсё захоўваецца, няхай нам будзе цікава сустракацца на старонках газеты з роднай мовай і з такімі ж простымі людзьмі, як мы.

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА, 5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# АПОРА ГРАМАДСТВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу, што прафсаюзы заўсёды шмат увагі надавалі вырашэнню праблемы занятасці:

— І я таксама буду прасіць, каб вы ад гэтага пытання не адыходзілі. Ну і заработная плата — як вынік. Адступаць няма куды. Вы гэта разумееце не горш, чым я, паколькі сутыкаецеся кожны дзень з людзьмі, якім мы хочам падняць узровень заработнай платы. Таму гэтыя пытанні трымайце ў полі зроку.

## Спартыўны пласт

Трэцяй тэмай, што паднімалася падчас сустрэчы, стаў спорт. Так, цяпер ідзе сур'ёзнае перафармаціраванне спартыўнай сферы краіны.

— Мы вельмі сур'ёзна вырашылі гэтым заняцца. Цяпер ідуць справаздачы і выбары ў федэрацыях. Спецыялісты прыходзяць да кіраўніцтва федэрацыямі. Ідэя такая, што федэрацыю павінен узначальваць спецыяліст — вызвалены чалавек.

А вось назіральныя саветы, па словах Аляксандра Лукашэнкі, узначаляць службовыя асобы высокага рангу.

Кіраўнік дзяржавы таксама заклікаў прафсаюзы больш актыўна ўдзельнічаць у развіцці вялікага спорту:

— У прафсаюзаў велізарны спартыўны пласт. Па вашых справаздачах, вы кожны год ледзь не паўтысячы выдаяце наверх спартсменаў, якія гатовы стаць вялікімі. А дзе яны? Іх не відаць. Таму тут нам таксама трэба нешта зрабіць, каб у вас цэлая галіна была. Можа быць, і не трэба нікуды іх перадаваць. А калі і перадаваць, то іх трэба весці, кантраляваць, каб мы іх не страцілі. А так вы, здаецца, 500 чалавек і перадалі, а вынікаў у вялікім спорце мы не бачым.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

### У тэму

### 2018 ГОД МОЖА СТАЦЬ ГОДАМ ЧАЛАВЕКА ПРАЦЫ

**Пасля сустрэчы з Прэзідэнтам Міхаіл Орда, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, расказаў журналістам, што галоўныя пытанні падчас размовы датычыліся эканомікі.**

— Мы ўнеслі прапановы па шэрагу пастаноў урада ў мэтах іх удасканалення, — паведаміў Міхаіл Орда. — У прыватнасці, пытанне па 744-й Пастанове ўрада, якая сёння вызначае фарміраванне заработнай платы. І мы сёння цалкам згодны з тым, што рост заработнай платы павінен суправаджацца ростам прадукцыйнасці працы. Адначасова мы бачым, што гэтая пастанова не ўлічвае шэрагу аб'ектыўных фактараў, якія ёсць сёння ў рабоце нашых прадпрыемстваў. Гэта і сезоннасць, і спецыфіка прадпрыемстваў. Сёння гэтая пастанова недзе падтармажвае развіццё прадпрыемстваў, а недзе нават штучна стрымлівае яго.

Старшыня ФПБ таксама паведаміў, што агучыў Прэзідэнту ініцыятыву арганізацыі: наступны год аб'явіць Годам чалавека працы. На думку Міхаіла Орды, гэта будзе садзейнічаць павышэнню прэстыжу рабочых прафесій.

# «ВЯЛІКАМУ КАМЕНЮ» — НАЙЛЕПШЫЯ ЎМОВЫ

**Для рэзідэнтаў Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» ствараецца найлепшы прававы рэжым вядзення камерцыйнай дзейнасці ў параўнанні з іншымі рэжымамі ў Беларусі і краінах ЕАЭС. Адпаведны Указ №166 ад 12 мая падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.**

Дакумент вызначае парадак дзейнасці адміністрацыі парка па прынцыпе «адна станцыя». Дзяржорганы па запыце адміністрацыі парка будуць абавязаны накіроўваць сваіх супрацоўнікаў у парк для выканання адміністрацыйных працэдур. Гэта значыць заяўніку не трэба будзе хадзіць па кабінетах выканкамаў, міністэрстваў ці іншых арганізацый. Указ прадугледжвае стварэнне ў парку зоны свабоднага гандлю, а таксама ўстанаўлівае механізм узгаднення з адміністрацыяй парка праверак, якія праводзяцца ў рамках кантрольнай дзейнасці ў дачыненні да суб'ектаў парка.

Акрамя таго, пашыраны крытэрыі для рэгістрацыі ў якасці рэзідэнтаў парка: павялічаны пералік асноўных кірункаў рэалізацыі інвестыцыйных праектаў і паніжаны мінімальны парог па аб'ёме інвестыцый пры ўмове іх укладанняў у сціслы тэрмін.

■ Эканоміка

# ЗБАЛАНСАВАНЫ І РЭАЛІСТЫЧНЫ

## Такім будзе рэспубліканскі бюджэт у 2018-м

**Дзяржаўная казна захавае сацыяльную накіраванасць і будзе фарміравацца зыходзячы з кансерватыўнага сцэнарыя. Пры тым праект канцэпцыі прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2018 год будзе ўнесены ў Савет Міністраў да канца мая, паведаміў намеснік міністра эканомікі Аляксандр Чарвякоў. Пра гэта стала вядома падчас семінара аб арганізацыі бюджэтнага працэсу ў Беларусі, што адбыўся ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.**

«Трэба дакладна размежаваць утрыманскія настроі і грамадскія інтарэсы. Зарплата павінна быць зароблена, тавар — прададзены, а бюджэт — працаваць на развіццё. Падтрымліваць неабходна тых, хто без гэтага не пражыве: дзяцей, старых, інвалідаў, іншыя сацыяльна неабароненыя слаі насельніцтва. Астатнім трэба стварыць умовы, каб яны маглі зарабляць самастойна», — сказаў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.**

Па словах **Людмілы ДАБРЫНІНАЙ, старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах,** бюджэт у наступным годзе будзе накіраваны на павышэнне інвестыцыйнай і інавацыйнай дзейнасці, на выкананне асноўных абавязацельстваў перад насельніцтвам, а таксама на вырашэнне агульных задач, што стаяць перад эканомікай сёння.

**Уладзіслаў ШЧЭПАЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы,** падкрэсліў, што бюджэт будзе фарміравацца па кансерватыўным сцэнарыі. «У яго будуць закладвацца пэўныя рызыкі ў знешнеэканамічнай дзейнасці, ён будзе рэалістычны, будзе мець сацыяльную накіраванасць, а таксама рашаць найважнейшыя пытанні, якія стаяць перад краінай: экспарту, бяспекі, сацыяльных гарантый, фарміравання інвестыцыйнага клімату, — дадаў ён. — Прагноз на наступны год не вельмі аптымістычны, чакаць значнага эканамічнага росту не даводзіцца. Але мы працуем у межах таго прагнозу пяцігодкі, які маецца».

**Намеснік міністра эканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ** растлумачыў, што падчас фарміравання бюджэту на 2018 год прапануецца разглядаць тры сцэнарыі прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця: базавы, мэтавы і кансерватыўны. «Пры распрацоўцы кансерватыўнага сцэнарыя ўлічваюцца магчымасці рэалізацыі тых рызык, якія негатыўна могуць адбіцца на развіцці асноўных гандлёвых партнёраў і значна пагоршыць цэнавую кан'юнктуру на знешніх рынках. Гэты сцэнарый прапануецца выкарыстоўваць для фарміравання бюджэту», — паведаміў ён.

Пры гэтым базавы сцэнарый прадугледжвае стабілізацыю сусветнага рынку нафты, улічвае дамоўленасці з Расіяй, а таксама паступовае павелічэнне попыту на беларускую прадукцыю на экспартных рынках. Мэтавы грунтуецца на выхадзе на асноўныя паказчыкі пяцігадовай праграмы, што прадугледжвае рэалізацыю запланаваных мер эканамічнай палітыкі, якія ствараюць стымулы для паскарэння эканамічнага росту. Важна пры фарміраванні бюджэту, лічыць намеснік міністра эканомікі, не памыліцца са сцэнарыем, бо залішне аптымістычныя ацэнкі знешніх і ўнутраных умоў пацягнуць за сабой неабходнасць удакладнення бюджэту, рэзервавання выдаткаў.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

Утерянный полис страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БА 1061182 считать недействительным.

■ Парламенцкі дзённік

# ГОДНАЯ ЗАРПЛАТА І РАЗВІЦЦЁ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА

## Як парламентарыі плануюць рэалізоўваць задачы, пастаўленыя Прэзідэнтам

**Пасланне кіраўніка дзяржавы беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу кожны раз без перабольшвання становіцца адной з ключавых падзей года. Гэта — канкрэтны, пакрокавы план таго, як будзем працаваць і якія мэты стаяць перад усімі намі на найбліжэйшую перспектыву. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў выказаліся, як яны бачаць рэалізацыю пастаўленых задач.**

### Лібералізацыя поруч з дзяржкантролем

Па тэме бізнесу ў Пасланні прагучалі два пасылы. Па-першае, лібералізацыя мае месца быць, але давайце не адыходзіць ад дзяржаўнага рэгулявання — у тым ліку эканамічных працэсаў. Па-другое, стаўка павінна рабіцца на інвестыцыі, развіццё інавацыйных тэхналогій, імпартазамяшчэнне.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Валерый БАРАДЗЕНЯ** ўпэўнены: на выхадзе будуць сфарміраваныя дастаткова добрыя, камфортныя ўмовы для бізнесу.

— Калі б былі гарантыі, што лібералізацыя вядзе да павышэння эканамічнай эфектыўнасці, яна б у Беларусі была праведзена ўжо даўным даўно. Таму, безумоўна, дзяржаўны кантроль павінен захавацца. Вельмі мала ёсць сфер, якія могуць сапраўды самарэгулявацца. І самае цікавае, калі мы ідзём па шляху лібералізму, мы ў любым выпадку сутыкнёмся з тым, што аказваецца ігракам рынку — і буйным, і дробным — не вельмі цікава канкурэнцыя і яе развіццё. Яны, наадварот, спяць і бачаць, як бы яе абмежаваць. І тут роля дзяржавы ў тым, каб усё ж такі, аддаючы свабоду, забяспечыць роўныя правы і не дазволіць нікому выкарыстоўваць сваё дамінантнае становішча.

### Штрафаваць стануць менш?

**Старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Уладзіслаў ШЧЭПАЎ** адзначае: прааналізаваўшы Пасланне, парламентарыі бачаць, што трэба зрабіць па кожным кірунку.

— Цяпер дэпутатамі нашай профільнай камісіі па эканамічнай палітыцы рыхтуюцца да ўнясення два важнейшыя законапраекты аб інвестыцыях і прыватызацыі, — расказаў ён. — Там якраз праблемныя моманты або перашкоды для прыцягнення інвестыцый будуць ліквідаваныя.

Дэпутат таксама паведаміў, што ў Палату прадстаўнікоў будзе ўносіцца законапраект аб зменах у Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях. Будуць пераглядацца штрафныя санкцыі ў дачыненні да прадпрымальнікаў так, каб яны былі суразмерныя зробленым парушэнням.

— У нас у заканадаўстве ёсць санкцыі за фармальныя памылкі ў дакументах, — канстатуе Уладзіслаў Шчэпаў. — Калі ёсць шкода чалавеку, юрыдычнай асобе або дзяржаве, то тады трэба накладваць санкцыі. А калі адпаведны ўрон у судзе не даказаны, то санкцыя не павінна накладвацца.

### 1000 можна атрымліваць і ў культуры

Адказваючы на пытанне «Звязды» пра зарплату ў 1000 рублёў — наколькі рэальна яе забяспечыць людзям, што працуюць, напрыклад, у сферы культуры — Валерый Барадзеня заявіў:

— Я не згодны, што сфера культуры нізкааплатная. Ёсць багатыя спевакі, мастакі. Трэба паглядзець, як лічыцца сярэдняя зарплата ў цэлым па галіне... Гэта як сярэдняя тэмпература па бальніцы. Насамрэч, дзе б ні былі знойдзены сродкі, яны будуць зароблены. Але мы не ўмеем прадаваць свой прадукт! Калі людзі крыху задумаюцца, а мы дадзім ім магчымасці, рычагі, то нават у бюджэтнай сферы можна многага дасягнуць.

— Я ведаю, што ў спорце павышаць заробкі можна за кошт пазабюджэтных сродкаў, калі ўстанова, прадпрыемства самастойна зарабіла нейкія грошы. Так што ў спартыўнай сферы пытанні будуць вырашацца, — лічыць **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ.**

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Дзмітрый ШАЎЦОЎ** упэўнены: трэба больш эканомна ставіцца да таго, што маем.

— Калі мы і надалей будзем марнатраўна ставіцца да тых багаццяў, дабротаў, якія дае наша краіна (гэта вада, іншыя карысныя рэчы), то мы ніколі не навучымся эканоміць. Мы жывём у сапраўднай сацыяльнай дзяржаве, дзе сацыяльная падтрымка ўразлівых слаёў значная і па некаторых крытэрыях перавышае нават еўрапейскія краіны. Мы кажам пра тое, што гэта правільна, і мы павінны развівацца і далей у гэтым кірунку, але мы павінны ліквідаваць сацыяльнае ўтрыманства. Павінны адвучаць людзей да таго, што нехта прыйдзе і зробіць нешта за іх. Гэта казус для любога еўрапейца, — сказаў дэпутат.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# ПАГАВОРЫМ АБ АДУКАЦЫІ

## Узор, які варта пераймаць і развіваць

**Дэпутаты Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы наведалі Бабруйск, каб азнаёміцца з асаблівасцямі мясцовага вучэбнага працэсу.**

За апошнія гады бабруйчанам хапала нагодаў ганарыцца маладымі інтэлектуаламі. Толькі за 2016—2017 навучальны год з міжнародных алімпіяд па матэматыцы ў Швейцарыі і хіміі ў Астане бабруйчане прывезлі бронзавы і залаты медалі. Па выніках абласнога этапу рэспубліканскіх алімпіяд у Беларусі горад сабраў 84 дыпломы, а на заключным этапе — яшчэ 19. Прыкладна 65 працэнтаў выпускнікоў становіцца студэнтамі ВНУ. Такія поспехі не маглі застацца незаўважанымі.

— Сёння мы на прыкладзе Бабруйска бачылі, наколькі эфектыўна дзейнічае сістэма адукацыі, калі настаўнікі сапраўды працуюць па праграме, выконваюць планы і ўкладаюць душу ў сваю работу. Калі дзеці атрымліваюць узнагароды рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўню, то гэта сведчыць толькі, што настаўнікі сапраўды якасна падалі матэрыял, — падзяліўся ўражаннямі **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Ігар МАРЗАЛЮК.**

Па словах старшыні, тая сістэма адукацыі, што існуе сёння ў краіне, цалкам жыццяздольная, таму трэба быць абачлівымі ў сферы рэформаў, якія могуць аказацца паспешлівымі і стаць шляхам да непрадуманых дзеянняў і знішчэння старой сістэмы без годнай для яе альтэрнатывы. Выпраўляць неабходна толькі тыя нюансы, што перашкаджаюць развіццю, але пры гэтым не закранаючы глыбінных устояў і працэсаў.

На думку палітыка, неабходнасць карэнных змен адпадае з дзвюх прычын.

Перспектыўным для павелічэння зацікаўленасці настаўнікаў дэпутат лічыць вопыт устаноў сярэдняй адукацыі. У адрозненне ад вышэйшай, там ёсць паняцце «работы на вынік» і «матывацыі асобна ўзятага актыўнага педагога». Калі вучань бярэ медалі і дыпломы, то выкладчыку прадмета ідзе матэрыяльная надбаўка да заробку за добрую працу. Старшыня парламенцкай камісіі лічыць, што трэба дыферэнцыравана падыходзіць да аплаты працы, прычым даплаты за поспехі вучняў павінны быць сапраўды значнымі.

Яшчэ адзін важны на думку дэпутата кірунак у падрыхтоўцы якасных адукацыйных кадраў быў агучаны ў Пасланні Прэзідэнта да беларускага народа і Нацыянальнага сходу. Знаёмства з прафесіяй для маладых настаўнікаў пажадана пачынаць ужо на першых-другіх курсах, каб студэнт вучыўся кантактаваць з дзецьмі.

А вось у дачыненні да ўстаноў вышэйшай адукацыі прагучалі і крытычныя выказванні. Ігар Марзалюк нагадаў, што сёння самы вялікі адток студэнтаў з ВНУ адбываецца пасля першага і другога курса, прычым гэта статыстыка сведчыць не пра цяжкасць іспытаў. Бывае, што маладыя людзі расчароўваюцца ў абранай спецыяльнасці, бо якасць выкладання прадмета ва ўніверсітэце часам горшая, чым у старэйшых класах гімназіі. Як вынік — каля 35 тысяч беларускіх выпускнікоў вучацца за мяжой. Выхадам з азначанай сітуацыі, на думку старшыні парламенцкай камісіі, можа стаць скарачэнне колькасці ўніверсітэтаў праз далучэнне іх да вядучых галіновых ВНУ ў якасці інстытутаў.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

*г. Бабруйск*

### Меркаванні

**Дэпутат Аксана НЯХАЙЧЫК, Шабаноўская акруга №91:**

— Лічу, што адбылася канструктыўная размова. Мяне зацікавіла праблема медыцынскіх работнікаў у дашкольных установах. Раней такія спецыялісты прылічваліся да сістэмы адукацыі, аднак цяпер спецыялістаў у дзіцячыя садкі выдзяляе сістэма аховы здароўя. Сёння мы бачым, што медыкаў у школах не хапае, нярэдка на дзве-тры вучэбныя ўстановы працуе па графіку адзін медыцынскі работнік. Трэба прааналізаваць гэту праблему.

**Святлана УКЛЕЙКА, начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі:**

— Хацелася б адзначыць сістэму работы з адоранымі навучэнцамі — гэта адзіная сістэма адукацыі ў горадзе без драбнення на часткі. У той жа час Бабруйск на сваім прыкладзе паказаў, што для выніку трэба размяжоўваць алімпіядную і даследчую падрыхтоўкі. Гэты вопыт, лічу, можна было б узяць для далейшай распрацоўкі. Радуе таксама, што бабруйскія настаўнікі з'яўляюцца прафесіяналамі, якія могуць падрыхтаваць пераможцаў міжнародных алімпіяд.

■ Знешняя палітыка

# ВЫКЛІКІ І ВЫСНОВЫ

## Беларусь працуе на ўзмацненне адносін з усімі партнёрамі

**Аб гэтым заявіў міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ на міжнароднай канферэнцыі экспертнай ініцыятывы «Мінскі дыялог». Яе падставай стала 25-годдзе знешняй палітыкі Беларусі. У мерапрыемстве прынялі ўдзел усе былыя міністры замежных спраў краіны, навукоўцы і дыпламаты.**

— Дваццаць пяць гадоў устанаўлення дыпламатычных адносін Беларусі з іншымі дзяржавамі — гэта добрая магчымасць ацаніць, дзе мы зараз знаходзімся, дакладна адзначыць свае каардынаты на шкале вектараў знешняй палітыкі і зверыць планы на будучыню, — падкрэсліў ва ўступным слове кіраўнік знешнепалітычнага ведамства краіны.

Па словах Уладзіміра Макея, Беларусь нацэлена на ўмацаванне ўзаемадзеяння з усімі суседзямі і партнёрамі не на шкоду каму-небудзь і не за кошт каго-небудзь. Больш за тое, уся сутнасць нашай знешняй палітыкі заключаецца ў планамернай выпрацоўцы ўнутраных і знешніх умоў для пабудовы множных геапалітычных апор.

Кіраўнік МЗС таксама адзначыў, што знешняя палітыка Беларусі грунтуецца на наступных прынцыпах: непрымяненне сілы або пагрозы сілай, мірнае ўрэгуляванне спрэчак, непарушнасць меж і неўмяшанне ва ўнутраныя справы. «У тым ліку, менавіта ў сілу паслядоўнага выканання гэтых прынцыпаў беларусы, і гэта таксама адносіцца да нашых бясспрэчных дасягненняў, у найскладанейшым геапалітычным кантэксце здолелі не дапусціць пранікнення хаосу і гвалту, зберaглі мір, бяспеку, стабільнасць у грамадстве і дзяржаве», — дадаў Уладзімір Макей.

Сёння Беларусь сапраўды з'яўляецца пляцоўкай для перамоў, пацвярджае **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАХМАНАЎ.** «Наша дзяржава сістэмна і ўвесь час, займаючы шматбаковую пазіцыю, адыгрывае вельмі важную ролю, — сказаў сенатар. — Не заўсёды гэта мела ацэнку, аднак апошнім часам гэта адбываецца. Што датычыцца далейшых крокаў, то Беларусь нікому не навязвае сваю пазіцыю, але яна кажа пра гатоўнасць дапамагчы, калі гэта будзе неабходна. А гэта сапраўды трэба, паколькі, на жаль, палітыкі розных краін не могуць дамовіцца ў тым фармаце, у якім хацелася б ім самім. Таму мы спадзяёмся, што палітыка, якую праводзіць Беларусь, будзе ўспрымацца чым далей, тым лепш». Сяргей Рахманаў таксама дадаў, што Беларусь і надалей будзе ўдзельнічаць ва ўрэгуляванні шматлікіх праблем, якія існуюць у свеце, але — не навязваючы сваю волю і рашэнні.

— Галоўны выклік для знешняй палітыкі Беларусі сёння заключаецца ў тым, што свет увайшоў у сітуацыю, калі старая сістэма і старыя правілы гульні ўжо не даюць вынік стабільнасці і развіцця, які быў раней, — адзначыў **кіраўнік экспертнай ініцыятывы «Мінскі дыялог» Яўген ПРЭЙГЕРМАН.** — І свет знаходзіцца ў пошуку гэтых новых правілаў. У такіх сітуацыях малыя краіны, заціснутыя паміж геапалітычнымі цэнтрамі прыцягнення — а гэта менавіта сітуацыя Беларусі — аказваюцца перад выклікам сваёй выжывальнасці.

На яго думку, сёння перад Беларуссю стаіць задача выбудаваць сваю знешнюю палітыку такім чынам, каб усе тыя рэсурсы, якія ў нас ёсць, максімальна накіраваць на забеспячэнне ўласнага суверэнітэту і развіцця.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

# НА ЛІНІІ — «ЗЯЛЁНЫ» ТРАНСПАРТ

**Першыя электробусы ў Мінску будуць хадзіць па маршруце тралейбуса №59 «ДС Сярова — Даўгабродская». Як паведамілі на прадпрыемстве «Мінсктранс», яны пачалі перавозіць пасажыраў з 12 мая.**

Усяго на балансе тралейбуснага парка №2 знаходзяцца шэсць электробусаў, чатыры з іх выйшлі на лінію. Астатнія будуць задзейнічаны ў найбліжэйшы час. Для пацвярджэння аплаты праезду прымяняюцца білеты на адну паездку і электронныя білеты, у складзе якіх адзін з відаў транспарту — тралейбус. Новую тэхніку для сталіцы вырабіў «Белкамунмаш». Дзякуючы адсутнасці выкіду шкодных рэчываў, нізкаму ўзроўню шуму і выкарыстанню чыстых крыніц энергіі электробусы лічацца «зялёным» транспартам XXI стагоддзя. Для зарадкі электробуса не патрабуецца падключэнне да ліній электраперадачы — на канцавым прыпынку ўсталёўваецца зарадны слуп.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*



Фота БЕЛТА.

■ Заўсёды гатовы!

# СВЯТА ЎСІХ ПАКАЛЕННЯЎ

**Міжнародны злёт піянераў сабраў у сталіцы каля дзвюх тысяч юных актывістаў арганізацыі з усіх рэгіёнаў краіны і замежжа. Акрамя іх, удзельнікамі мерапрыемства пад назвай «Заўсёды гатовы!» сталі лідары і кіраўнікі руху розных гадоў, ветэраны, а таксама пачэсныя госці. Такім чынам у Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі адзначалі 95-годдзе з дня стварэння піянерскай арганізацыі.**




Фота БЕЛТА.

— Гэта свята не толькі цяперашніх піянераў, але і нашых бацькоў, дзядуль, бабуль, — адзначыла **старшыня Цэнтральнага савета БРПА Вікторыя МЯНАНАВА.** — Мы вельмі рады, што здолелі захаваць у арганізацыі пераемнасць. «Піянер — усім прыклад» — гэты прынцып быў і застаецца нязменным, як і нашы галоўныя традыцыі. Хлопцы і дзяўчаты па-ранейшаму дапамагаюць пенсіянерам, вучаць малодшых, прасоўваюць агульначалавечыя каштоўнасці. Хоць, вядома, многае змяняецца, бо мы імкнёмся ісці ў нагу з часам. У прыватнасці, актыўна працуем у інтэрнэце, сацыяльных сетках.

Госці мерапрыемства маглі ўбачыць плац-парад піянераў-лідараў, сцяг-шоу, паказальныя выступленні групы барабаншчыкаў, найлепшых піянерскіх камандаў падтрымкі і многае іншае. Падчас форуму працавала выстава «Піянерыя — цудоўная краіна», на якой былі прадстаўлены ўнікальныя рарытэтныя экспанаты: калекцыі значкоў і нашывак, паштовак і марак, фарфоравых фігур, піянерскіх сцягоў з цікавымі гісторыямі, вымпелаў, дакументаў, грамат, дзённікаў важатых.

— Вельмі добра памятаю, як сам быў піянерам, — расказаў адзін з гасцей форуму, **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ.** — Як уступаў у шэрагі арганізацыі ў Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, як хваляваўся, бо кожны хацеў, каб яго прынялі ў першую чаргу. Бо ў тыя часы не быць піянерам звычайна азначала, што ты ў нечым правініўся. Тая ідэалогія прадугледжвала, што піянер — самы малодшы памочнік палітычнага ладу цэлай краіны. Цяпер роля арганізацыі, вядома, трансфармавалася — палітычная функцыя адышла на другі план, але ідэалагічны складнік застаўся. Бо рух дапамагае выхоўваць у нашых дзяцей беражлівае стаўленне да жыцця, любоў да працы, актыўнасць. Праз піянерыю мы выхоўваем сапраўдных патрыётаў сваёй краіны, не ставячы пры гэтым ніякіх палітычных задач.

Кульмінацыяй святкавання стала тэатралізаванае прадстаўленне «Летапіс піянерыі», прысвечанае лёсам герояў руху, сямейным легендам і падзеям, звязаным з арганізацыяй, ад 20-х гадоў мінулага стагоддзя да нашых дзён. У аснову сцэнарыя спектакля ляглі гісторыі юнкараў, «ажыць» якім дапамаглі ўдзельнікі найлепшых тэатральных калектываў Міншчыны.

— Мы з сяброўкамі прыехалі, каб паўдзельнічаць у форуме, а непасрэдна я знаходжуся тут у якасці юнага журналіста, — расказала **вучаніца 11 класа рэчыцкай сярэдняй школы №9 Марыя КОЦУР.** — Да арганізацыі далучылася яшчэ ў малодшай школе, з тых часоў прымаю ўдзел у самых розных мерапрыемствах, якія мы праводзім. Абавязкова віншуем ветэранаў на Дзень Перамогі, самі ўдзельнічаем у парадах, многія цікавяцца рухам юных інспектараў дарожнага руху. Мне вельмі падабаецца быць піянерам, бо рух аб'ядноўвае ўсіх дзяцей. Няважна, з якога ты горада, кожны тут — твой сябар, бо ўсе мы робім агульную справу.

Са святам піянераў краіны павіншаваў **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА.** У сваім пасланні ён падкрэсліў, што БРПА з'яўляецца адным з самых масавых грамадскіх аб'яднанняў краіны, выхоўвае таленавітых дзяцей і падлеткаў, становіцца стартавай пляцоўкай, з якой пачынаецца іх жыццёвы шлях. Уступаючы ў шэрагі піянерыі, кожны можа знайсці занятак па душы, сустрэць надзейных сяброў і аднадумцаў, развіць свае здольнасці і дараванні, падкрэсліў беларускі лідар.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■ Бізнес

# КІТАЙЦЫ ЎКЛАДАЮЦЬ ГРОШЫ Ў ГОРАД НАД НЁМАНАМ

## Інвестар з КНР пачынае рэканструкцыю адной з найбуйнейшых гродзенскіх гасцініц

**Лёс шматпавярховага аб'екта доўгі час не вырашаўся, што адбілася на яго стане. Калідоры і пакоі страцілі належны выгляд. Аб'ект сем разоў выстаўляўся на аўкцыён, пакуль яго не набыла кітайская Гандлёва-прамысловая карпарацыя «Цюань Шэн» з правінцыі Ганьсу.**

Новым уладальнікам гасцініца 1984 года пабудовы абышлася ў 3 млн долараў. За год зроблена праектна-каштарысная дакументацыя будынка, рэканструкцыя якога прадугледжвае добраўпарадкаванне і азеляненне тэрыторыі. Згодна з праектам тут размесціцца гасцінічна-рэстаранны комплекс. Як паведаміў кіраўнік прадстаўніцтва кітайскай кампаніі ў Беларусі Лю Хаамін, гродзенскі гатэль увойдзе ў сетку кітайскіх гасцініц Echeng. Цяпер вядзецца пошук генеральнага падрадчыка, выбар якога вызначыцца праз тэндар. Работы па ўзнаўленні плануецца пачаць з дэмантажу вокнаў і дзвярэй. Паводле праекта, усе малыя нумары пашырацца. Усяго будзе іх добраўпарадкавана 110. Некалькі паверхаў адыдуць пад арэнду офісаў.

Яшчэ адзін кітайскі інвестар з правінцыі Ганьсу стварае ў Гродне Цэнтр традыцыйнай кітайскай медыцыны. Пад гэты аб'ект адведзены будынак былой малочнай кухні, дзе ўжо пачалася рэканструкцыя. Плануецца, што цэнтр адкрыецца сёлета. Дарэчы, інвестар, а гэта кампанія «Сігікоп-Бел», разглядае пытанне аб набыцці праз аўкцыён зямельнага ўчастка для будаўніцтва камерцыйнага жылля.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

■ На слыху

# ХАБАР У АХОВЕ ЗДАРОЎЯ

**Камітэт дзяржаўнай бяспекі затрымаў з наяўнымі пры атрыманні хабару ў памеры 2,8 тысячы еўра галоўнага ўрача Пінскай цэнтральнай бальніцы. Пазней за хабар затрыманы яшчэ дзесяць кіраўнікоў сістэмы аховы здароўя Мінска, Гомельскай, Магілёўскай і Гродзенскай абласцей. Сумы незаконных грашовых узнагароджанняў складалі ад 400 да 5 тысяч долараў.**

Службовыя асобы сістэматычна атрымлівалі хабар за стварэнне ўмоў для перамогі падчас тэндара «патрэбнаму пастаўшчыку» абсталявання і рэагентаў, паведамляе прэс-служба КДБ Беларусі. Пасля ўдалага афармлення здзелкі менеджары камерцыйных структур перадавалі да пяці працэнтаў ад кошту рэалізаваных тавараў. Такія схемы прывялі да падаражання абсталявання і рэагентаў на 30—70 працэнтаў для бальніц і паліклінік. Заведзены крымінальныя справы. Пад вартай знаходзяцца і тыя, хто хабар даваў, у тым ліку кіраўнік прыватнага прадпрыемства «Белрэамед».

Крымінальная справа заведзена таксама ў дачыненні да галоўнага ўрача Рэспубліканскай клінічнай бальніцы медыцынскай рэабілітацыі Віктара Масло, які арганізаваў выкраданне грошай, налічаных работнікам адміністрацыі ў выглядзе прэміяльных на суму каля 21 тысячы рублёў. Яго затрымалі і прад'явілі абвінавачанне.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск №5 (68)



■ З нагоды

# ВАЖНЫ СЕКТАР

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам і гасцям 8-й Міжнароднай выставы ўзбраення і ваеннай тэхнікі «MILEX-2017», паведамілі газеце «Звязда» ў прэс-службе беларускага лідара.**

«Гэты найбуйнейшы ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне міжнародны форум, які 8-ы раз праходзіць у Беларусі, адлюстроўвае асноўныя тэндэнцыі і перспектывы развіцця сусветнага рынку ўзбраенняў, з'яўляючыся сведчаннем дасягненняў навуковай і канструктарскай думкі ў галіне распрацоўкі і вытворчасці прадукцыі ваеннага прызначэння», — гаворыцца ў прывітанні.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сёння айчынны ваенна-прамысловы комплекс — важны сектар эканомікі. «MILEX-2017» дае ўнікальную магчымасць шырокай грамадскасці і спецыялістам азнаёміцца з найлепшымі ўзорамі прадукцыі нашых збройнікаў. Найноўшыя тэхналогіі беларускай «абаронкі» спрыяюць павышэнню яе экспартных магчымасцяў на сусветным рынку ўзбраенняў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы ■

■ Творчы падыход

# ТЫЛ ВАЙСКОЎЦА

Як ва Узброеных Сілах выбіралі найлепшую сям'ю

**Праўда, за ганаровае званне трэба было пазмагацца. Дружныя, таленавітыя і згуртаваныя — усе як на падбор — вайскоўцы і іх родныя дзяліліся сакрэтамі сямейнага шчасця ў межах конкурсу «Сям'я — крышталь грамадства», які ўжо не першы год ладзіцца ў беларускай арміі.**

Сёлета за званне быць найлепшымі з найлепшых змагаліся сем шлюбных пар з розных куточкаў Беларусі. Нягледзячы на тое, што кожную з іх звязвае любоў да арміі, ужо падчас першага конкурсу — «Візітная картка сям'і» — удалося пераканацца, што ўсе яны розныя. І, самае галоўнае, у кожнага з іх — свая гісторыя кахання.

Цікава, што старшы прапаршчык Дзмітрый Грынюк пазнаёміўся са сваёй жонкай Веранікай у Дзень Перамогі. Гвардыі маёр Аляксандр Пастэрнак, які служыць ідэолагам у 103-й асобнай брыгадзе, сустрэў сваю Ганну падчас ваенна-гістарычнай рэканструкцыі. Сімвалічна, што дэсантнік павёў пад вянец нявесту акурат 2 жніўня, калі адзначаецца Дзень паветрана-дэсантных войскаў. А вось Міхаіл і Алена Кумяковы згулялі вяселле ў трыццаціградусны мароз. Такія ж моцныя ў іх і пачуцці, прызнаюцца фіналісты, якія ўдзельнічаюць у конкурсе ўжо другі год запар.



Фота Ірыны МАЛІНОЎСКАЙ.

Найвышэйшыя балы журы прысудзіла сям'і лейтэнанта Уладзіслава ГУСАКОВА.

— Першы раз мы крыху саромеліся, таму не ўсё ўдалося расказаць пра сваю сям'ю, — гавораць Міхаіл і Алена Кумяковы. — Ды і наш рухавік, галоўны крышталь нашай сям'і, пяцігадовая дачушка Паліна, не дае сядзець на месцы. Дзіця вельмі актыўнае, творчае, таму мы не маглі застацца ўбаку.

Паліна сапраўды стала зоркай конкурснай сцэны, толькі Кумяковым зусім трохі не хапіла да першага месца. Але сям'я, якая летась па рашэнні журы была трэцяя, не выключае, што прыедзе на конкурс і на наступны год: сумесная падрыхтоўка, як прызналіся канкурсанты, толькі згуртоўвае іх сям'ю.

Такога меркавання прытрымліваецца і сям'я яфрэйтара Баско. Толькі пагоны ў гэтым выпадку носіць жонка. Кацярына служыць радыётэлеграфісткай у адной з вайсковых часцей Барысава. Закахалася ў армію якраз у той час, калі чакала з войска будучага мужа. На службе ў Кацярыны не камандзірская пасада, але, па прызнанні членаў сям'і, дома яна — дакладна «генерал».

Віртуальнае падарожжа па Беларусі сем'і ваеннаслужачых ажыццявілі падчас конкурсу «Мой родны кут, як ты мне мілы...» Пра месцы, дзе яны нарадзіліся і раслі, вучыліся і пазнаёміліся, а таксама дзе служаць, канкурсанты расказвалі з асаблівай цеплынёй. А творчыя здольнасці дэманстравалі падчас заключнага конкурсу.

Моцны харэаграфічны нумар Уладзіслава і Аксаны Гусаковых перанёс гледачоў у цяжкія ваенныя гады і канчаткова пераканаў журы ў правільным выбары пераможцаў. Уладзіслаў — лётчык-верталётчык 50-й змешанай авіябазы, яго жонка, па прафесіі педагог-арганізатар, знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску. Маленькі Арсеній, які быў галоўным балельшчыкам сваіх бацькоў, кажа, што стане такім жа, як бацька. «Ты будзеш лепшым за мяне», — адказвае Уладзіслаў словамі свайго бацькі-афіцэра, які загінуў падчас выканання воінскага абавязку.

Як прызнаецца Аксана, вельмі ганарова быць жонкай лётчыка, але за гэтым хаваецца і штодзённае хваляванне. «Кожны раз з нецярпеннем чакаю яго званка пасля палёту», — кажа тая, якая называе сакрэтам сямейнага шчасця ўзаемаразуменне. Не чуючы нашай размовы, перакананы ў гэтым і яе муж — відаць, нездарма кажуць, што муж і жонка — найлепшая сполка ■

# Горад засынае, прачынаецца музей...

**Сёння ўвечары экспазіцыя Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ажыве. Танкісты і лётчыкі, зенітчыкі і стралкі, партызаны і падпольшчыкі, а таксама ваенныя карэспандэнты і медыцынскія работнікі раскажуць гісторыю музейных прадметаў і інсталяцый, пакажуць эпізоды з ваеннага жыцця.**

Паўдзельнічаць у іх атрымаюць магчымасць і наведвальнікі. Святочная праграма распачнецца ў 18.00 выступленнем «франтавой брыгады». Акрамя таго, на пляцоўцы каля музея размесціцца рэтра-выстаўка аўтамабільнай тэхнікі Міністэрства ўнутраных спраў, дзе таксама будзе паказана міліцэйская форма мінулых гадоў, апошнімі дасягненнямі падзеліцца Дэпартамент аховы МУС. У музейных залах чакае выстаўка «Авіяцыя партызанам у гады Вялікай Айчыннай вайны», адбудзецца прэзентацыя ўнікальнага музейнага прадмета. Не абыдзецца без салдацкай кашы і ваенных песень.

Для наведвальнікаў ночы музеяў арганізатары знізілі кошт білета. А для тых, хто прыйдзе ў ваеннай форме Чырвонай або Савецкай арміі, а таксама ў грамадзянскіх касцюмах 1930—1950-х гадоў, уваход бясплатны.

Матэрыялы падрыхтавала Вераніка КАНЮТА. kanyuta@zviazda.by

■ Узброеным Сілам — 100 гадоў

# КАЛІ МАМА — АФІЦЭР

## Сувязістцы падпарадкоўваецца ўзвод салдат тэрміновай службы

**Настасся РЭУТ ніколі не турбуецца наконт таго, у чым пайсці на работу. Прыгожыя сукенкі і туфлі на абцасах — гэта не пра яе. Найбольш камфортна дзяўчына адчувае сябе ў камуфляванай форме і берцах. Насця служыць у арміі. Яна — сувязістка.**

У 56-м асобным палку сувязі жанчын у пагонах нямала: гэтую адказную вайсковую прафесію ім давяралі здаўна. Настасся камандуе ўзводам. У яе ў падначаленні — шасцёра мужчын. І ўсе, а гэта салдаты тэрміновай службы, паслухмяна выконваюць загады свайго камандзіра.

Пад яе кіраўніцтвам вайскоўцы засвойваюць тэлеграфна-тэлефоннае рамяство, кіруюць мабільнымі вузламі сувязі. Акрамя таго, дзяўчына лічыць сваім абавязкам унікаць у патрэбы салдат. Здаецца, Настасся ведае пра іх усё: хто якую навучальную ўстанову скончыў, чым займаўся ў цывільным жыцці...

Сама дзяўчына ў армію трапіла не выпадкова. У той час калі Насціны сяброўкі выбіралі прафесію прадаўца, бухгалтара або настаўніка, яна марыла пра афіцэрскія пагоны.

— Насіць вайсковую форму хацела з самага дзяцінства, — прызнаецца Настасся Рэут. — У маёй сям'і ніколі не было вайскоўцаў, але мне заўсёды падабалася ваенная выпраўка, пастраенні, з задавальненнем назірала за парадамі войскаў Мінскага гарнізона... Паколькі я паступала пасля 9 класа, то на перспектыву выбірала спецыяльнасць, запатрабаваную ў арміі.

Пасля заканчэння каледжа сувязі (цяпер Беларуская дзяржаўная акадэмія сувязі) яна трапіла ў 56-ы полк, дзе служыць ужо дзявяты год. Спачатку праходзіла службу па кантракце. Афіцэрскую пасаду заняла, калі стала прапаршчыкам. Зборы, экзамены — і яна лейтэнант.

Як запэўнівае дзяўчына, праца не самая складаная: своечасова рэагаваць на ўсе паведамленні, сачыць за спраўнасцю апаратуры і, калі трэба, выпраўляць непаладкі. Але надзвычай адказная: выконваючы рэальныя практычныя задачы ў мірны час, ваенныя сувязісты знаходзяцца ў пастаяннай баявой гатоўнасці. На шчасце, пазаштатныя сітуацыі адпрацоўваюцца толькі падчас палявых выхадаў і вучэнняў.

Паколькі ваенная сувязь развіваецца ўсё больш імкліва, увесь час трэба ўдасканальвацца. Часу на пачытаць што-небудзь для душы ў Настассі не хапае: у руках часцей за ўсё — навукова-папулярная і спецыялізаваная літаратура. Армія аснашчаецца новымі і мадэрнізаванымі сродкамі сувязі, таму, каб адпавядаць, трэба ўвесь час працаваць над сабой.

— Лічбавая тэхніка паступова замяняе аналагавую, — расказвае Настасся Рэут. — Калі раней для яе абслугоўвання было задзейнічана пяць чалавек, то цяпер з тымі самымі задачамі могуць справіцца двое. Але ніякі камп'ютар не заменіць чалавека: трэба кантраляваць абстаноўку, уводзіць пэўныя даныя ды, як і любая апаратура, ён можа даць збой.



У падначаленні ў сувязісткі — узвод мужчын.



Фота Надзеі БУЖАН.

Настасся РЭУТ праводзіць занятак па кіраванні транспартным сродкам.

Лейтэнант прызнаецца, што ў цывільным жыцці не раз даводзіцца чуць, што служыць у арміі — не жаночая справа. «Гэта на «грамадзянцы» некаторыя лічаць, што ні ў якім разе не падпарадкоўваліся б жанчыне, — гаворыць Настасся. — У арміі ж субардынацыя — не пусты гук. Ты тут не жанчына, а такі ж ваеннаслужачы, як і ўсе астатнія. Ніякіх патуранняў!»

Акрамя хіба што нарматываў па фізічнай падрыхтоўцы. Замест падцягвання жанчыны ў пагонах здаюць практыкаванні для прэса, а на нарматыў па бегу для іх адводзіцца больш часу, чым мужчынам. У астатнім, на думку лейтэнанта Рэут, прадстаўніцы жаночага полу не павінны вылучацца з агульнага строю. «Раз ты прыйшоў у армію, забудзься пра прыгожую прычоску, яркі макіяж і доўгія пазногці, — лічыць яна. — Па-за КПП ты можаш выглядаць як хочаш, але нельга забываць, што перш за ўсё ты афіцэр».

Нягледзячы на тое, што на службе Настасся — дастаткова строгі і патрабавальны камандзір, дома яна — пяшчотная і клапатлівая маці. Дзяўчына ўпэўнена, што ўсе службовыя пытанні павінны заставацца за КПП, у той жа час ні ў якім разе нельга прыносіць свае сямейныя праблемы на работу.

Любімаму сыну Насця прысвячае ўвесь свой вольны час. Той, у сваю чаргу, ганарыцца, што мама — афіцэр. А калі нехта з аднакласнікаў сумняваецца, просіць, каб забрала яго са школы ў вайсковай форме.

— Дома вы таксама камандзір?

— Блізкія кажуць, што так, але я не сказала б, — прызнаецца дзяўчына. — Я аргументую гэта тым, што мой сын проста дысцыплінаваны хлопчык. Яму хапае аднаго майго погляду, і ён усё разумее.

Пра будучую прафесію маленькі Мікіта пакуль не задумваўся. Але маці не выключае, што афіцэрская дынастыя можа працягнуцца. Сёння Настасся не ўяўляе сябе ні ў якай іншай сферы. Яна ніколі не шкадавала, што зрабіла свой выбар на карысць абароны Айчыны.

— Прафесія вайскоўца заўсёды будзе актуальнай, — лічыць камандзір узвода. — Сёння гэта і стабільны заробак, і кар'ерны рост, а яшчэ, безумоўна, прэстыж. Я ганаруся сваім званнем і прафесіяй. Увогуле, працаваць трэба там, дзе падабаецца. Тады і на работу будзеш хадзіць з задавальненнем ■

■ Журналіст у пагонах

# Пісаць пра тое, што сам бачыў і пражыў

## Так лічыць ваенны карэспандэнт, якая працуе ўжо над чацвёртым дэтэктывам



**Калі Ганна ЧЫЖ-ЛІТАШ ішла ў дэкрэтны водпуск, то дрэнна ўяўляла свой дзень без палігонаў, тэхнікі і інтэрв'ю з вайскоўцамі. Яе дачушцы ўсяго 9 месяцаў, а яна працягвае не толькі здымацца (Ганна працуе на «Ваен-ТБ»), а і знаходзіць час на творчасць — будучы ў дэкрэце, журналістка ў пагонах напісала дзве кнігі.**

Мы сустракаемся з калегай у адным са сталічных паркаў адпачынку, дзе яна штодзень гуляе з маленькай Ульянай, і абмяркоўваем новаспечаныя дэтэктывы — менавіта ў такім жанры піша Ганна. Але перш — як яна знаходзіць на гэта час?

— Усе пытаюцца, калі я ўсё паспяваю, — прызнаецца маладая аўтарка. — Калі ты чагосьці вельмі хочаш, можна знайсці на гэта хоць гадзіну, хоць некалькі хвілін. Усё часцей даводзіцца чуць: я нічога не паспяваю. Гэта ўсё адгаворкі! Насамрэч гэты чалавек проста заняты нечым іншым.

Дэтэктыўныя сюжэты нараджаюцца ў Ганны раптоўна, часам нечакана, але матэрыялізуе яна іх толькі тады, калі дачушка спіць. Звычайна гэта адбываецца падчас вулічнай прагулкі, дзесьці ў парку на лавачцы, а падчас дрэннага надвор'я — у мамы на кухні, пакуль маленькая Ульяна атрымлівае хоць якую порцыю свежага паветра на балконе. Адным словам, піша Ганна Чыж-Літаш па графіку.

— А як жа натхненне? — цікаўлюся ў аўтара.

— Я не веру ў натхненне, — перакананая ваенны карэспандэнт. — Я веру ў працаздольнасць, у сілу волі і ў характар.

Дарэчы, па першай адукацыі Ганна — выкладчык англійскай мовы, сацыяльны педагог і псіхолаг. Акрамя таго, вучылася ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі. Журфак скончыла толькі нядаўна. Першую кнігу яна прысвяціла свайму бацьку. Ён і стаў прататыпам галоўнага героя — Аляксандра Пятровіча Вінаградава, які з дэтэктыва ў дэтэктыў раскрывае новыя злачынствы.

Ганнін бацька — палкоўнік запасу, які 36 гадоў адслужыў у войску. Але ён мог служыць і яшчэ больш, каб не абставіны, якія прымусілі пайсці на пенсію. У дзяўчыны доўгі час была крыўда за бацьку, таму, прысвяціўшы яму першую кнігу, яна хацела ўсім расказаць, які шчырым і справядлівым афіцэрам ён быў. Вядома, перажыванні галоўнага героя аб звальненні не з'яўляюцца асноўным лейтматывам кнігі. Галоўнае — раскрыць злачынства. Вінаградаў прысутнічае на адным мерапрыемстве, дзе гіне яго сябар. І як уласціва любому дэтэктыву, ён пачынае гэтае злачынства расследаваць, у выніку раскрывае справу.

У сваім кабінеце забіты дырэктар найбуйнейшай будаўнічай фірмы краіны. Хто пакінуў 12 куль у грудзях ахвяры? У новай кнізе «Прах на ветры», якая ўжо ёсць у продажы, палкоўнік Вінаградаў зноў спрабуе размятаць злачынны клубок супярэчнасцяў.

— Вобраз Вінаградава не спісаны даслоўна, — удакладняе аўтар, называючы бацьку сваім Пуаро. — Дзесьці я яго нават ідэалізавала, зрабіла не такім, які ён ёсць у жыцці. Ужо з першых старонак бацька зразумеў, пра каго ідзе размова. Яму спадабалася.

Серыя дэтэктываў з галоўным героем працягваецца. Але кожны раз — гэта новая гісторыя, абсалютна не звязаная з папярэдняй. Ганна папярэджвае, што ў яе дэтэктывах не ўбачыш НТБ-шнага стылю. Творы больш падобныя да класікі: дзяўчына расла на Агаце Крысці і Артуры Конан Дойле. Яна не імкнецца як мага больш жудасна перадаць момант злачынства, галоўнае для маладога аўтара — паказаць чалавечую сутнасць.

— Многія людзі знешне прыгожыя, ахайныя, ветліва табе ўсміхаюцца, а насамрэч вывернуць іх душу — ні адзін пральны парашок не адмые, — лічыць Ганна Чыж-Літаш. — Проста трэба жыць па сумленні. У сваіх творах я паказваю, што з сябе ўяўляюць людзі, здзяйсняючы тое ці іншае злачынства.

У кнізе няма рэальных забойстваў, як думаюць многія з акружэння Ганны, — некалькі гадоў тая працавала прэс-афіцэрам Партызанскага РУУС, таму пра злачынствы, якія адбываліся ў яе раёне, ведае нямала. А вось вобразы некаторых герояў дэтэктываў, па словах аўтара, узяты з рэальнага жыцця. Асабліва гэта датычыцца трэцяй кнігі «Радня», якая будзе апублікавана ў сярэдзіне лета.

— Перачытваю першую кнігу і разумею, што некаторыя моманты я ўжо адлюстравала б па-іншаму, — прызнаецца ваенны карэспандэнт. — З кожнай новай кнігай заўважаю, што расту. Вучуся сама ў сябе.

Яна ўжо ўзялася за новую, чацвёртую, кнігу. Піша і атрымлівае неймавернае задавальненне ад гэтага. Аўтар лічыць, што трэба пісаць пра тое, што ты сам бачыў і пражыў. «У новай кнізе я адправіла галоўнага героя ў Румынію, дзе некалі сама адпачывала», — кажа Ганна. Далей — інтрыга ■

■ Старонкі гісторыі

# НА ЗАХОПЛЕНЫМ ЦЯГНІКУ — ПА ТЫЛАХ ВОРАГА

Гэтая ўнікальная партызанская аперацыя стала баявой легендай

**Увосень 1942 года група народных мсціўцаў атрада імя Георгія Дзімітрава захапіла ў фашыстаў эшалон з нарабаванай у мясцовага насельніцтва маёмасцю і пад чырвоным сцягам прайшла з баямі па чыгунцы. І ўсё гэта — на акупаванай ворагам тэрыторыі!**

## БЕЛАРУСКІ ЧАПАЙ

У красавіку 1942 года ў лясным урочышчы Гута-Міхалін, што непадалёк ад Івацэвічаў, сфарміраваўся партызанскі атрад імя Дзімітрава. Атрад дзейнічаў на тэрыторыі Косаўскага, Ружанскага і Бярозаўскага раёнаў. Дыверсійнай групай кіраваў адважны партызан Аляксандр Самуйлік, якога за знешняе падабенства з героем грамадзянскай вайны і бязмежную смеласць з любоўю называлі «беларускім Чапаем».

Са станцыі Любяшоў Валынскай вобласці, размешчанай на левым беразе ракі Стаход, прытоку Прыпяці, фашысты рэгулярна адпраўлялі ў горад Камень-Кашырскі чыгуначныя саставы з нарабаваным у мясцовага насельніцтва дабром, якое пасля везлі ў Нямеччыну. Партызаны даведаліся, што ў пачатку лістапада 1942 года рыхтаваўся чарговы цягнік з калядными падарункамі: збожжам, птушкай, мёдам і яйкамі.

Аляксандру Самуйліку паступіла прапанова захапіць варожы эшалон і праехаць па чыгунцы па тылах фашыстаў з чырвоным сцягам. Справа была рызыкоўная: самая малая недакладнасць, нязначны промах пагражалі правалам. Усё-такі вырашылі дзейнічаць. Для ажыццяўлення аперацыі адабралі добраахвотнікаў. Першым адгукнуўся адважны і знаходлівы разведчык Юрый Логінаў, які да вайны працаваў памочнікам машыніста паравоза на Паўднёва-Уральскай чыгунцы. Паводле задумы, яму адводзілася месца машыніста паравоза, які планавалася захапіць у ворага падчас бою.

У дыверсійную групу папрасілася партызанка Ганна Рудзько, якая ў атрадзе аднолькава добра ўмела страляць, гатаваць, перавязваць раны. У аперацыі таксама ўдзельнічалі Леанід Бесаноўскі, Іван Уладзіміраў, Зіновій Абакумаў, Васіль Пукемаў, Іван Савін. З кожным з іх Самуйлік не раз бываў у баі, хадзіў на дыверсіі, таму быў упэўнены, што ў любой, нават самай нечаканай і рызыкоўнай сітуацыі, яны не падвядуць.

5 лістапада Аляксандр Самуйлік са сваёй групай апынуўся пад Любяшовам. Па просьбе партызан мясцовы жыхар Фелікс Рэпятовіч ноччу зрабіў на чырвоных палотнішчах плакаты накшталт «Смерць фашысцкім акупантам!». Партызаны вывелі са строю тэлефонную сувязь на двухкіламетровым участку, спалілі адміністрацыйны будынак пад Руцкам, знішчылі мост праз раку Стаход — усё для таго, каб гітлераўцы нават не сумняваліся: у іх тыле дзейнічаюць узброеныя атрады чырвонаармейцаў.

## САРАКАКІЛАМЕТРОВЫ РЭЙС

Толькі пачало світаць, як партызаны, беражліва паклаўшы ў рэчмяшкі напісаныя лозунгі, бясшумна падабраліся да чыгуначнага палатна ў раёне паўстанка Сваротная. На гэтым месцы ў засадзе яны праляжалі ўсю ноч. Раніцай да паўстанка набліжаўся цягнік з 16 вагонаў і платформаў. Як толькі цягнік паказаўся з-за павароту, пераапрануты ў форму чыгуначніка партызан Леанід Бесаноўскі, энергічна размахваючы чырвоным сігнальным сцяжком, рушыў насустрач. Машыніст паравоза, заўважыўшы трывожныя сігналы абходчыка, якія азначаюць небяспеку, рэзка зменшыў ход. Гэта дазволіла Юрыю Логінаву, ухапіўшыся за поручні паравоза, падняцца ў будку машыністаў.

Паравозная брыгада, якая складалася з двух машыністаў — мясцовых жыхароў, прымушаных немцамі весці састаў, падпарадкавалася партызанам. З вагонаў паказалася ўстрывожаная ахова, па якой адначасова



Камандзір атрада імя Кірава Брэсцкага партызанскага злучэння Аляксандр САМУЙЛІК (справа).

з абодвух бакоў чыгункі ўдарылі аўтаматы партызан. Частка вартаўнікоў палегла пад прыцэльным агнём з засады, астатнія ахоўнікі разбегліся па лесе. Захапіўшы цягнік, да вонкавых сцен вагона партызаны прымацавалі лозунгі, на трубе паравоза ўзнялі сцяг. Самі размясціліся па вагонах так, каб пры падыходзе да станцый весці агонь адразу з усіх ствалоў — вораг ніякім чынам не павінен быў здагадацца аб невялікім складзе атрада.

І вось цягнік падрыхтаваны ў рызыкоўны і трывожны шлях. Логінаў заняў месца машыніста, падаў сігнал адпраўлення. Так пачаўся саракакіламетровы рэйс некалькіх патрыётаў, якіх пасля фашысты ахрысцілі «буйнымі дэсантнымі сіламі бальшавікоў». Усё, што змяшчалася ў вагонах, — збожжа, муку, сала, курэй, гусей, яйкі — раздавалі на станцыях і паўстанках каля размешчаных блізка да чыгункі вёсак, дзе партызаны рабілі кароткія прыпынкі.

Станцыю Махро, дзе стаяў буйны нямецкі гарнізон, праляцелі на поўным ходу, абстраляўшы з кулямёта і аўтаматаў асалапелых ад нечаканасці гітлераўцаў. На адным з паўстанкаў Самуйлік загадаў спыніцца і падрыхтаваць абоз, загрузіць яго прадуктамі і даставіць у партызанскі лагер. Чарговы кароткачасовы прыпынак зрабілі на станцыі Вулька, дзе выгрузілі рэшткі прадуктаў, знялі сцяг і лозунгі.

Сяляне дапамаглі загрузіць чыгуначны састаў саломай. Бесаноўскі з запаленым факелам хутка абабег вагоны. У будцы палаючага цягніка застаўся машыніст Логінаў. Цягнік набіраў хуткасць і набліжаўся да разбуранага моста цераз раку Піна. У самы апошні момант бясстрашны партызан выскачыў з паравоза, скаціўся ўніз пад адхон — адбыўся выбух.

Барацьба супраць акупантаў працягвалася... Неўзабаве Аляксандра Самуйліка прызначылі камандзірам партызанскага атрада імя Кірава. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях з фашысцкімі захопнікамі, ён быў узнагароджаны ордэнам Леніна. Пасля вайны больш за 30 гадоў працаваў на розных пасадах у Камянецкім раёне, удастоены звання Ганаровага грамадзяніна Камянца. Не стала «беларускага Чапая» ў 1989 годзе. Удзячныя землякі назвалі ў яго гонар адну з новых вуліц райцэнтра.



На падобным паравозе, які цяпер знаходзіцца ў музеі чыгуначнай тэхнікі Брэста, партызаны ажыццявілі свой маршрут па тылах ворага.

**Мікалай ШАЎЧЭНКА, член Беларускага саюза журналістаў** ■

УНП 300200360

# УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ЗНАМЯ ИНДУСТРИАЛИЗАЦИИ»

**01 июня 2017 года состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Знамя индустриализации».**

Собрание проводится в смешанной форме: присутствием лиц, имеющим право на участие в собрании, по адресу: г. Витебск, ул. Гагарина, д. 11, зал заседаний, либо путем письменного опроса (заочного голосования).

**Повестка дня собрания:**
1. О создании филиала Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Витебск, ул. Гагарина, д. 11, в рабочие дни с 22 мая 2017 года по 31 мая 2017 года по месту нахождения общества (ком. 27) с 9.00 до 16.00 01 июня 2017 года по месту проведения собрания.

Лицам, принявшим решение об участии в собрании путем письменного опроса (заочного голосования), направляется бюллетень для голосования и материалы по вопросу повестки дня, контактный телефон 8-0212-602938.

Регистрация участников собрания с 9.00 до 10.00 по месту проведения собрания. Начало работы собрания – 01 июня 2017 года в 11.00.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, – 22 мая 2017 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет ОАО «Знамя индустриализации»

Председатель наблюдательного совета Р. А. Махлаева


# ИЗВЕЩЕНИЕ

**о проведении открытых торгов в форме аукциона в отношении права на заготовку и (или) закупку диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, на территории Барановичского района Брестской области**

| Предмет торгов | Заключение Национальной академии наук Беларуси (от 04.05.2017 № 28-07/2317) | | Начальная цена предмета торгов | Размер и срок внесения задатка |
|---|---|---|---|---|
| | промысловый запас/кг | годовая норма вылова/кг | | |
| Право на заготовку и (или) закупку длиннопалого (узкопалого) рака на территории Барановичского района Брестской области: | | | | |
| Пруд «Железница» расположенного 1 км северо-западнее дер. Железница Городищенского сельисполкома | 29 | 13 | 5 базовых величин/115 белорусских рублей | 23 белорусских рубля (20% начальной цены) не позднее дня подачи документов |
| Пруд в дер.Заполье Столовичского сельисполкома | 42 | 19 | 5 базовых величин/115 белорусских рублей | 23 белорусских рубля (20% начальной цены) не позднее дня подачи документов |
| Водохранилище «Кутовщина» (Лизаровское) в 19,2 км на север от г. Барановичи, между деревнями Кутовщина, Пруды, Гречихи, Лизаровщина и пос. Советский /3/. Принадлежит системе реки Сервечь, бассейн реки Неман | 1300 | 590 | 5 базовых величин/115 белорусских рублей | 23 белорусских рубля (20% начальной цены) не позднее дня подачи документов |

**Примечание:**
1. Торги состоятся 28 июня 2017 г. в 14.00 по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Советская, 79, малый зал райисполкома (каб. 310), 3-й этаж.
2. Торги проводятся при наличии двух участников и более.
3. Участниками торгов могут быть юридические лица, индивидуальные предприниматели или их представители при наличии доверенности.
4. Для участия в торгах юридическое лицо или индивидуальный предприниматель до их начала подает в комиссию по организации и проведению торгов:
4.1 заявление с указанием, на какой территории и какие виды диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, предполагается заготавливать и (или) закупать по результатам торгов;
4.2. заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение суммы задатка на счет 3600211000006 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Брестской области в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код банка 153001795, УНП 200676206, назначение платежа 05520.
5. Комиссия по организации и проведению торгов расположена по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Советская, 79, каб. 422, 4-й этаж. Контактный телефон: 8-0163-41-28-94. Заявления об участии в торгах принимаются с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням.
6. Прием документов заканчивается 23 июня 2017 г. в 13.00. Заявления об участии в торгах, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.
7. Порядок проведения торгов определен Правилами добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, утвержденными постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. №699 (с изменениями и дополнениями).
8. Победителем торгов признается участник, предложивший наибольшую цену за предмет торгов.
9. В случае если заявка на участие в торгах подана только одним участником, право на заготовку и (или) закупку длиннопалого (узкопалого) рака на территории Барановичского района Брестской области предоставляется этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
10. Победитель торгов подписывает протокол, оформляемый по результатам торгов, в день их проведения.
11. Участник, выигравший торги, возмещает затраты на публикацию извещения о проведении торгов в печатных средствах массовой информации не позднее 10 дней с момента проведения торгов.

# ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, 14
Тел.: (+375 17) 309 15 15, (+375 29) 309 15 15, (+375 33) 309 15 15

Годовая консолидированная финансовая отчетность банка за период с 1 января по 31 декабря 2016 года в полном объеме размещена на сайте банка по адресу: **www.vtb-bank.by.** УНП 101165625

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 ЯНВАРЯ 2017 г.

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) *(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2016 год | 2015 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 5 | 28 550 | 30 964 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 6 | 98 976 | 197 858 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 7 | 110 831 | 133 040 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 8 | 288 321 | 174 232 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 9 | 620 271 | 845 648 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 10 | - | 455 |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | | - | - |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 11 | 2 | 2 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 12 | 61 111 | 56 803 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 13 | 1 967 | 2 510 |
| 14 | Отложенные налоговые активы | 1111 | 14 | 494 | 430 |
| 15 | Деловая репутация | | | - | - |
| 16 | Прочие активы | 1112 | 15 | 17 516 | 20 247 |
| 17 | ИТОГО активы | 11 | | 1 228 039 | 1 462 189 |
| 18 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 19 | Средства Национального банка | 1201 | | - | 50 984 |
| 20 | Средства банков | 1202 | 16 | 237 474 | 397 892 |
| 21 | Средства клиентов | 1203 | 17 | 777 805 | 805 844 |
| 22 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 18 | 21 451 | 29 054 |
| 23 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | 23 |
| 24 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 25 | Прочие обязательства | 1207 | 19 | 20 947 | 29 511 |
| 26 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 1 057 677 | 1 313 308 |
| 27 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 28 | Уставный фонд | 1211 | | 77 962 | 77 962 |
| 29 | Эмиссионный доход | 1212 | | 3 432 | 3 432 |
| 30 | Резервный фонд | 1213 | | 8 887 | 8 257 |
| 31 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 30 322 | 28 723 |
| 32 | Накопленная прибыль | 1215 | | 49 759 | 30 507 |
| 33 | Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации – банку | | | 170 362 | 148 881 |
| 34 | Доля неконтролирующих акционеров | | | - | - |
| 35 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 170 362 | 148 881 |
| 36 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 1 228 039 | 1 462 189 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА 2016 ГОД

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) *(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2016 год | 2015 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 189 351 | 166 128 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 80 381 | 102 443 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 21 | 108 970 | 63 685 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 44 789 | 57 887 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 6 483 | 7 620 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 22 | 38 306 | 50 267 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 23 | 84 | 100 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 24 | 14 470 | 9 274 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 25 | (4 376) | 28 811 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 26 | 81 997 | 86 050 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 27 | 12 312 | 12 727 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 28 | 64 142 | 58 026 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 29 | 2 560 | 3 143 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 21 067 | 17 645 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | (39) | 1 432 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 21 106 | 16 213 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | | 30 | 8,1216 | 6,2386 |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | | | - | - |
| | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | | - | - |
| | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | | - | - |
| | ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | | | 21 106 | 16 213 |
| | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации – банку | | | 21 106 | 16 213 |
| | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | | - | - |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЕ СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ ЗА 2016 ГОД

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) *(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2016 год | 2015 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль (убыток) за отчетный период | 301211 | 31 | 21 106 | 16 213 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода за отчетный период | 301212 | 31 | 1 760 | 5 330 |
| | В том числе: | | | | |
| 2.1 | переоценка основных средств, объектов незавершенного строительства и оборудования к установке | 3012121 | 31 | 1 760 | 5 330 |
| 2.2 | переоценка нематериальных активов | 3012122 | | - | - |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | - | - |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| 3 | ИТОГО совокупный доход | 30121 | 31 | 22 866 | 21 543 |
| 4 | Доля в совокупном доходе, принадлежащая головной организации – банку | | | 22 866 | 21 543 |
| 5 | Доля неконтролирующих акционеров в совокупном доходе | | | - | - |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ СОБСТВЕННОГО КАПИТАЛА ЗА 2016 ГОД

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) *(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего капитал, принадлежащий головной организации – банку | доля неконтролирующих акционеров | всего собственный капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2015 г. | 3011 | 77 962 | 3 432 | 7 673 | 35 549 | 23 572 | 148 188 | - | 148 188 |
| 1.1 | В том числе: результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| 2 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | - | - | 584 | (5 042) | 5 151 | 693 | - | 693 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 16 213 | 5 330 | 21 543 | - | 21 543 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 584 | (584) | x | - | x | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | - | - | x | (20 682) | x | (20 682) | x | (20 682) |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - | x | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | (20 682) | x | (20 682) | x | (20 682) |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - | x | - |
| 2.7 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 124 | (124) | - | x | - |
| 2.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | (113) | (55) | (168) | - | (168) |
| | Приобретение дочернего юридического лица | | x | x | x | x | x | x | - | - |
| 3 | Остаток на 1 января 2016 г. | 3013 | 77 962 | 3 432 | 8 257 | 30 507 | 28 723 | 148 881 | - | 148 881 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2016 г. | 3011 | 77 962 | 3 432 | 8 257 | 30 507 | 28 723 | 148 881 | - | 148 881 |
| 5 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | - | - | 630 | 19 252 | 1 599 | 21 481 | - | 21 481 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 21 106 | 1 760 | 22 866 | - | 22 866 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 630 | (630) | x | - | x | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | - | - | x | (1 442) | x | (1 442) | x | (1 442) |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - | x | - |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | (1 442) | x | (1 442) | x | (1 442) |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - | x | - |
| 5.7 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 161 | (161) | - | x | - |
| 5.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | 57 | - | 57 | - | 57 |
| | Приобретение дочернего юридического лица | | x | x | x | x | x | x | - | - |
| 6 | Остаток на 1 января 2017 г. | 3013 | 77 962 | 3 432 | 8 887 | 49 759 | 30 322 | 170 362 | - | 170 362 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ЗА 2016 ГОД

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) *(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2016 год | 2015 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 202 380 | 156 612 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (91 518) | (99 958) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 45 520 | 54 682 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (8 533) | (8 021) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | - | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | 84 | 100 |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 14 971 | 9 186 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | (4 808) | - |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 10 463 | 7 052 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (61 080) | (55 742) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | - | (1 526) |
| 13 | Итого денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах | 701 | | 107 479 | 62 385 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | 145 985 | 149 716 |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | (25 868) | (12 947) |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | (52 289) | (150 051) |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | 169 831 | (75 582) |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | 455 | 107 804 |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | (393) | 15 314 |
| 20 | Итого потоки денежных средств от изменения операционных активов | 702 | | 237 721 | 34 254 |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | (49 738) | 1 578 |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | (177 052) | (198 102) |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | (64 262) | 174 057 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | (8 013) | 19 080 |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | (23) | (15 851) |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | (549) | (12 185) |
| 27 | Итого потоки денежных средств от изменения операционных обязательств | 703 | | (299 637) | (31 423) |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | 32 | 45 563 | 65 216 |
| 29 | ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов | 71100 | | (6 674) | (2 630) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 90 | (3 655) |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | - |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | (773 888) | (30 000) |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | 714 524 | 30 000 |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | 32 | (65 948) | (6 285) |
| 37 | ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | - | - |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | (1 442) | (20 682) |
| 42 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | (1 442) | (20 682) |
| 43 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | 32 | 2 623 | 30 137 |
| 44 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | 32 | (19 204) | 68 386 |
| 45 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | | x | 185 099 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | 32 | 165 895 | x |

Исполняющий обязанности Председателя Правления Д.Л. Фролов

Заместитель главного бухгалтера Т.А. Езубчик

Дата подписания: 10 мая 2017 г.


Ernst & Young LLC
Klary Tsetkin Street, 51A, 15th floor
Minsk, 220004, Republic of Belarus
Tel: +375 (17) 240 4242
Fax: +375 (17) 240 4241
www.ey.com/by

ООО «Эрнст энд Янг»
Республика Беларусь, 220004, Минск
ул. Клары Цеткин, 51А, 15 этаж
Тел.: +375 (17) 240 4242
Факс: +375 (17) 240 4241


## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ

**независимой Аудиторской организации ООО «Эрнст энд Янг» по годовой консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), его дочерних организаций как банковского холдинга, подготовленной по итогам деятельности за 2016 год**

Г-ну Иванову Владимиру Владимировичу
Председателю Правления ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Акционерам, Аудиторскому комитету, Совету директоров и Правлению ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Национальному банку Республики Беларусь

Мы провели аудит прилагаемой годовой консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности (далее «консолидированная финансовая отчетность») Закрытого акционерного общества Банк ВТБ (Беларусь), его дочерних организаций как банковского холдинга (далее «Банк»), состоящей из:
– Консолидированного бухгалтерского баланса Банка на 1 января 2017 года (Форма 1);
– Консолидированного отчета о прибылях и убытках Банка за 2016 год (Форма 2);
– Консолидированного отчета об изменении собственного капитала Банка за 2016 год (Форма 3);
– Консолидированного отчета о движении денежных средств Банка за 2016 год (Форма 4);
– Примечаний к годовой консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности.

Указанная консолидированная финансовая отчетность была подготовлена руководством Банка в соответствии с Законом Республики Беларусь от 12 июля 2013 года №57-З «О бухгалтерском учете и отчетности», Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 12 декабря 2013 года №728 «Об утверждении Инструкции об организации ведения бухгалтерского учета и составления бухгалтерской (финансовой) отчетности в Национальном банке Республики Беларусь, банках и небанковских кредитно-финансовых организациях Республики Беларусь», Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года №511 «Об утверждении Инструкции по составлению консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности банковских групп, банковских холдингов», Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 24 января 2007 года №15 «Об установлении форм отчетности для головных организаций банковских групп, банковских холдингов и утверждении Инструкции о порядке осуществления надзора за банковской деятельностью на консолидированной основе», и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки консолидированной финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде (далее «законодательство Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности»).

Согласно критериям, определенным Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года №511 «Об утверждении Инструкции по составлению консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности банками банковских групп, банковских холдингов», консолидированная финансовая отчетность Банка как банковского холдинга на 1 января 2017 года включает финансовую информацию Закрытого акционерного общества Банк ВТБ (Беларусь), его дочерней организации Общество с ограниченной ответственностью «СНБ-Агро» и Общество с ограниченной ответственностью «СНБ-Строй».

*Обязанности руководства аудируемого лица по подготовке консолидированной финансовой отчетности*

Руководство аудируемого лица несет ответственность за составление и представление консолидированной финансовой отчетности, прилагаемой на 55 листах, в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности и организацию системы внутреннего контроля, необходимой для составления консолидированной финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие недобросовестных действий или ошибок.

*Обязанности Аудиторской организации*

Мы несем ответственность за выраженное нами аудиторское мнение о достоверности консолидированной финансовой отчетности, основанное на результатах проведенного аудита.

Консолидированная финансовая отчетность Банка за 2015 год была проверена другой аудиторской организацией, аудиторское заключение которой датировано 4 мая 2016 года и содержит безусловно положительное мнение о годовой финансовой отчетности за 2015 год.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» от 12 июля 2013 года №56-З и национальных правил аудиторской деятельности, утвержденных Министерством финансов Республики Беларусь. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной консолидированной финансовой отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры, направленные на получение аудиторских доказательств, подтверждающих значения показателей консолидированной финансовой отчетности Банка, а также другую раскрытую в ней информацию. Выбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения консолидированной финансовой отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения консолидированной финансовой отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля Банка, необходимая для составления консолидированной финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы. Аудит также включал оценку применяемой учетной политики, обоснованности учетных оценок и общего содержания консолидированной финансовой отчетности Банка.

Мы полагаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

*Аудиторское мнение*

По нашему мнению, консолидированная финансовая отчетность достоверно, во всех существенных аспектах, отражает финансовое положение Банка по состоянию на 1 января 2017 года, финансовые результаты его деятельности и изменения его финансового положения (движение денежных средств) за год по указанную дату в соответствии с Законом Республики Беларусь от 12 июля 2013 года №57-З «О бухгалтерском учете и отчетности», Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 12 декабря 2013 года №728 «Об утверждении Инструкции об организации ведения бухгалтерского учета и составления бухгалтерской (финансовой) отчетности в Национальном банке Республики Беларусь, банках и небанковских кредитно-финансовых организациях Республики Беларусь», Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года №511 «Об утверждении Инструкции по составлению консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности банковских групп, банковских холдингов», Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 24 января 2007 года №15 «Об установлении форм отчетности для головных организаций банковских групп, банковских холдингов и утверждении Инструкции о порядке осуществления надзора за банковской деятельностью на консолидированной основе», и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки консолидированной финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде.

*Прочие вопросы*

Прилагаемая консолидированная финансовая отчетность не имеет своей целью представление финансового положения и результатов деятельности в соответствии с принципами или методами бухгалтерского учета и подготовки отчетности, общепринятыми в странах помимо Республики Беларусь. Соответственно, консолидированная финансовая отчетность не предназначена для лиц, не знакомых с принципами, процедурами и методами бухгалтерского учета и подготовки отчетности, принятыми в Республике Беларусь.

Мы проводили аудит соответствия консолидированной финансовой отчетности Банка требованиям Национальных стандартов финансовой отчетности только в части положений, регламентирующих представление и раскрытие информации в консолидированной финансовой отчетности.

Лащенко Павел Анатольевич, Генеральный директор — Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь №0000738 от 14 мая 2003 года, без ограничения срока действия;

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям и требованиям к деловой репутации, предъявляемым к аудиторам, оказывающим аудиторские услуги в банках, банковских группах и банковских холдингах №8 от 27 октября 2004 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования 21 октября 2014 года).

Крошка Вера Владимировна, Начальник отдела аудита — Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь №0002226 от 10 октября 2014 года, без ограничения срока действия;

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям и требованиям к деловой репутации, предъявляемым к аудиторам, оказывающим аудиторские услуги в банках, банковских группах и банковских холдингах №88 от 26 ноября 2014 года, без ограничения срока действия.

Дата аудиторского заключения: 10 мая 2017 года.
Место выдачи аудиторского заключения: г. Минск, Республика Беларусь.
Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом: 10 мая 2017 года.
Генеральный Директор ООО «Эрнст энд Янг» П.А. Лащенко

# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. №420/С-58978 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – здание комплексно-приемного пункта по обслуживанию сельского населения), площадью 58,8 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, д. Докудово, 2, ул. Клавы Комаровой, 11 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 423685402526000201, (назначение – для обслуживания здания комплексно-приемного пункта по обслуживанию сельского населения (для размещения объектов бытового обслуживания населения)), площадью 0,0336 га, расположенный по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, д. Докудово 2, ул. Клавы Комаровой, 11. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта, код – 4,1, площадью 0,0336 га |
| **Начальная цена продажи** | 2 040 р. (две тысячи сорок рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 204 р. (двести четыре рубля) |
| **Обременения со стороны 3-х лиц** | В виде аренды сроком до 15.03.2017 г. |
| **ЛОТ 2** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | - капитальное строение, инв. №420/С-58980 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж), площадью 35,8 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Ходоровский с/с, а.г. Голдово, ул. Советская, 6/1.<br>- капитальное строение, инв. №420/С-58981 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – здание комплексного приемного пункта по обслуживанию сельского населения), площадью 56,8 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Ходоровский с/с, аг. Голдово, ул. Советская, 6 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 423686501873000128, (назначение – для обслуживания здания комплексно-приемного пункта по обслуживанию сельского населения (для размещения объектов бытового обслуживания населения)), площадью 0,0671 га, расположенный по адресу: Лидский р-н, Ходоровский с/с, аг. Голдово, ул. Советская, 6. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в зоне санитарной охраны водного объекта, используемого для питьевого водоснабжения, код – 4,3, площадью 0,0671 га |
| **Начальная цена продажи** | 2 460 р. (две тысячи четыреста шестьдесят рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 246 р. (двести сорок шесть рублей) |
| **ЛОТ 3** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. №420/С-58982 (назначение – здание специализированное для образования и воспитания, наименование – здание школы), площадью 125,0 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Песковский с/с, аг. Песковцы, ул. Октябрьская, 31 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | - кадастровый номер 423684603648000018, (назначение – для обслуживания здания школы), площадью 0,2376 га, расположенный по адресу: Лидский р-н, Песковский с/с, аг. Песковцы, ул. Октябрьская, 31. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код – 6, площадью 0,0226 га; земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадью 0,2376 га.<br>- кадастровый номер 423684603648000019, (назначение – для обслуживания здания школы), площадью 0,0656 га, расположенный по адресу: Лидский р-н, Песковский с/с, аг. Песковцы, ул. Октябрьская, 31. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадью 0,0656 га |
| **Начальная цена продажи** | 7 320 р. (семь тысяч триста двадцать рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 732 р. (семьсот тридцать два рубля) |
| **ЛОТ 4** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. №420/С-37946 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – здание комплексно-приемного пункта), площадью 53,3 кв. м, расположенный по адресу: Лидский р-н, Круповский с/с, д. Крупово, ул. И. Домейки, 21 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 423684307655000158, (назначение – для обслуживания здания комплексно-приемного пункта), площадью 0,0996 га, расположенном по адресу: Лидский р-н, Круповский с/с, д. Крупово, ул. И. Домейки, 21 |
| **Начальная цена продажи** | 6 120 р. (шесть тысяч сто двадцать рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 612 р. (шестьсот двенадцать рублей) |
| **Продавец** | ОАО «Лидский комбинат бытовых услуг» 231300, г. Лида, ул. Советская, 23а, Тел. 8-0154-60-84-01 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия оплаты** | – обязанность по государственной регистрации сделки и перехода прав возлагается на Покупателя, в том числе оформление всей необходимой документации, а также Покупатель несет все связанные с этим расходы;<br>– возмещение Победителем аукциона затрат Продавца на проведение независимой оценки объектов, проданных через аукцион в размере 326,25 рублей с учетом НДС;<br>– возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5% от конечной цены продажи объекта |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 2 июня 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 21.03.2017 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 08.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 08.30 до 16.30 (пятница).**
**Последний день приема заявлений – 29 мая 2017 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
*http://grodnoino.by/*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Трест Белтрансстрой», г. Минск, ул. Советская, 8 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Лот №1** | | | | |
| Здание столярного цеха | Здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель | 562 | 350/С-110904 | г. Гомель, ул. Шоссейная, 9 |
| Оборудование: кран-балка (инв. №529, г. п. 3 тн.) | | | | |
| **Начальная цена Лота №1 с НДС** | **70 003,43 бел. руб.** | | | |
| **Лот №2** | | | | |
| Здание склада с гаражом | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 681,5 | 350/С-99149 | г. Гомель, ул. Шоссейная, 9 |
| Составные части и принадлежности: пристройка, два крыльца, два металлических склада. Оборудование: кран-балка (инв. №459, г. п. 5 тн); стеллажи металлические инв. №337; №№338; 339. | | | | |
| **Начальная цена Лота №2 с НДС** | **198 443,50 бел. руб.** | | | |
| **Лот №3** | | | | |
| Здание пилорамы | Здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель | 466 | 350/С-110903 | г. Гомель, ул. Шоссейная, 9 |
| Составные части и принадлежности: пристройка | | | | |
| **Начальная цена Лота №3 с НДС** | **49 373,28 бел. руб.** | | | |
| **Лот №4** | | | | |
| Помещение многофункциональное | Помещение многофункциональное | 739 | 350/D-292633 | г. Гомель, ул. Шоссейная,15-2 |
| **Начальная цена Лота №4 с НДС** | **184 744,15 бел. руб.** | | | |

**Сведения о земельном участке:** лоты №№1–4, расположены на земельном участке пл. 4,0693 га, предоставленным в долевое постоянное пользование. Доля продавца (49/50), доля КУП «Гомельоблтеплосеть» (1/50). Целевое назначение земельного участка: *земельный участок для содержания и обслуживания производственной базы «Строительно-монтажный поезд №716».* Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: *земельный участок для размещения объектов промышленности.* Продавец, в зависимости от количества реализованных лотов, в установленном законодательством порядке после проведения аукциона обращается за осуществлением регистрационных действий в отношении земельных участков, необходимых для обслуживания предметов аукциона

**Срок подписания договора купли-продажи:** после выделения самостоятельного земельного участка для обслуживания реализованного лота (лотов) (либо определения доли в праве постоянного пользования), между продавцом и покупателем в течение 10 (десяти) рабочих дней после получения продавцом свидетельства о государственной регистрации прав на земельный участок должен быть заключен договор купли-продажи

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012743260072; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012743260098; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **21.06.2017** в 13.00 по адресу: **г. Минск, ул. Советская, 8, ОАО «Трест Белтрансстрой»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **19.06.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42; auction@cpo.by; www.cpo.by** |

■ Права

# Даўгі лепш вяртаць своечасова

## Павялічыліся паўнамоцтвы судовых выканаўцаў і спагнаннікаў

**Нявыдача крэдытаў, адключэнне сотавай сувязі і тэлебачання, часовае абмежаванне выезду за мяжу, арышт маёмасці і іншыя меры ўздзеяння на даўжнікоў, якія ўхіляюцца ад выплаты запазычанасцяў, з сённяшняга дня будуць выконвацца яшчэ больш пільна. У сілу ўступіў Закон «Аб прымусовым выкананні», прыняты яшчэ летась. А 13 мая запрацаваў Закон «Аб судовых выканаўцах». Ён пашырыў магчымасці і правы гэтых службовых асоб і павысіў іх статус, а таксама ўзмацніў ролю патрабавальнікаў доўгу.**

У прыватнасці судовыя выканаўцы змогуць уносіць рашэнні аб прыводзе даўжнікоў і абвяшчэнні іх у вышук, што раней рабілася толькі па рашэнні суда. У кампетэнцыю выканаўцаў трапіла і права замены боку выканаўчай вытворчасці. Затрымаць аўтамабіль даўжніка і адбуксіраваць яго на штраф-стаянку, забраць пасведчанне кіроўцы, дакументы на паляванне ці ваджэнне маламерных суднаў — таксама ў кампетэнцыі выканаўцаў. Сустракаюцца сярод неплацельшчыкаў і такія асобы, што жывуць у шыкоўных палацах, якія ім на паперы не належаць.

Патрабавальнік у сваю чаргу цяпер можа самастойна вырашаць, прад'яўляць выканаўчы дакумент для прымусовага выканання ці даўжнік верне патрабуемае добраахвотна. Ён таксама можа сам накіраваць выканаўчыя дакументы на вядомае месца працы даўжніка, з заробку якога на карысць патрабавальніка будуць утрымлівацца грошы. Разам з тым, расходы па выкананні цяпер могуць легчы на плечы спагнанніка.

Прагрэсіўныя нормы законаў зробяць працэс выканання судовых рашэнняў больш эфектыўным і эканамічным. Гэтыя дакументы павінны ўніфікаваць падыходы прымусовага выканання па катэгорыях спагнання даўгоў з юрыдычных асоб і грамадзян. Разрозненыя па Грамадзянскім і Гаспадарчым кодэксах нормы, якія рэгулявалі работу судовых выканаўцаў, цяпер упарадкаваны, зазначыў **міністр юстыцыі Беларусі Алег СЛІЖЭЎСКІ.**

— Само па сабе судовае рашэнне, якое абавязвае даўжніка вярнуць грошы, яшчэ не гарантуе, што правы патрабавальніка будуць абаронены. Таму судовыя выканаўцы і працуюць, каб законнымі метадамі прымусіць даўжніка выканаць свой абавязак па вяртанні доўгу. І з прымяненнем сучасных інфармацыйных тэхналогій нашы судовыя выканаўцы робяць жыццё грамадзян-патрабавальнікаў больш абароненым, — заўважыў ён.

На сайце Міністэрства юстыцыі створаны рэестр даўжнікоў, дзе можна ўвесці УНП юрыдычнай асобы ці асабісты нумар фізічнай асобы, каб даведацца, ці ёсць у яго запазычанасці. Актыўна развіваецца праграма «АІС ПВ» — аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма прымусовага выканання. Пасля канчатковай мадэрнізацыі можна будзе мець доступ да ўсёй базы выканаўчых дакументаў, а таксама ў рэжыме анлайн ствараць асабісты кабінет боку выканаўчай вытворчасці.

— Патрабавальнік зможа праз асабісты кабінет бачыць усе дзеянні, якія ажыццяўляюцца па яго выканаўчым дакуменце, — растлумачыў Алег Сліжэўскі. — І без накіравання запытаў і наведвання судовага выканаўцы з любой мабільнай прылады адсочваць усе яго дзеянні.

Выканаўчыя рашэнні прымаюцца па самых розных даўгах: адміністрацыйных штрафах, спагнаннях па крымінальных справах, аліментах, запазычанасцях грамадзян перад жыллёва-камунальнай гаспадаркай. Не выключаюць у Мінюсце і магчымасці карыстацца працэдурай медыяцыі ў сферы выканаўчай вытворчасці, аднак гэтае пытанне толькі пачынаюць абмяркоўваць.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■ Сацыяльны рэпартаж

# «КЛЕТКІ ЧЫСЦІЦЬ НЕ ПРЫМУШАЮЦЬ»

## Як праходзяць грамадскія работы ў заапарку?



**На гадзінніку — восем раніцы. Свае дзверы для наведвальнікаў сталічны заапарк адчыніць толькі праз дзве гадзіны, а беспрацоўныя ўжо збіраюцца, каб адпрацаваць належнае і зарабіць якую-ніякую капейчыну (за дзень — каля 11 рублёў). Тут яны займаюцца падсобнымі работамі, прыбіраюць тэрыторыю.**

— Да жывёл не дапускаюцца, — папярэджвае наша пытанне **намеснік дырэктара Мінскага заапарка Аляксандр САФРОНАЎ.** — Небяспечна. Для гэтага патрэбна спецыяльная падрыхтоўка.

У дзень арганізацыя прымае да 15 «адпрацоўшчыкаў». **Майстар па ўтрыманні зялёных насаджэнняў Мікалай НОВІК** расказвае, што ёсць і такія, хто па два гады да іх на грамадскія работы ходзіць. «А моладзь, бывае, прышлюць — тая не ведае, што такое рыдлёўка. Хлопцы не ўмеюць забіць цвік, а дзяўчаты ніколі не палолі кветкі», — дзеліцца майстар. Адсядзецца для галачкі, дарэчы, не атрымаецца: гультаю проста не залічаць дзень адпрацоўкі і адправяць дадому.

У штаце заапарка, вядома, ёсць свае дворнікі і падсобныя рабочыя, але дапамога лішняй не бывае. Вось група беспрацоўных на ўваходзе зграбае скошаную траву. 44-гадовая Вольга расказвае, што ўжо месяц у пошуках работы. Па спецыяльнасці жанчына швачка, але пасля інсульту прыйшлося забыць на машынку і працаваць прыбіральшчыцай. А знайсці такую вакансію цяпер амаль нерэальна.

— Пад'язджаеш у фірму. Свабоднае месца быццам ёсць, але кажуць, што не падыходзіш, — расказвае пра складанасці Вольга. — У некаторых арганізацыях бяруць на стажыроўку, працуеш месяц бясплатна. А пасля на работу не запрашаюць — прыходзяць стажыравацца новыя людзі. Прадпрыемства зарабляе, а мы — не.



Магчымасці падзарабіць жанчына рада: трэба ж неяк сям'ю карміць. Дый не такая тут брудная работа, клеткі чысціць не прымушаюць.

Яе сённяшняя «калега» Тацццяна ўздыхае: усе добрыя вакансіі занятыя. Жанчына мае спецыяльнасць рабочага зялёнай гаспадаркі, але сцвярджае, што па прафесіі ўладкавацца не атрымліваецца. То касцы патрэбны, а не азеляніцелі, то на месца іншага чалавека возьмуць.

— На што жыву? У сяброўкі на ўчастку падпрацоўваю. Дапамогу атрымліваю — 20 рублёў у месяц. Але гэта мала, на раз у краму схадзіць. Даюць яшчэ талоны на праезд. А то кантралёры не глядзяць на даведку беспрацоўнага, высаджваюць з аўтобуса і ўсё.

Міхаіл, цясляр-бетоншчык, фарбуе агароджу. На ўлік як беспрацоўны стаў два месяцы таму, пасля таго як яго скарацілі на прадпрыемстве.

— Вакансіі цесляра, сталяра ёсць, — апісвае мужчына сітуацыю. — Але заробкі там абяцаюць невялікія. 250 рублёў, напрыклад, а ў мяне на папярэдняй рабоце 800 было. Можа, служба занятасці нармальную вакансію падбярэ... *(задумваецца)* Разрад у мяне нізкі. Я магу працаваць як след, але новаму наймальніку гэта трэба даказаць.

Пакуль ідзём на гаспадарчы двор, уздоўж вальераў з ламамі і ваўкамі, Мікалай Новік заўважае, што некаторыя пасля грамадскіх работ застаюцца ў іх на пастаяннай аснове. Аднаго, напрыклад, электрыкам уладкавалі.

— Увогуле да нас на адпрацоўку шмат будаўнікоў прыходзіць, рабочых з заводаў. Часцей гэта людзі, якім за 40—50 гадоў, — дзеліцца назіраннямі майстар.

Пра тое, што пасля 50 нідзе не хочуць браць, расказвае і беспрацоўны Андрэй. На біржы ён стаіць паўгода. У мінулым кіроўца-міжнароднік, пасля аперацыі на калене мужчына цяпер не можа доўга сядзець за рулём. «Адправілі на курсы пагрузчыка ад службы занятасці, — расказвае Андрэй, зацягваючыся цыгарэтай. — Але па стане здароўя не пацягну гэту работу. Тыдзень паездзіў — ледзь разагнуўся».

Мужчына прадаў машыну, на гэтыя грошы цяпер і жыве. Стараецца эканоміць: харчуецца бульбай, якую вырасціў летась на дачы, і хатнімі нарыхтоўкамі.

Многія беспрацоўныя на грамадскіх работах у заапарку ўпершыню. Але толькі не Ігар. Здаровы мужык, ён больш за год нідзе не працуе. Хоць мае добрую спецыяльнасць — зубны тэхнік.

— Зайдзіце ў інтэрнэт, паглядзіце: такія не патрабуюцца, — пераконвае ён нас падчас перакуру, які ў яго пачаўся раней за работу.

Мы потым праверылі ў Агульнарэспубліканскім банку вакансій: у Мінску сапраўды свабодных месцаў для зубных тэхнікаў няма. Ёсць у іншых гарадах: Светлагорску, Баранавічах, Нароўлі. Іншая справа, што ў Ігара кваліфікацыі для гэтага не хопіць. Медыцынскі дыплом кожныя пяць гадоў пацвярджаць трэба, а мужчына апошнія разы ігнараваў гэту працэдуру.

— Цэлы год не працуеце, за што прадукты купляеце? — не разумеем мы.

— Радня дапамагае...

Ігар кажа, што на вакансію з заробкам ад 300 рублёў і вышэй гатовы ісці. Няўжо за год такую знайсці не змог? Як той казаў, адны шукаюць магчымасці, іншыя — апраўданні.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*



Фота Надзеі БУЖАН.

### Афіцыйна

**З пачатку года ў аплатных грамадскіх работах прыняло ўдзел амаль 1,3 тысячы мінчан, у тым ліку 1268 беспрацоўных. Актыўней за ўсё ідуць у Мінскі заапарк, Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі, «Зелянбуд» Фрунзенскага раёна. Усяго сёлета заключана 78 дагавораў з наймальнікамі аб правядзенні грамадскіх работ. Сярод іх «Строммаш», «Галантэя», 4-я гарадская клінічная бальніца імя Саўчанкі і іншыя.**

**Як правіла, гэта дзейнасць, якая не патрабуе кваліфікацыі ці спецыяльнай падрыхтоўкі, такая як прыборка і добраўпарадкаванне тэрыторыі горада і аб'ектаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, будаўнічыя і падсобныя работы.**

**Аплата налічваецца ў адпаведнасці з сістэмай аплаты працы, што ўстаноўлена ў наймальніка, згодна са штатным раскладам, але не ніжэй за памер мінімальнага заробку. За дзень грамадзянін атрымлівае каля 12—15 рублёў.**

**Гараджане, якія маюць складанасці з пошукам пастаяннай работы, могуць часова ўладкавацца на 485 месцаў. Поўны пералік вакансій для грамадскіх работ знаходзіцца на сайце камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама.**

# ВІТАМІННЫ КАНВЕЕР

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Днямі ў садзе Інстытута пладаводства ў Самахвалавічах былі высаджаны новыя кусты актынідыі. У межах праграмы «Генафонд» яны былі прывезены з маскоўскага аддзялення Усерасійскага інстытута раслінаводства. Дарэчы, тутэйшыя калекцыі прызнаны набыткам Рэспублікі Беларусь і знаходзяцца пад аховай дзяржавы.

«Звязда» адгукнулася на заманлівую прапанову вучоных паўдзельнічаць у пасадцы рэдкіх экзэмпляраў, якія далей будуць вывучацца і выкарыстоўвацца ў селекцыйнай рабоце. Хто ведае, можа, «нашчадкі» пасаджанай у юбілейным для газеты годзе расліны з цягам часу заквітнеюць у садах і нашых чытачоў.

— У жніўні на ёй пачынаюць выспяваць доўгія плады з вялікай колькасцю вітаміну С, актынідам, які дапамагае вырашаць праблемы са страваваннем. Яны будуць карыснымі для ляжачых бальных, цяжарных жанчын. Ягады можна перацерці з цукрам, замарозіць, зрабіць фруктовы лёд, начынку для бліноў, пончыкаў. А яшчэ гэта культура дэкаратыўная. Яе можна садзіць уздоўж участка, на мяжы ў якасці жывой агароджы. Калі яна ў чэрвені пачынае квітнець, палова ліста становіцца бела-ружовай, гэта так прыгожа! — знаёміць з «беларускімі ківі» загадчык лабараторыі генетычных рэсурсаў ягадных культур Людміла Фралова.

Дарэчы, калі надумаеце пасяліць у сябе на ўчастку гэтую прыгажуню, а можа, і якія іншыя, пакуль рэдкія расліны, можаце смела звяртацца па кансультацыі да вучоных на сайт belsad.by альбо ў наш праект «Руплівым гаспадарам».



На кізіле ўжо завязаліся плады.

### ХОЧАМ ПЕРАМЕН!

Ці часта ў нашым рацыёне з'яўляюцца ягады? На жаль, не, хоць у Беларусі ёсць усе ўмовы для таго, каб запусціць «ягадны канвеер». Сёння ў садах можна атрымліваць прадукцыю не горшую, а самае галоўнае, таннейшую за заморскую садавіну.

— Мы можам вырошчваць не толькі культуры ўмеранага пояса, а нават некаторыя трапічныя. Напрыклад, дзякуючы дастаткова прыдатным кліматычным умовам паспяхова ўваходзяць у вытворчасць кізіл, актынідыя, з'яўляюцца ў садах азіміна, унабі (ці кітайскі фінік), годжы і многія іншыя паўднёвыя рэчы, — заўважае Людміла Уладзіміраўна. — Сярод культур, якія варта ўводзіць у вытворчасць, — бружмель, ён дае ўраджай адным з першых — ужо ў пачатку чэрвеня (а ў паўднёвых зонах і ў канцы мая) можна збіраць смачныя ягады. Нават ажыны мала хто заводзіць. І гэта пры тым, што з'явіліся новыя сарты, безшыпныя, з буйнымі ягадамі — у некаторых яна дасягае 8 грамаў. І гэта не нейкі трук, фальсіфікацыя ці ўзмоцненая апрацоўка ўгнаеннямі, а вынік мэтанакіраванай шматгадовай селекцыі, дасягнуты і замацаваны на генетычным узроўні.

Часам, людзі спадзяюцца запасціся ягадамі ў лесе, многіх нават не спыняе, што не заўсёды там добрая экалагічная абстаноўка, ёсць зоны і з радыеактыўным забруджваннем. Акрамя таго, сучасныя культуры, выведзеныя селекцыянерамі, адрозніваюцца большай колькасцю біялагічна актыўных рэчываў, яны буйнейшыя, ураджайнейшыя, адаптаваны да новых прыродна-кліматычных умоў. Можа высветліцца, што вырошчваць ягады на сваім участку выгадней, чым штогод трацішся на бензін, каб выбрацца па лясныя дары.

### ЗНАЁМЫЯ І НЕ ВЕЛЬМІ

Калі мы выпраўляемся на кароткую экскурсію па ягадніках Інстытута, Людміла Уладзіміраўна знаёміць з калекцыямі розных раслін, плады якіх маглі б прыйсціся даспадобы нашым гаспадынькам:

— Вы б бачылі, як прыгожа квітнеў кізіл! Толькі сышоў снег, а ён ужо пакрыўся жоўтай шапкай. Тут глогавы гай, плануем вывесці новы буйнаплодны сорт. Шаўкавіца наша любіць выспацца, часам адпачывае да канца мая, дае ў канцы жніўня выдатны ўраджай, плады багатыя на жалеза. У нас цікавая калекцыя шыпшыны: ёсць круглыя, выцягнутыя, з шыпамі і без. Прыгожа квітнеюць ірга і чаромха. У канцы жніўня прыязджайце да нас па ягады чаромхі, між іншым, на Урале іх нават у пірагі кладуць, сушаць і дадаюць у муку. Рабіна, ёсць павер'е, абараняе ад пажараў, даўней яе садзілі каля ўвахода ў дом, каб спыняць агонь. Ёсць дэкаратыўныя віды рабіны, напрыклад, «ніцай» формы, з пладамі розных колераў (напрыклад, пунсовага, чырвонага), буйнымі пладамі. Ёсць гранатавая — гібрыд паміж ароніяй і рабінай садовай. Яшчэ Мічурын займаўся скрыжаваннем і атрымаў такую форму, яна вельмі смачная, з яе цудоўнае варэнне. А яшчэ такія ягады чысцяць сасуды ад халестэрынавых бляшак.

**Калі надумаеце пасяліць у сябе на ўчастку рэдкія расліны, можаце смела звяртацца па кансультацыі да вучоных на сайт belsad.by альбо ў наш праект «Руплівым гаспадарам».**

***— Дзіўна, сёння людзі імкнуцца ўпрыгожыць свой участак, але мала хто для гэтага выкарыстоўвае ягаднікі...***

— Нават звычайныя культуры могуць быць дэкаратыўнымі. Напрыклад, ажыны. На некаторых сартах лісты становяцца барвянымі. Прыгожа квітнее хенамелес, спачатку ён уражвае чырвонымі як ліхтарыкі кветкамі, а пасля вырастаюць плады-яблычкі, іх перацерці з цукрам — смаката! Можна скрылікамі ў чай замест лімона класці, спалучаць з іншымі пладамі ў пюрэ ці варэнні. Ёсць ружакветныя сарты суніц, бузіна з залацістымі лістамі. Варты ўвагі бузіна чорная і чаромха. Аронія, дарэчы, культура, з якой наогул няма ніякіх турбот, у верасні становіцца барвянай, прыгожыя і чорныя ягадкі. Тут і дэкаратыўнасць, і карысць. Ягадныя культуры — гэта не толькі кусты, але і дрэвы (кізіл, глог, шаўкавіца), ліяны і травяністыя расліны, напрыклад суніцы.



Хенамелес часта можна сустрэць на клумбах.

***— Што трэба ўлічваць пры падборы культур?***

— Раю пры выбары культур абапірацца на рэестр. Часам людзі гэта ігнаруюць, кажуць: «Вы нам адсталыя сарты прапануеце, яны даўно вядомыя». Затое надзейныя, правераныя не адзін год, выпрабаваныя па ўсіх абласцях, а навінкі могуць даць 1-2 ураджаі і вымерзці.

***— Гэта вясна паўплывае на ўраджай...***

— Не такія вялікія маразы былі, мінус 5 для раслін не крытычна, але для фарміравання завязі гэта дрэнна. Тое, што рана зацвіло, пашкодзілася. Дзякуючы ранняй дружнай вясне шчодра квітнелі кізіл, чорныя парэчкі, агрэст, баюся, не збяром такога ўраджаю, як планавалі. Былі рэзкія скачкі тэмпературы, але дзякуючы ападкам расліны ўмацаваліся. Палівы садзейнічаюць аднаўленню пашкоджаных тканак за кошт таго, што вада мае цеплаправодную функцыю. Садаводы вясной часта выкарыстоўваюць супрацьзамаразкавыя палівы ў час цвіцення.

***— Ёсць нейкая ўніверсальная парада, што зрабіць, каб закласці сад з новых культур?***

— Ягадныя культуры — даўгавечныя, могуць на адным месцы расці 20—30 гадоў. Вы не атрымаеце ўраджаяў, калі проста пасадзіце расліну, дзе давядзецца, да закладкі саду трэба папрацаваць з зямлёй. Галоўнае, з чаго трэба пачынаць: падрыхтаваць глебу. Пазбавіцца ад пустазелля, шкоднікаў, хвароб. Калі на ўчастку былі нейкія праблемы, трэба некалькі гадоў з пасадкай ягадных культур пачакаць. Затое на тым месцы выдатна сябе могуць адчуваць тагетэсы, хрызантэмы, ачышчае глебу часнок, рапс, гарчыца. Апошнія трэба некалькі разоў за сезон сеяць і закопваць — гэта і зялёнае ўгнаенне, і барацьба з хваробамі ды шкоднікамі. Асабліва патрэбны сідэраты для бедных лёгкіх, пясчаных глеб. Сёння гной знайсці цяжка. Многія фермы падмываюць скот, і ён у вадкай форме. А ў садзе патрэбны цвёрды, перапрэлы. Таму, калі яго няма, дапамогуць сідэраты і розныя ўгнаенні, якіх зараз багата ў магазінах, аксідат торфу, гумінавыя дабаўкі, прэпараты на аснове мікраарганізмаў. Пакуль глеба будзе рыхтавацца, трэба прадумаць, што садзіць, вызначыцца з размяшчэннем радоў, раслін. Можна прыехаць да нас у госці. У межах Года навукі сёлета ладзіцца багата разнастайных праграм, гэта і семінары, і ягадныя фестывалі — можна прайсціся па садзе, паглядзець, як усё расце, прадэгуставаць. Калі ў нас набываюць пасадачны матэрыял, таксама даём багата парад, расказваем пра малавядомыя расліны людзям, рэкамендуем іх. Веру, што і кізіл, і актынідыя з цягам часу ўвойдуць у наша жыццё, бружмель зараз упэўнена крочыць па Польшчы. У нас фермеры яшчэ часам баяцца ім заняцца, бо пералік сродкаў абароны для ягадных культур вельмі абмежаваны. Вытворцы і пастаўшчыкі хіміі для ягад лічаць, што такі кірунак ім у Беларусі не выгадны, бо тут няма вялікіх насаджэнняў. Але ёсць альтэрнатыва: мульча замест гербіцыдаў, папярэдняя падрыхтоўка глебы і розныя сістэмы абрэзкі, фармоўкі — прафілактыка супраць хвароб. Трэба сказаць, што маларапаўсюджаныя ягадныя культуры практычна не пашкоджваюцца шкоднікамі і хваробамі. Напрыклад, на кізіле, шаўкавіцы, глогу няма шкоднікаў. Вось яны — культуры для арганічнага земляробства.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*



Фота Надзеі БУЖАН.

Загадчык лабараторыі генетычных рэсурсаў ягадных культур Людміла ФРАЛОВА.

# Гуманітарнае супрацоўніцтва: рэчаіснасць і перспектывы

**У Маскве ў Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі 5 чэрвеня пройдзе круглы стол Міністэрства інфармацыі нашай краіны, прысвечаны пытанням гуманітарнага, медыйнага супрацоўніцтва Беларусі з краінамі Садружнасці Незалежных Дзяржаў.**

Да размовы пра міждзяржаўныя культурныя, літаратурныя стасункі запрошаны беларускія і расійскія пісьменнікі, дзеячы культуры і мастацтва, кіраўнікі мас-медыя краін СНД. Сваімі меркаваннямі па розных праблемах, вырашэнне якіх аднолькава важнае і для Беларусі, і для Расіі, падзеляцца дырэктар выдавецтва «Художественная литература» Георгій Прахін, галоўны рэдактар «Роман-газеты» Юрый Казлоў, старшыня ФНКА «Беларусы Расіі» Сяргей Кандыбовіч, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь Бадак, галоўны рэдактар часопіса «Нёман» Аляксей Чарота і іншыя. А ў пярэдадзень круглага стала — 3 чэрвеня — беларускія кнігавыдаўцы адкрыюць свой стэнд на прэстыжнай выстаўцы «Кнігі Расіі», якая па традыцыі пройдзе на Краснай плошчы расійскай сталіцы. Сярод навінак, якія прывязуць у Маскву беларускія выдаўцы, арганізатары кніжнага гандлю, — кнігі пра Францыска Скарыну, выданні, прысвечаныя 500-годдзю беларускага кнігадрукавання.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# ДАЛЁКІЯ ГАЛАКТЫКІ СТАЛІ БЛІЖЭЙШЫЯ

**Яшчэ тры дзесяцігоддзі таму гамяльчане ганарыліся, што ў горадзе над Сожам ёсць магчымасць пабачыць зорнае неба і даведацца аб космасе з дапамогай спецыяльнай апаратуры. Школьнікаў на ўрокі астраноміі з 1962 года абавязкова прыводзілі ў планетарый, які размяшчаўся тады ў будынку сабора Пятра і Паўла.**

У самым канцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя будынак быў перададзены Праваслаўнай царкве, якая вярнула яму першапачатковае прызначэнне, а вось прыхільнікі зорнага неба засталіся без магчымасці наглядаць за ім з дапамогай спецыяльнай апаратуры. Вернікаў час ад часу папікалі за тое, што пазбавілі гамяльчан магчымасці сачыць за працэсамі, якія адбываюцца ў сусвеце. І вось цяпер усе маюць магчымасць з дапамогай сістэм візуалізацыі новага пакалення дакрануцца да касмічных таямніц.

Мабільны планетарый FullDome, набыты ў Расіі, размяшчаецца на цокальным паверсе Палаца Румянцавых і Паскевічаў. Там усталяваны спецыяльны купал, разлічаны на 11 наведвальнікаў. Павільён мае 8 метраў у дыяметры і 5 — у вышыню. Праекцыя трансліруецца на купал, што забяспечвае панарамны агляд для гледачоў. Пры гэтым дасягаецца максімальная рэалістычнасць і адчуванне прысутнасці. Пакуль у планетарыі дэманструюць пяць фільмаў працягласцю каля паўгадзіны на касмічную тэматыку, аднак з часам спіс сеансаў пашыраць.

— Новая зала можа быць выкарыстана для папулярызацыі астраноміі, касманаўтыкі, гісторыі навукі ў цэлым, — гаворыць **гомельскі астраном і краязнаўца Уладзімір ЛАРЫЁНАЎ.** — Мы ж ведаем, што гісторыя Беларусі, і ў прыватнасці Гомельшчыны, вельмі цесна пераплецена з дзейнасцю навукоўцаў, якія сур'ёзна займаліся і астраноміяй, і касманаўтыкай.

— Магчыма, у хуткім часе новы планетарый адправіцца на гастролі ў іншыя раёны Гомельшчыны, — адзначыла **дырэктар музея Палаца Румянцавых і Паскевічаў Аксана ТОРАПАВА.** — Гэта для таго, каб жыхары не толькі абласнога цэнтра, але і ўсёй вобласці далучыліся да касмічнай гармоніі.

Дарэчы, у сучасным гомельскім планетарыі дэманструюцца не толькі галактыкі і зоркі, але і падводны свет, мікракосмас, а таксама віртуальнае вандраванне па чалавечым арганізме.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

# У СТАЛІЦЫ — ДВА «СУХІЯ» ДНІ

## У дні выпускных не будуць прадаваць алкаголь

**Продаж алкаголю будзе абмежаваны ў Мінску 30 мая і 10 чэрвеня. Гэта замацавана рашэннем Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта №1306 ад 20 красавіка 2017 года, якое апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**

З 8.00 30 мая да 8.00 31 мая і з 8.00 10 чэрвеня да 8.00 11 чэрвеня на тэрыторыі Мінска будзе абмежаваны продаж алкагольных напояў (гарэлкі, лікёра-гарэлачных вырабаў, віна, каньяку, брэндзі, кальвадосу, шампанскага і іншых напояў з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 7 працэнтаў і большай), за выключэннем рознічнага гандлю на аб'ектах грамадскага харчавання ў разліў. Гэтая мера прымаецца ў сувязі з правядзеннем выпускных вечароў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Акрамя таго, рознічны гандаль півам і слабаалкагольнымі напоямі з аб'ёмнай доляй этылавага спірту не большай за 7 працэнтаў на тэрыторыі Мінска не ажыццяўляецца ў гандлёвых аб'ектах з 8.00 30 мая да 8.00 31 мая і з 8.00 10 чэрвеня да 8.00 11 чэрвеня. Гэтае рашэнне ўступіла ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

# Постаць, якая яднае



Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ.



Адам МАЛЬДЗІС.



Андрэй УНУЧАК.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Адам Мальдзіс:**

— Сапраўды, Эдвард Вайніловіч у свой час быў адным з нямногіх, хто разумеў, што на гэтых землях жыве беларускі народ. Ён аднолькава добра размаўляў па-польску, па-руску і па-беларуску, таксама валодаў нямецкай і французскай мовамі. А мы ведаем, чым большай колькасцю моў валодае чалавек, тым ён багацейшы духоўна. Вайніловіч лічыў, што зямля — цэнтр для народа, які тут жыве. Ён часам не называў народ беларусамі, а потым смела казаў і пра сябе, і пра сваіх землякоў як пра беларусаў. У той час як многія магнаты, напрыклад Радзівілы, Чартарыйскія, ніколі сябе беларусамі не называлі. Яны былі арыстакратамі прышлымі, а Вайніловіч — тутэйшы, паходзіў з мясцовага старажытнага роду Вайнілаў. Не так даўно да мяне прыязджаў з Парыжа нашчадак Вайнілаў і расказаў, што іх род тут жыў спрадвеку. Але сам Вайніловіч быў чалавекам сціплым. Ён неаднойчы пісаў, што хацеў бы быць пахаваным на Капыльшчыне, дзе побач з Савічамі знаходзіцца старажытны курган. Там пахаваныя яго продкі.

**Вячаслаў Даніловіч:**

— Калі да нас у інстытут звярнуліся з прапановай правесці мерапрыемствы па ўшанаванні памяці і спраў гэтага чалавека, мы з задавальненнем адгукнуліся. Ужо некалькі гадоў праводзіцца цыкл рэгіянальных імпрэз, прысвечаных асобе Вайніловіча. Пачалі ў 2015 годзе ў Капылі, дзе прайшла першая з канферэнцый. Прадоўжылі справу ў 2016-м у Нясвіжы, таксама рэгіянальнай канферэнцыяй, а сёлета восенню правядзём міжнародную канферэнцыю сумесна са Слуцкім раённым выканаўчым камітэтам, якая будзе прысвечана 170-годдзю мецэната. Слуцкая зямля цесна звязаная з лёсам Вайніловіча. Гэта навуковая імпрэза стане важнай падзеяй для Случчыны. Мы імкнёмся ладзіць канферэнцыі не толькі для акадэмічных навукоўцаў, але запрашаем на мерапрыемствы вучняў, настаўнікаў, яны атрымліваюць магчымасць паслухаць вучоных, задаць пытанне, даведацца нешта новае па гісторыі роднай зямлі і самім выказацца.

Але знакавасць сёлетняй канферэнцыі ў тым, што напярэдадні мы сумесна са Слуцкім райвыканкамам правядзём конкурс навукова-краязнаўчых работ навучэнцаў Случчыны, прысвечаных гісторыі мясцін, асобе Эдварда Вайніловіча. На канферэнцыі будуць прадстаўлены найлепшыя работы. Вядзём таксама перагаворы аб магчымасці адзначыць пераможцаў не толькі дыпломамі, але і падарункамі. Думаецца, гэтай канферэнцыяй мы засведчым значэнне Случчыны ў гісторыі Беларусі і ўшануем памяць Эдварда Вайніловіча.

## Ад матэрыялаў — да манаграфіі

***— Наколькі даследаваная спадчына Эдварда Ваніловіча? Мы ведаем, што ў перакладзе на беларускую мову выйшла частка яго ўспамінаў. Ці ёсць у планах напісаць грунтоўную манаграфію, магчыма, стварыць персанальную энцыклапедыю, прысвечаную яго асобе?***

**Андрэй Унучак:**

— Шмат яшчэ навукоўцам належыць зрабіць у галіне вывучэння біяграфіі Эдварда Вайніловіча. Ёсць успаміны, выдадзеныя па-беларуску, якія вы згадалі, два зборнікі матэрыялаў, што выйшлі за апошнія гады, раней публікаваліся матэрыялы, артыкулы, прысвечаныя яго творчасці і постаці. Але сёння, калі казаць пра біяграфістыку ў беларускай гістарыяграфіі, то такіх работ, прысвечаных асобным постацям, не так і шмат. І Вайніловіч, безумоўна, грунтоўнага даследавання заслугоўвае. Мы можам казаць, што для нас, навукоўцаў, гэта ў пэўным сэнсе выклік. Бо на супрацоўнікаў Інстытута гісторыі ў гэтым выпадку звяртаюць увагу найперш. Таму менавіта мы ўжо тры гады запар ладзім канферэнцыі, прысвечаныя Эдварду Вайніловічу. Гэта паказвае зацікаўленасць навукоўцаў тэмай, яе запатрабаванасць грамадствам, а таксама тое, што матэрыялы для даследаванняў ёсць. Мы маем прастору для дзейнасці, але ёсць ужо і напрацоўкі, на аснове якіх можна ствараць манаграфію, пісаць біяграфію, нават энцыклапедыю Вайніловіча.

***— Магчыма, варта было б напісаць біяграфічны раман?***

**Вячаслаў Даніловіч:**

— З такой прапановай трэба звяртацца да пісьменнікаў. Але ідэя слушная. У любым выпадку нам найперш варта назапасіць матэрыял. Я ўпэўнены, што з цягам часу гэтыя кропкавыя даследаванні аб'ядноюцца ў манаграфію, прысвечаную асобе Эдварда Вайніловіча. Магчыма, дойдзе справа і да энцыклапедыі.

**Адам Мальдзіс:**

— Да мяне ўвесь час звяртаюцца з просьбамі напісаць кнігу пра Эдварда Вайніловіча. Калі я быў яшчэ вучнем сярэдняй школы, часта ездзіў з бацькамі ў Вільнюс і хадзіў па букіністычных крамах. Набываў тое, што мне здавалася звязаным з нашым краем. У свой час набыў і кнігу ўспамінаў Вайніловіча, толькі таму, што прозвішча мне падалося беларускім. Ужо праз многа гадоў напісаў пра яго некалькі артыкулаў для розных выданняў. І мне прапанавалі напісаць кнігу, дзе варта спалучыць навуковы аналіз, эсэістыку, пры гэтым напісаць тэкст жыва, даступна для звычайнага чытача. Караткевіч у свой час мяне сагітаваў напісаць аповесць «Восень пасярод вясны», звязаную з паўстаннем пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Таму я сапраўды пачаў думаць, што можна ўкласці ўжо кнігу пра Вайніловіча, звярнуў увагу найперш на выключнасць яго асобы. Я ўжо нават пачаў складаць план. Як сябар рады па кананізацыі Вайніловіча не маю права пісаць і казаць нешта кепскае пра яго. Але тут сапраўды можна быць спакойным: ніякіх слабых чалавечых рыс я ў яго асобе не бачу.

## Прыклад выключна станоўчы

***— У шырокай грамадскай свядомасці асоба Вайніловіча асацыюецца найперш з будаўніцтвам Чырвонага касцёла. Але ж за сваё жыццё ён зрабіў шмат карысных для роднага краю спраў, якія варта памятаць і казаць пра іх.***

**Вячаслаў Даніловіч:**

— Сапраўды. Але яшчэ я хацеў бы падкрэсліць важнасць прынцыповага стаўлення Вайніловіча да працэсаў, што адбываліся на беларускай зямлі. Напрыклад, ён падтрымліваў наш нацыянальны рух, беларускую літаратуру. Не пайшоў на супрацоўніцтва з германскімі акупацыйнымі ўладамі падчас Першай сусветнай вайны, калі была акупаваная Міншчына. Калі паводле Рыжскага мірнага дагавора адбыўся падзел Беларусі на Заходнюю і Усходнюю, Вайніловіч публічна выказаўся супраць такога кроку. Казаў пра тое, што адзіны народ не павінен быць падзелены на часткі паміж рознымі краінамі. Вайніловіч шмат зрабіў для развіцця сельскагаспадарчай справы. Ён доўга ўзначальваў Мінскае сельскагаспадарчае таварыства, тады яно было самым буйным, вядомым і актыўным у заходніх губернях. У першую чаргу гэтаму спрыяў Эдвард Вайніловіч і яго актыўная праца. У Клецку заснаваў разлікова-ашчадны банк, у Слуцку — гандлёвую школу, таварыства дабрачыннасці. Ён клапаціўся пра эканамічнае, культурнае развіццё краю, меў і грунтоўную, прынцыповую стваральную пазіцыю, не ішоў на кампрамісы са сваім сумленнем.

Гэта ключавая асоба для свайго часу, і прызнанне каталіцкай царквой Вайніловіча благаславёным сведчыць пра яго высокую духоўнасць. Ён здолеў вытрымаць удары лёсу, яны не зламілі яго. А ў памяць пра дзяцей, якія памерлі, ён не проста паставіў помнік, але пабудаваў сапраўдны храм, куды могуць прыйсці ўсе, каб памаліцца, храм, які з'яўляецца сімвалам нашай сталіцы. Гэта таксама істотны момант.

**Адам Мальдзіс:**

— Сапраўды, Рыжскі мірны дагавор, у выніку якога яго родную Міншчыну падзялілі папалам, Вайніловіч успрыняў з абурэннем. Ён таксама належаў ды тых людзей, якія свайго імені не страцілі, нават калі было забаронена лічыць сябе беларусам. Тут ён стаіць поруч з Францішкам Багушэвічам, Магдаленай Радзівіл. Вайніловіч варты кананізацыі яшчэ і таму, што, з'яўляючыся прадстаўніком шляхты сярэдняй заможнасці, ён ніколі не вылучаў сябе як вышэйшую, абраную асобу. Імкнуўся быць як усе. Вайніловіч не быў рэвалюцыянерам, ён лічыў, што трэба развіваць край эвалюцыйна. Канешне, ён быў добрым гаспадаром. Праз 25 гадоў існавання сельскагаспадарчага таварыства гэта даказала выстаўка вынікаў яго працы, што прайшла ў Мінску. Усе адчувалі сябе раўнапраўнымі, ён гуртаваў прадстаўнікоў усіх нацый. Таму Вайніловіча смела можна назваць народным гаспадаром. На пасады аканомаў у сваіх маёнтках ён прызначаў простых сялян, якія былі вельмі кемлівымі. Адначасова ён быў і пакутнікам. Страціў дзяцей, жонку і не захацеў ажаніцца зноў.

***— Таксама важны момант у тым, што яго асоба яднала і сёння яднае розныя канфесіі: ён фундзіраваў не толькі касцёлы, але і цэрквы.***

**Вячаслаў Даніловіч:**

— Сапраўды, Вайніловіч быў чалавекам з надзвычай развітым пачуццём справядлівасці, прынцыповасці, ён меў шырокія погляды, клапаціўся пра развіццё грамадства і сваёй краіны, улічваючы ўсе яе асаблівасці.

**Андрэй Унучак:**

— Так, Эдвард Вайніловіч быў вельмі талерантным чалавекам. Шанаваў гісторыю, вельмі добра ведаў сямейны радавод аж да пачатку XVI стагоддзя і ганарыўся сваім родам. Таксама цікавыя яго ўспаміны пра паўстанне 1863—1864 гг. На той момант яму было 16 гадоў. Вайніловіч лічыў, што паўстанне не дасягне тых мэтаў, якія ставілі паўстанцы, а край будзе зруйнаваны. Таму ён стаяў на ідэі штодзень весці ствральную працу, якая падыме адукацыю, эканоміку ў краі, зробіць з былых земляў ВКЛ квітнеючае асяроддзе. Разам з тым не асуджаў паўстанцаў, не казаў пра іх кепска, аднак лічыў, што тых мамантаў, што з'яўляліся ідэаламі эпохі, можна было дасягнуць праз развіццё адукацыі і цяжкую працу.

Дарэчы, на Случчыне Вайніловіч стаў заснавальнікам сістэмы страхавання. На той час звычайны пажар мог знішчыць цэлую вёску. Людзі заставаліся без нічога, гадамі маглі жыць у зямлянках. Але сістэма страхавання, прапанаваная Вайніловічам, настолькі мінімізавала ўрон ад пажараў, што гэты падыход быў узяты за аснову ва ўсёй Расійскай імперыі.

> **«Эдвард Вайніловіч — асоба выключная. Я не ведаю другога чалавека са свецкіх асоб, якога ў Беларусі прапанавалі б кананізаваць. Усе беларускія святыя — людзі духоўныя, якія прысвяцілі сваё жыццё служэнню Богу».**

**Адам Мальдзіс:**

— Сёння некаторыя журналісты называюць Вайніловіча «беларускім Сталыпіным», а я хутчэй назваў бы Сталыпіна «расійскім Вайніловічам». Сталыпін хацеў, каб Вайніловіч пасля рэвалюцыі 1905 года стаў намеснікам міністра сельскай гаспадаркі, а ён быў верны Міншчыне і не пагадзіўся стаць чыноўнікам. Хацеў быць са сваім народам. Падчас Першай сусветнай вайны ён быў разгублены: маёнтак, дзе знаходзілася багатая бібліятэка, разрабавалі, яму даводзілася начаваць у лесе зімою. З вялікай цяжкасцю выехаў у Польшчу. Але імкнуўся выратаваць людзей, перспектыўных для Беларусі, узяў іх з сабою.

**Вячаслаў Даніловіч:**

— Эдвард Вайніловіч — выдатны прыклад чалавека, які стварае штосьці станоўчае, спрыяе развіццю краіны эвалюцыйным шляхам. І нам вельмі важна ў сённяшніх умовах успамінаць менавіта такіх асоб. У нашы дні часта бачым спробы радыкалізаваць, раскалоць грамадства. А Вайніловіч, як чалавек дасведчаны, разумеў, што гэта да дабра не даводзіць.

**Адам Мальдзіс:**

— Эдвард Вайніловіч — асоба выключная. Я не ведаю другога чалавека са свецкіх асоб, якога ў Беларусі прапанавалі б кананізаваць. Усе беларускія святыя — людзі духоўныя, якія прысвяцілі сваё жыццё служэнню Богу. Больш за тое, ён жыў у самы складаны для Беларусі час, калі наша краіна знаходзілася паміж Усходам і Захадам. Ён падтрымліваў традыцыі збліжэння і ўзаемаразумення, талерантнасці ў дачыненні да іншых веравызнанняў. Нават касцёл Чырвоны пабудаваў у раманскім стылі, бо хацеў, каб ён не спаборнічаў па архітэктуры з іншымі храмамі Мінска, быў асобным па сваім стылі. Дапамагаў беларускім мусульманам, яўрэям, праваслаўным. Ён адзін з нямногіх наследаваў традыцыі ВКЛ у складаны час, калі мы страцілі імя сваёй краіны.

## Навукоўцы поруч са святарамі

***Эдвард Вайніловіч, яго асоба, жыццёвы прыклад сёння яднаюць не толькі канфесіі, але і свецкую навуку з рэлігіяй. Мы бачым, што навукоўцы выдатна працуюць поруч са святарамі дзеля дасягнення агульнай мэты.***

**Вячаслаў Даніловіч:**

— Так, калі мы толькі пачыналі размову, да нас звярнуліся ксёндз-магістр Уладыслаў Завальнюк, пробашч парафіі Чырвонага касцёла, разам з даследчыкам, кандыдатам гістарычных навук Уладзімірам Пуцікам. І мы, ведаючы асобу Вайніловіча, палічылі такую працу за станоўчы прыклад. Гэта спрыяе кансалідацыі грамадства. Мы адкрытыя для супрацоўніцтва, у нас шмат сумесных мерапрыемстваў і з Беларускай праваслаўнай царквой.

**Андрэй Унучак:**

— Я не стаў бы супрацьпастаўляць працу вучоных і святароў. Яшчэ з XIX стагоддзя згадаю шмат прыкладаў вучоных-святароў, якія пісалі грунтоўныя навуковыя даследаванні. Гэта было абсалютна звычайнай справай. У пытанні вывучэння лёсаў такіх высокадухоўных асоб, як Эдвард Вайніловіч, супрацоўніцтва навукоўцаў і святароў можа даць яшчэ большы плён, мы дапаўняем адно аднаго. Не перацягваем канат, а дапамагаем сабе, а потым і чытачу глыбей зразумець чалавека, яго матывы і ўчынкі.

**Вячаслаў Даніловіч:**

— Мне бачыцца, што любы вучоны павінен быць духоўным чалавекам. Бо калі гэтага духоўнага складальніка, маральных якасцяў няма, то навуковыя адкрыцці могуць прывесці да жудасных знішчальных вынікаў. І гісторыя паказвае, што часта радыкальныя падзеі ў грамадстве звязаныя са стратай духоўнага стрыжня. Гэта ў выніку прыводзіла да адмоўных з'яў, пасля якіх наша грамадства аднаўлялася дзесяцігоддзямі.

## Дзеля развіцця турызму

***— Пасля ўвядзення дазволу на 5-дзённае наведванне нашай краіны без візы вельмі актуальным становіцца пытанне турыстычнага патэнцыялу розных мясцін. Ведаю, што ўжо створаны маршрут «Слядамі Вайніловіча», які праходзіць праз Слуцк, Капыль, Клецк і тыя месцы, што звязаныя з жыццём і дзейнасцю мецэната. Наколькі ён можа быць запатрабаваны сёння і ці важна яго больш актыўна прапагандаваць?***

**Вячаслаў Даніловіч:**

— На наш погляд, гэты маршрут запатрабаваны. І са свайго боку мы спрыяем яго большай папулярнасці — праводзім рэгіянальныя канферэнцыі з удзелам шырокай грамадскасці. Асоба Вайніловіча звязаная не толькі з Беларуссю, але і з Расіяй, Польшчай, Літвой, Украінай. І сёння ў Слуцку захаваўся будынак гандлёвай школы, якую Вайніловіч некалі заснаваў. Нам ёсць што паказаць, расказаць пра гэтага чалавека. Асабліва тым, хто цікавіцца гістарычным мінулым і знакавымі асобамі нашай краіны. Больш за тое, канферэнцыі, якія мы праводзім, будуць карысныя для экскурсаводаў, што працуюць на маршруце. Нам вельмі важна, каб тыя звесткі, што расказваюць турыстам падчас экскурсій, не супярэчылі гістарычным фактам і адлюстроўвалі сапраўдныя падзеі. На жаль, такія выпадкі скажэнняў часам здараюцца. Таму з задавальненнем запрашаем на канферэнцыю ў Слуцку і экскурсаводаў. Лічу таксама важным аднаўленне маёнтка Вайніловіча ў Савічах. Натуральна, патрэбнае фінансаванне. Магчыма, нехта са спонсараў выкажа жаданне падтрымаць гэты праект, мы толькі з радасцю пагодзімся. Лічым, што трэба ўзнаўляць спадчыну, якую мы мелі, тым больш, калі ёсць дакладныя апісанні маёнтка, паводле якіх будзе адноўлены яго гістарычны выгляд, а не пабудавана нешта новае.

## Чакаем цуду

***— Каб працэс беатыфікацыі Вайніловіча быў завершаны і яго афіцыйна прызналі святым, павінен здарыцца цуд. Што можа быць такім цудам?***

**Вячаслаў Даніловіч:**

— Ці не цуд тое, што памяць пра асобу захоўваецца праз дзесяцігоддзі? Выходзяць кнігі, праводзяцца канферэнцыі, ды і вынікі яго працы становяцца сімваламі сталіцы і краіны. Такіх людзей не так шмат. Калі Вайніловіч рабіў гэта, то, я ўпэўнены, без думкі, аб уславленні свайго імя. Проста рабіў — для сваёй краіны і народа. Цяпер памяць захоўваецца і рухаецца наперад, развіваецца. Гэта ўсё дае магчымасць нашым суайчыннікам, сучаснікам браць прыклад з выдатных папярэднікаў, далей ісці шляхам, які паказаў Вайніловіч, рабіць добрыя рэчы і для нашай нацыі, і для краіны. Далёка не кожная гістарычная постаць можа пахваліцца такім безумоўна станоўчым стаўленнем. Памяць пра яго добрыя справы жыве.

**Адам Мальдзіс:**

— Не магу сёння растлумачыць, чаму тады ў Вільні я набыў менавіта кнігу ўспамінаў Вайніловіча. Грошай у вучня ж было мала. Магчыма, гэта і быў цуд.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Андрэй СІДАРЭЙКА**

# АДЗІНОКІ ГОЛУБ

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

**Андрэя Сідарэйку нельга аднесці да аўтараў, для якіх галоўнае — як мага часцей друкавацца. Ён гатовы чакаць, пакуль новае апавяданне адляжыцца, каб пасля, калі трэба, уносіць у яго патрэбныя праўкі, сёе-тое мяняць у сюжэце. Магчыма, таму яго імя не так часта мільгае на старонках літаратурных выданняў у параўнанні з імёнамі некаторых яго равеснікаў — тых, каму крыху больш за трыццаць. Але, як правіла, такі сур'ёзны падыход да ўласнай творчасці і дае найбольшы плён. Прынамсі, Андрэй ужо двойчы станавіўся лаўрэатам звяздоўскага конкурсу на найлепшае апавяданне.**

**Алесь БАДАК.**

На дварэ быў сцюдзёны лютаўскі дзень.

По тратуары ішоў вельмі проста адзеты хударлявы мужчына, на выгляд якому было крыху за шэсцьдзясят. Іншы сказаў бы, што мужчына жабрак, а яго адзенне з крамы «сэканд-хэнд». Людскі паток мінаў, аббягаў, абыходзіў яго. Але ён не звяртаў на гэта ўвагі і ішоў па звыклым маршруце: прагулка, якую параілі рабіць дактары.

Пяць месяцаў таму ў чалавека выявілі анкалагічнае захворванне. Бальнічныя калідоры, такія ж, як ён, хворыя, чэргі да ўрачоў, сеансы тэрапіі — няпоўны спіс таго, чым было напоўнена жыццё мужчыны апошнім часам.

На яго галаве была шапка-аблавушка. Яна не столькі засцерагала ад холаду, колькі хавала залысінку і зусім рэдкія валасы.

Усе клопаты, думкі, перажыванні чалавек трымаў у сабе, і, пэўна, з гэтай прычыны выгляд яго быў пануры. У грамадстве да людзей з анкалогіяй (як і са СНІДам) ставяцца з асцярогай, таму гаварыць аб гэтым з кім-небудзь мужчына не хацеў. Нават у аптэцы ён набываў патрэбныя лекі, калі там нікога не было.

Чалавек не звяртаў увагі на мароз. Яму хацелася надыхацца гэтым сцюдзёным паветрам. З моманту, як у яго выявілі анкалогію, мужчына прызвычаіўся да думкі: па гэтым самым тратуары будуць працягваць хадзіць людзі, а яго на гэтай зямлі больш не будзе. Ніколі.

І ў гэты зімовы дзень чалавеку проста хацелася ЖЫЦЬ.

Паволі мужчына падышоў да прыпынку каля метро. Тут жа хадзілі галубы. У прыбітым нагамі снезе яны шукалі ежу.

Чалавек дастаў з кішэні семкі, сыпануў іх долу. Ён рабіў гэтак штодня.

Птушкі кінуліся падбіраць пачастунак. Толькі адзін голуб ці то з падбітай, ці то адмарожанай лапай застаўся на месцы.

Чалавек зірнуў на кволую птушку. Раней ён тут яе не прыкмячаў. Сеўшы на кукішкі так, каб засланіць спінай астатніх птушак, мужчына зноў дастаў з кішэні семкі, сыпануў іх акурат каля голуба.

— На, падмацуйся, — прамовіў ён.

Прысеўшы на здаровую нагу, а хворую выставіўшы ўбок, голуб стаў хутка дзяўбці, каб ласунак не паспелі заўважыць іншыя. У гэты час пры самым краі дарогі на вялікай хуткасці праехала машына. Бруд з-пад яе колаў кроплямі пырснуў на чысцюткі снег.

«Чорнае на белым, — падумаў чалавек. — Усё як у жыцці».

Раптам ад перажытага на вочы навярнуліся слёзы.

«Чаму менавіта так склаўся мой лёс?» — падумаў мужчына.

Лёс, які на пачатку жыцця здаваўся бясконцай дарогай, а сёння... ён хадзіў па яе краі. З рызыкай у любое імгненне сазлізнуць у бездань.

Чалавеку прыгадалася сустрэча з будучай жонкай — Волечкай.

У той памятны зімовы вечар ён, дваццацідвухгадовы хлопец, зайшоў у камбінат бытавога абслугоўвання з намерам падрамантаваць штаны. Дзяўчына-швачка збіралася дадому, але заказ усё ж прыняла. Яна падалася хлопцу задужа сціплай. Да таго ж выраз яе твару адразу запаў у душу: блакітныя вочы, крыху паўнаватыя шчокі з невялічкімі прывабнымі ямачкамі. Таксама кінуліся ў вочы русыя валасы і танклявы стан. Невядома чаму, але ў гэты момант яму захацелася завесці размову, правесці дзяўчыну да прыпынку.

— У кіно не жадаеце схадзіць? — прапанаваў ён.

— Можна. Заўтра. А сёмай вечара, — нечакана пагадзілася яна і мімаволі зачырванелася.

Ён не памятаў, пра што была кінастужка, бо ўвесь час побач з дзяўчынай адчуваў нейкую неспазнаную дагэтуль асалоду і лёгкасць.

Праз паўгода, калі маладыя не ўяўлялі жыцця адно без аднаго, згулялі вяселле. А яшчэ праз год нарадзіўся іх адзіны сын Толік.

Здавалася, сямейнае шчасце будзе бясконцым. Аднак чалавек мяркуе, а недзе там, у нябеснай канцылярыі, хтосьці вырашае зусім інакш.

Грымнула нечакана. Праз пятнаццаць гадоў сумеснага жыцця. Неўзабаве без усялякіх дыет Волечка стала худзець, шмат адпачываць, больш спаць. Але стомленасць у яе не праходзіла.

Напачатку жанчына не звяртала ўвагі на трывожныя сімптомы. Недаацэньвала іх. Але ў адзін дзень усё ж вырашыла наведацца да ўрачоў.

— Анкалогія, — як прысуд, абвясціў доктар. — Трэба было раней, своечасова. Запусцілі вы сябе...

Грошай на лекі чалавек не шкадаваў. На іх пайшлі ўсе сродкі. Прыйшлося прадаць і лецішча. Але нічога не дапамагала. Жонка згасала. А ў адзін вясновы дзень Волечка пакінула яго назаўсёды.

«Чорнае на белым», — паўтарыў пра сябе мужчына.

Яму раптам захацелася зайсці ў краму. Набыць што-небудзь да гарбаты. Ля дзвярэй спыніла кампанія маладых людзей. Хлопцы былі без шапак, падстрыжаныя «пад нуль». У свядомасці мужчыны імгненна пранеслася думка, што гэта «прычоска» ў іх з'явілася пасля хіміятэрапій.

— Закурыць не будзе? — запытаўся адзін з «хворых».

— Не куру, — адказаў чалавек.

Хлопец нагадаў яму сына. Яго Толіка...

...У той жа год пасля смерці жонкі сын скончыў школу, паступіў у прафесійна-тэхнічнае вучылішча. Вучоба ў ПТВ прынесла хваляванні: бацька заўважыў — вечарамі сын стаў знікаць з дому. Вяртаўся нападпітку і клаўся спаць. Аднойчы пасля такога ж вечара сын з'явіўся не адзін — з дзяўчынай. Праз паўгода згулялі вяселле. Яшчэ праз паўгода сын заявіў:

— Хочам жыць адны. Трэба кватэру абмяняць на дзве аднапакаёвыя.

Бацька не хацеў замінаць, пагадзіўся.

За другую аднапакаёўку прыйшлося даплаціць.

Мужчына выйшаў на заслужаны адпачынак. Здавалася, жыццё пачыналася наноў.

Сын у госці не заходзіў, не тэлефанаваў. Хутка бацька даведаўся: сын зблытаўся з дрэннай кампаніяй. А яшчэ праз год за крадзеж трапіў у турму. Нявестка ў кватэры з'яўлялася рэдка: прападала ў такой жа кампаніі, што дагэтуль і сын.

Каб не страціць кватэру, мужчына сам аплачваў камунальныя паслугі. Некалькі разоў хадзіў да юрыста. Хацеў перааформіць кватэру на сябе.

Але тут урачы выявілі цяжкае захворванне. І тое, што раней хвалявала, падалося звычайнай драбязой.

На зваротным шляху чалавека ўзяла задышка. Ён прысеў на лаву. Яго мінаў людскі паток. То былі здаровыя людзі.

Хворыя заўсёды зайздросцяць здаровым.

«За што?!» — былі першыя думкі, калі яму абвясцілі дыягназ.

Пасля мужчына даведаўся, што такая рэакцыя ва ўсіх. Што ўсе, як і ён, напачатку не вераць пачутаму, робяць паўторныя аналізы.

Ён памятаў першую размову з доктарам. Напачатку той маляваў на паперцы нейкія кругі, па іх расказваў пра цыкл развіцця раку ў арганізме. Запэўніваў: яго пухліна з'явілася не так даўно і яе рэальна перамагчы.

— Толькі трэба змагацца. Можна яшчэ шмат што зрабіць з таго, што дазваляе медыцына і вашае становішча на дадзены момант, — гаварыў у пакоі доктар.

— Што менавіта? — пацікавіўся ён.

— Добры эфект дае хіміятэрапія. Яна ўздзейнічае на ўвесь арганізм, таму лепш за іншыя спосабы лекавання змагаецца з ракавымі клеткамі.

Далей было нешта падобнае на лекцыю аб карысці хіміятэрапіі. Напрыканцы доктар параіў азнаёміцца з невялічкай брашурай, а таксама схадзіць на прыём да псіхолага.

— Вас цікавіць што-небудзь яшчэ? — запытаўся ўрач.

Чалавек хацеў сказаць, што некалі разам з жонкай ужо быў у псіхолага і пра самыя лепшыя лекі, у тым ліку хіміятэрапію, ведае. Але вось няўдача: жонцы гэта не дапамагло, а цяпер хвароба ўзялася і за яго.

— Не, пакуль хопіць, — усё ж стрываўся ён.

...І ўсё ж ён вырашыў змагацца да апошняга. Для гэтага патрабаваліся лекі. Яны каштавалі не танна. А жыць на пенсію і выдаткоўваць грошы на патрэбныя лекі — значыць зацягнуць пояс, шмат ад чаго адмовіцца. Словам, выжываць. Часам — пазычаць у суседзяў. Дзякуй богу, яны чалавеку давяралі і заўсёды дапамагалі.

Яшчэ да хіміятэрапіі ён здаў усе патрэбныя аналізы, прайшоў біяпсію. У яго ўсё часцей стала балець галава, з'яўлялася пачуццё стомы.

Да таго ж ён памятаў пра яе. Ён думаў аб ёй заўсёды. Кожныя выхадныя ездзіў на могілкі. Пасля таго, як яму паставілі дыягназ як і ў нябожчыцы-жонкі, ён адчуў яшчэ большую сувязь з ёй. Ён разумеў, што па-сапраўднаму жыў толькі тады. Калі бачыў яе вочы, чуў яе голас, смех. А цяпер ён толькі існаваў і вёў барацьбу за гэтае існаванне.

Настаў дзень, калі яму зрабілі першую хіміятэрапію. У пакоі ён сядзеў на звычайным зэдліку, размаўляў з іншым мужчынам, а ў гэты час па сістэме, а потым і па яго венах, бег сапраўдны яд.

За гэты час былі ўжо дзве хіміятэрапіі. Паміж імі — тры тыдні адпачынку. Тры тыдні на тое, каб папярэдняя тэрапія падзейнічала: новыя клеткі раку не з'явіліся, а старыя па магчымасці знішчыліся. Патрэбна было, каб арганізм падрыхтаваўся да іншага курса тэрапіі. І, вядома, у гэты час гінулі і здаровыя клеткі. Чалавек гэта разумеў па выпадзенні валасоў.

Калі яму засталося жыць не так шмат, то як бы ён хацеў правесці гэты апошні час? Ён успомніў, што вельмі даўно не быў у кінатэатры, на рыбалцы. Яму хацелася пабываць з экскурсіяй па розных гістарычных месцах нашай краіны. Яму хацелася апошні раз пры памяці паглядзець у вочы і пагаварыць з роднымі людзьмі. А перш за ўсё з сынам.

Раптам у вачах пайшлі кругі.

— Мужчына, вам дрэнна? — пачуўся голас жанчыны.

Чалавек перавёў погляд на незнаёмку. Неўзабаве боль адпусціў, вярнулася прытомнасць.

— Зараз, зараз, — казала жанчына, дастаючы з сумкі мабільны.

— Не трэба, — папрасіў ён. — Дзякуй.

— Ну, глядзіце, — усё перажывала жанчына.

Чалавек падзякаваў яшчэ раз. Жанчына пайшла.

Пайшоў снег. Белыя вялізныя камякі падалі чалавеку на твар, лезлі ў вочы. Прагулка падыходзіла да завяршэння.

Трэба было вяртацца дадому. А не хацелася. Хацелася яшчэ патупаць па гэтым намёрзлым тратуары.

Дома чалавека чакалі чатыры сцяны і... адзінота. Тэлевізар. Гарбата. Тэлевізар. Прагноз надвор'я на заўтра.

Хацелася забыцца пра гэты дом. Пэўна, ён бы пагадзіўся жыць на вуліцы жабраком, калі б да яго вярнулася здароўе, Толік выйшаў з турмы, каб... Як шмат у жыцці гэтых «каб».

Чалавеку зноў прыгадаўся голуб, які быў такім жа, як і ён, адзінокім інвалідам-дахадзягам. «Забяру да сябе. Што яму тут, на прыпынку, рабіць? Аслабне, здохне. А так удвух будзе весялей. Схаджу да ветэрынара. Можа, чым дапаможа», — думаў мужчына.

У кіёску каля прыпынку чалавек набыў семкі для прыманкі. Убачыўшы голуба, як і ў першы раз, мужчына прысеў так, каб засланіць спінай астатніх птушак. Ён насыпаў семкі сабе ў далонь і працягнуў яе голубу, які на адной лапе даскакаў да ласунку. Улучыўшы момант, вольнай рукой мужчына злавіў птушку. Ці то голуб не зразумеў, што адбылося, ці то ў яго не было моцы, але ён нават не стараўся вызваліцца.

Мужчына збіраўся ўжо ісці дадому, як зазваніў мабільны тэлефон.

— Дзень добры, — пачуўся мужчынскі голас. — Алег Іванавіч?

— Так, — адказаў мужчына.

— Гэта вас з анкалагічнага цэнтра хвалююць.

У мужчыны зашчымела ў грудзях.

— Мы праверылі вашыя аналізы. Яны нашмат лепшыя за папярэднія. Пэўна, станоўча падзейнічала хіміятэрапія. Калі ласка, зайдзіце да нас заўтра а палове на адзінаццатую.

— Так, — не верачы пачутаму, адказаў мужчына. — Абавязкова прыйду.

— Да сустрэчы.

Голас сціх, а мужчына ўсё працягваў стаяць на адным месцы.

У гэты момант да прыпынку пачаў даносіцца гук званоў. Храм быў за дзве сотні метраў адгэтуль. Пэўна, там пачыналася чарговае служэнне.

Мужчына падумаў: «Калі лёс быў да яго суровым, то недзе там, на нябёсах, нарэшце злітаваліся. Далі другі шанц. Значыць, яго час развітвацца з жыццём яшчэ не настаў. Ён патрэбны тут».

З удзячнасцю ён зірнуў увышыню. На нейкі момант перастаў ісці снег, хмары разышліся, з'явіўся невялічкі авал блакітнага неба. Праз яго паказалася сонца і асвяціла прыпынак.

Ад нечаканага сонечнага яркага святла і расчуленасці на вачах у мужчыны з'явіліся слёзы. Ці то зразумеўшы чалавека, ці то пажадаўшы ўбачыць сонечнае святло, голуб таксама падняў галаву ўверх. Пэўна, і ён верыў, што аднойчы выздаравее і будзе лётаць пад нябёсамі.

Як ніколі чалавек і птушка ў гэтае імгненне былі падобныя адно да аднаго: абое пакрыўджаныя лёсам, абое верылі ў лепшае.

Звон званоў усё працягваў раздавацца на прыпынку. Разам з ім недзе ў вышыні лунала невялічкая надзея, што магутная боская воля пазбавіць чалавека і голуба ад усіх пакут, якія выпалі на іх долю.

# ВОСТРАЎ НА ПРОДАЖ



## ЧАМУ АБАНКРУЦІЛАСЯ ПУЭРТА-РЫКА?

**Пуэрта-Рыка афіцыйна звярнулася ў акруговы суд Сан-Хуана, галоўнага горада вострава, з просьбай абараніць яго ад крэдытораў. Так на дзелавой і афіцыйнай мове называецца працэдура банкруцтва, якую нарэшце пачаў гэты невялікі востраў у Карыбскім моры. Дасюль рэкордным сярод амерыканскіх гарадоў і муніцыпальных аб'яднанняў лічылася банкруцтва Дэтройта ў 2013 годзе (18 млрд долараў). Сума пуэртарыканскага даўгавога пытання — $74 млрд. Гэтыя астранамічныя грошы запазычыўся ўрад вострава, плошча якога крыху большая за 9 тыс. км, а насельніцтва не перавышае 3,5 мільёна чалавек. Як жа Пуэрта-Рыка «нажыло» такія рэкордныя даўгі?**

### У ЧАКАННІ ПЛЕБІСЦЫТУ

Пуэрта-Рыка — залежная ад ЗША тэрыторыя, якая мае статус «неінкарпараванай арганізаванай тэрыторыі», гэта значыць знаходзіцца пад кіраваннем Злучаных Штатаў, але не з'яўляецца іх неад'емнай часткай. Дзеянне на ёй Канстытуцыі ЗША абмежаванае, вярхоўная ўлада належыць Кангрэсу, але тэрыторыя мае ўласную сістэму самакіравання. Назва тэрыторыі паходзіць ад іспанскага Puerto Rico (у перакладзе — «багаты порт»), размешчана яна ў Карыбскім моры на востраве Пуэрта-Рыка, які ўваходзіць у групу Вялікіх Антыльскіх астравоў. Пуэрта-Рыка мае сваю ўласную Канстытуцыю, заканадаўчую, выканаўчую і судовую ўладу. Сувязь з ЗША заключаецца ў наяўнасці агульнага грамадзянства, валюты і абароны.

У пачатку 1900-х гадоў эканоміка Пуэрта-Рыка была пераважна аграрнай, і яго асноўным таварам з'яўляўся цукар. У канцы 1940-х былі запушчаныя некалькі праектаў пад назвай «Operation Bootstrap», сутнасць якіх заключалася ў вызваленні ад падаткаў і будаўніцтве фабрык. У выніку прамысловая вытворчасць стала асноўнай галіной вострава. У часы Вялікай дэпрэсіі эканамічныя ўмовы ў Пуэрта-Рыка прыкметна палепшыліся з-за знешніх інвестыцый у капіталаёмістыя галіны прамысловасці, такія як нафтахімія і фармацэўтыка. Дзякуючы амерыканскім падатковым паслабленням мясцовыя галіны прамысловасці здольныя канкурыраваць з краінамі, дзе зарплата значна ніжэйшая за амерыканскія стандарты. Турызм з'яўляецца важным кампанентам пуэртарыканскай эканомікі і прыносіць прыкладна $1,8 млрд на год. Штогод востраў наведваюць каля 5 млн турыстаў, пераважна з ЗША. Прыблізна трэць з іх складаюць пасажыры круізных лайнераў. Але ўзровень развіцця красамоўна вызначае тое, што пачынаючы з 1952 года розніца ВУП на душу насельніцтва паміж Пуэрта-Рыка і асноўнай тэрыторыяй Злучаных Штатаў заставалася нязменнай — востраў мае прыкладна трэць ад сярэдняга значэння па ЗША.

Фінансавыя цяжкасці — не рэдкасць. Напрыклад, 1 мая 2006 года бюджэт вострава сутыкнуўся з рэзкім недахопам грашовай наяўнасці, што прывяло да закрыцця мясцовага міністэрства адукацыі і 42 іншых урадавых устаноў. Усё 1536 дзяржаўных школ таксама былі закрыты. Праўда, праз 10 дзён бюджэтны крызіс быў вырашаны новым падатковым дагаворам, так што ўсе дзяржслужачыя змаглі вярнуцца на працу.

У сувязі з адсутнасцю выразнай заканадаўчай базы па статусе тэрыторыі гэтае пытанне актыўна абмяркоўваецца на самім востраве, у Злучаных Штатах і ААН. У 2000 годзе па распараджэнні прэзідэнта Біла Клінтана была створана спецыяльная камісія па статусе Пуэрта-Рыка (англ. President's Task Force on Puerto Rico's Status). У сваім дакладзе камісія пацвердзіла бягучы статус і рэкамендавала даць грамадзянам вострава права на самавызначэнне. Мяркуецца, што ў рамках гэтай працэдуры пуэртарыканцы выберуць адзін з трох варыянтаў: замацаванне бягучага статусу, уваходжанне ў ЗША на правах штата або атрыманне незалежнасці. Адпаведны законапраект вынесены на разгляд Кангрэса.

У 2004 годзе ўлады Злучаных Штатаў адмянілі падатковую льготу для прадпрыемстваў, якія інвесціруюць у Пуэрта-Рыка, што прывяло да рэзкага скарачэння працоўных ставак і пачатку 10-гадовага эканамічнага крызісу. 45% насельніцтва тэрыторыі знаходзіцца ніжэй за ўзровень беднасці, 450 тысяч жыхароў з'ехалі ў ЗША. Толькі летась востраў пакінулі ў пошуках працы і лепшага жыцця 62 тысячы чалавек. Беспрацоўе на востраве ўшчыльную наблізілася да 12 працэнтаў. Эканоміка практычна не выходзіць з рэцэсіі з 2006-га. Не дзіўна, што праз усё гэта ў палітычнага жыцця тэрыторыі «гарачка».



Губернатар Рыкарда Расэла абяцае правесці ў чэрвені рэферэндум аб статусе вострава. Згодна з сакавіцкім апытаннем грамадскай думкі 57% падтрымліваюць гэтую ініцыятыву, але праціўнікі плебісцыту хочуць байкатаваць галасаванне. Аднак якім бы ні быў вынік рэферэндуму, яго наўрад ці ўхваліць Кангрэс ЗША. Традыцыйна лічыцца, што Пуэрта-Рыка выгадна захоўваць свой цяперашні статус, бо ён дазваляе атрымліваць выгаду ад «двух светаў»: пуэртарыканцы выкарыстоўваюць долар, маюць амерыканскія пашпарты і могуць праводзіць адносна незалежную ад Вашынгтона палітыку. Праўда, апошні аргумент ужо не адпавядае рэчаіснасці пасля стварэння фінансавага наглядняга камітэта.

Фіскальны крызіс зацягнуўся і негатыўна ўплывае як на эканоміку Пуэрта-Рыка, так і на палітычнае жыццё вострава. Банкруцтва стала магчымым дзякуючы прынятаму летась федэральнаму закону. Да гэтага юрыдычны статус вострава як «неінкарпараванай арганізаванай тэрыторыі» не дазваляў пазбягаць выплаты даўгоў. Калі б Пуэрта-Рыка было незалежнай дзяржавай, то яго прадпрыемствы камунальнай гаспадаркі маглі б аб'явіць банкруцтва. Новы закон патрабуе стварэння фінансавага наглядняга камітэта, сфарміраванага Вашынгтонам, галоўная мэта якога — дасягненне пагаднення з трымальнікамі аблігацый. Але ён таксама дазваляе праводзіць працэдуру банкруцтва ў выпадку правалу перагавораў. Большасць у дзве трэці галасоў прымусіла б усіх трымальнікаў аблігацый прыняць зніжэнне кошту доўгу. Але такое пагадненне заўсёды было малаімаверным. Адметны факт: з сярэдзіны сакавіка выканаўчым дырэктарам Савета фінансавага кантролю і кіравання Пуэрта-Рыка была прызначана экс-міністр фінансаў Украіны Наталля Ярэська.

### МАРАФОН НА 4 ГАДЫ

Знешні доўг Пуэрта-Рыка перавысіў аб'ём валавога нацыянальнага прадукту. Таксама ў бюджэце ўтварылася «дзірка» ў памеры $50 млрд, якія планавалася выдаткаваць на фінансавыя абавязацельствы перад пенсіянерамі. Такім чынам, атрымліваецца насамрэч непад'ёмная сума — $124 млрд. Урад вострава просіць федэральны суд ЗША прымусіць крэдытораў прыняць на сябе нейкую частку доўгу. Паколькі афіцыйна Пуэрта-Рыка не ўваходзіць у склад ЗША і з'яўляецца толькі асацыяванай дзяржавай, працэдура банкруцтва крыху адрозніваецца ад прынятай у Амерыцы і называецца PROMESA (Puerto Rico Oversight, Management and Economic Stability Act). Гэты фармат быў спецыяльна зацверджаны Кангрэсам ЗША летам мінулага года для таго, каб дапамагчы вostраву пазбавіцца ад праблем у эканоміцы. «Мы прынялі гэтае рашэнне, — цытуе Bloomberg губернатара Расэла, — таму што яно лепш за ўсё абараняе інтарэсы народа Пуэрта-Рыка».

Працэдура банкруцтва вострава не толькі складаная, але і балючая для яго жыхароў, якія са словамі губернатара могуць не пагадзіцца. Пуэртарыканцы разумеюць, што іх чакаюць яшчэ больш цяжкія часы, чым былі дагэтуль. Дзяржслужачым прыйдзецца змірыцца са зніжэннем пенсій як мінімум на 10 працэнтаў. Многія інфраструктурныя праекты закрыюць з прычыны спынення фінансавання. Напэўна, актывізуецца ад'езд пуэртарыканцаў на мацярык. Не дзіўна, што ў пачатку мая па вуліцах фінансавага раёна Сан-Хуана прайшлі тысячы астраўлян, якія пратэставалі супраць магчымага скарачэння дзяржаўных выдаткаў на сацыяльныя патрэбы, ахову здароўя, адукацыю.

Рашэнне звярнуцца ў суд было прынята губернатарам Пуэрта-Рыка Рыкарда Расэла, які заняў гэты пост у студзені 2017 года, пасля таго як яму, гэтак жа, як і яго папярэдніку, не ўдалося дамовіцца з галоўнымі крэдыторамі. Пераважная большасць з іх адмовіліся ад прапанаванага Сан-Хуанам плана рэструктурызацыі, які мае на ўвазе выплату на працягу наступных дзесяці гадоў прыкладна чвэрці даўгоў. Галоўнымі крэдыторамі вострава з'яўляюцца хедж-фонды. Такім буйным фондам, як Aurelius Capital Management, Monarch Alternative Capital і Whitebox Advisors, належыць прыкладна трэць доўгу Пуэрта-Рыка.

У Сан Хуане лічаць, што справа зацягнецца на чатыры гады. «Я бачу гэтую працэдуру як марафон, — растлумачыў газеце Washington Post спецыяліст па банкруцтвах з юрыдычнай фірмы Katten Muchin Rosenman Крэйг Барбарош.— Пачалася першая міля. На дыстанцыі шмат што можа здарыцца і, напэўна, здарыцца». Вярхоўны суд ЗША прызначыць суддзю, які будзе займацца гэтым гучным банкруцтвам, першым у гісторыі краіны сярод штатаў і тэрыторый, што ўваходзяць у яе склад.

### ВЯРТАННЕ БАРЫНКЕНА

Самы апошні фіскальны план урада, ухвалены наглядным камітэтам у сакавіку, уключае абавязковае балансаванне бюджэту ў наступныя тры гады. Для дасягнення гэтай мэты спатрэбіцца скарачэнне выдаткаў прыкладна на 10% ВНП да 2020-га. Апошняе пагадненне па федэральным бюджэце дае трохі дадатковага часу і дазваляе атрымаць грошы для праграмы Medicaid, якая забяспечвае медыцынскае страхаванне маламаёмных грамадзян, а ў Пуэрта-Рыка да іх адносіцца прыкладна палова насельніцтва. Гэтыя грошы не змаглі прадухіліць правядзенне 1 мая масавай дэманстрацыі супраць жорсткіх мер эканоміі.

Да снежня 2017 года скончыцца дадатковае фінансаванне на ахову здароўя Пуэрта-Рыка ў памеры $6,4 мільярда, і налета дзяржава сутыкнецца з недахопам фінансавання медыцынскіх праграм у памеры $850 млн. Планы жорсткай бюджэтнай эканоміі прывялі да абвяшчэння забастоўкі прафсаюзных арганізацый. Дзясяткі тысяч студэнтаў найбуйнейшага ўніверсітэта Пуэрта-Рыка абвясцілі страйк яшчэ на пачатку сакавіка. З-за эканамічнага крызісу закрыюць амаль 200 школ. Па даных дэпартамента адукацыі, каля 27 тысяч навучэнцаў будуць пераведзены ў іншыя навучальныя ўстановы да канца мая. Плануецца таксама згортванне праграм бясплатнага медыцынскага забеспячэння, скарачэнне дапамог і льгот.

Рэспубліканцы ў Кангрэсе асцерагаюцца, што крызіс у Пуэрта-Рыка абернецца для ЗША такімі ж вялікімі праблемамі, як і збанкрутаваны Дэтройт. Фінансавая падтрымка вострава на працягу наступнай чвэрці стагоддзя можа перавысіць чвэрць трыльёна долараў. Гэтыя грошы будуць узяты з кішэні амерыканскіх падаткаплацельшчыкаў. Жыхары Пуэрта-Рыка, нагадаем, маюць такія ж правы, што і грамадзяне ЗША, за выключэннем магчымасці галасавання на прэзідэнцкіх выбарах ці выбарах у Кангрэс. Сотні тысяч пуэртарыканцаў спраўна атрымліваюць сацыяльную дапамогу. Пры гэтым у эканамічным плане востраў з'яўляецца стратным. Ён не можа выжыць нават за кошт мільёнаў турыстаў.

Апошнія два гады мясцовыя ўлады, якія да гэтага бралі крэдыты і пазычалі грошы ў інвестараў, спрабавалі выпрасіць дапамогу ў Вашынгтоне. У сталіцы да такіх просьбаў паставіліся холадна. Заканадаўцы патрабавалі даць справаздачу за выдаткаваныя незразумела на што федэральныя грошы, якія рэгулярна выдзяляюцца, напрыклад, на ахову здароўя. Не дзіўна, што астраўляне бачаць у ЗША не ратавальніка і памочніка, а каланізатара. Масла ў агонь незадаволенасці федэральным цэнтрам падліў прэзідэнт Трамп: ён заявіў, як водзіцца ў «Твітары», што ніякай асаблівай праграмы дапамогі Пуэрта-Рыка не будзе.

Лідар руху «Суверэнная дзяржава Барынкен», які набірае сілу ў Пуэрта-Рыка, Рамон Ненадзіч расказаў, што Карыбскія астравы нарэшце павінны перастаць быць «аб'ектам эксплуатацыі» для ЗША. «Барынкен — спрадвечнае імя нашай зямлі, нашага вострава. Назву Пуэрта-Рыка ў свой час нам далі іспанцы, і так нас ведаюць ва ўсім свеце», — заўважыў Ненадзіч. Паводле яго слоў, «Пуэрта-Рыка пакутуе ад каланіяльнага прыгнёту. Вось вам толькі адзін прыклад. Мы скаваныя так званым лодкавым законам, паводле якога ЗША нас абавязваюць здзяйсняць марскую перавозку любых тавараў толькі з дапамогай амерыканскага гандлёвага флоту. А гэта самы дарагі гандлёвы флот у свеце. Гэта заканадаўчае абмежаванне дзейнічае з 1917 года. І з таго часу і па сённяшні дзень мы былі вымушаныя заплаціць ЗША ўжо больш за 75 млрд долараў за выкарыстанне амерыканскіх караблёў. Варта развіваць свой уласны флот — мы ж востраў. Або выкарыстоўваць для перавозкі тавараў значна больш танныя судны — з Панамы, Венесуэлы, Паўднёвай Карэі. Яшчэ прыклад. Наш рынак фактычна «ў палоне» ў манапалістаў са Злучаных Штатаў. 80% тавараў, якія прыходзяць у нашу краіну, — з ЗША: прадукты, абутак, машыны і аўтазапчасткі, бензін — можна пералічваць бясконца. Амерыканскія кампаніі зарабляюць тут больш за 35 млрд долараў штогод. І гэтыя грошы ніяк не вяртаюцца ў нашу эканоміку. Мясцовыя вытворцы і рэтэйлеры не ў стане канкурыраваць з амерыканскімі гігантамі, іх проста задушаць. Так, восем гадоў таму ў Пуэрта-Рыка прыйшла найбуйнейшая сетка супермаркетаў ЗША і «вычысціла» велізарную колькасць нашых магазінаў». Ненадзіч заявіў, што «шукае падтрымкі расійскага ўрада. Калі мы даможамся незалежнасці, нам дапамогуць тыя дзяржавы, якія прызнаюць Барынкен на міжнароднай арэне». Так што будучыня вострава не такая ўжо адназначная.

**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*




## ИЗВЕЩЕНИЕ

**о проведении аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| | |
|---|---|
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **19 июня 2017 г.** в 11.00 Минская обл., Мядельский р-н, аг. Сватки, ул. Заречная, д. 2, каб. 1, Сватковский сельский исполнительный комитет |
| **Место, дата и время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов** | аг. Сватки, ул. Заречная, д. 2, каб. 1, Сватковский сельский исполнительный комитет, тел.: (8-01797) 38-3-36, 38-5-82, тел./факс (8-1797) 38-3-35<br>С момента опубликования извещения до 16.00 15 июня 2017 г.<br>В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.<br>Документы: заявление на участие в аукционе, копия платежного документа, заверенная банком о внесении задатка, паспорт или иной документ, удостоверяющий личность или доверенность (удостоверенная нотариусом) представителя физического лица |
| **Порядок осмотра земельных участков на местности** | В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| **Условия проведения аукциона** | Наличие не менее двух участников |
| **Продавец** | Сватковский сельский исполнительный комитет |
| **Организатор аукциона** | Сватковский сельский исполнительный комитет: **аг. Сватки, ул. Заречная, д. 2, каб. 1, тел. (8-01797) 38-3-36, тел./факс (8-1797) 38-3-35** |
| **Размер задатка и документы, представляемые для участия в аукционе** | Размер задатка: 10% от начальной цены.<br>Документы: заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ удостоверяющий личность, для юридического лица – копия свидетельства о государственной регистрации.<br>Реквизиты: р/с 3600623101900 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНН 600097357, код платежа 04901 |

| ЛОТ | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в д. Навры, площадью 0,2500 га (кадастровый номер 624084006101000053).<br>**Начальная цена 8000,00 (восемь тысяч) белорусских рублей 00 копеек.**<br>Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены |

| | |
|---|---|
| **Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона** | В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке); возместить затраты, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации;<br>в течение двух месяцев после проведения аукциона осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в Мядельском бюро Молодечненского филиала республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>в установленном порядке получить разрешение на строительство жилого дома;<br>приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка);<br>произвести снятие плодородного слоя грунта и использовать его для нужд, связанных со строительством объекта;<br>соблюдать режим хозяйственной деятельности в водоохранной зоне |
| **Ограничения в использовании земельного участка** | Ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной зоне реки Узлянка на площади 0,2500 га |
| **Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений** | Отсутствует |
| **Информация о затратах на организацию и проведение аукциона** | Всего 2384,30 бел. руб., в том числе:<br>формирование земельного участка – 1317,00 бел. руб.;<br>оформление градостроительного паспорта – 715,10 бел. руб.;<br>государственная регистрация земельного участка – 63,00 бел. руб.;<br>стоимость извещения о проведении аукциона – 289,20 бел. руб. |

## ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении **20 июня 2017 г.** аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в Мухавецком сельском Совете Брестского района

| № п/п | Адрес земельного участка | Площадь, га | Начальная (стартовая) цена земельного участка | Целевое назначение земельного участка и его кадастровый номер |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **д. Подлесье-Радваническое ул. Лесная, 14«А»** | 0,1492 | 7 000 | Строительство и обслуживание одноквартирного (блокированного) жилого дома; кадастровый номер 121833066010000214 |
| | Задаток в сумме, руб. | | 700 | |
| | **Затраты:**<br>за изготовление земельно-кадастровой документации с установлением границ земельного участка | | 680,51 | |
| | за государственную регистрацию земельного участка | | 69,0 | |
| | за оформление градостроительного паспорта земельного участка | | 168,10 | |
| | расходы на объявление о проведении аукциона в средствах массовой информации, руб. | | по акту выполненных работ | |

Земельный участок расположен на расстоянии до 15 км от г. Бреста в д. Подлесье-Радваничское, ул. Лесная, 14«А» Мухавецкого сельского Совета. Подъезд к участку осуществляется по существующей дорожной сети с гравийным покрытием. Построена линия электропередачи. Участок свободен от застройки.
Аукцион будет проводиться **20.06.2017 г. в 10.00** по адресу: Брестский район, аг. Мухавец, ул. 60 лет Октября, 21 (здание сельисполкома). Для проведения аукциона необходимо наличие не менее 2 участников.
Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии, копию платежного поручения, подтверждающего внесение залога в размере 10% от начальной цены земельного участка на расчетный счет Мухавецкого сельисполкома №3641000000259 в филиале 100 БОУ «АСБ Беларусбанк» код 246, УНП 200087296, код платежа 04901; документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.
Если аукцион признан несостоявшимся из-за того, что заявление на участие в нем подано только одним гражданином, земельный участок предоставляется этому гражданину при его согласии с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
**Победитель аукциона обязан:**
подписать протокол аукциона в день проведения аукциона;
в течение 10 дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить затраты по организации и проведению аукциона.
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: **аг. Мухавец, ул. 60 лет Октября, 21**, (здание сельисполкома) **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням**. **Последний срок подачи заявлений – 14 июня 2017 года до 17.00**

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. №431/С-30199 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – кулинария), общей площадью 27,5 кв. м, расположенное по адресу: Кореличский р-н, г.п. Мир, пл. 17 Сентября, 15 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 423385790601001187, площадью 0,0061 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (Кулинария)) по адресу: Кореличский р-н, г.п. Мир, пл. 17 Сентября, 15. |
| **Начальная цена продажи** | 13 991,50 р. (тринадцать тысяч девятьсот девяносто один рубль пятьдесят копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 1 399 р. (одна тысяча триста девяносто девять рублей) |
| **Продавец** | Кореличский филиал Гродноооблпотребобщества, 231430, г. п. Кореличи, ул. 8 Марта, 28, тел. 8-01596-2-14-84 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 16 июня 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 15.07.2016 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг), с 8.30 до 16.30 (пятница).**
**Последний день приема заявлений – 13 июня 2017 г. до 15.00**
**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
*http://grodnoino.by/*

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ**

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта** | Право заключения договора аренды сроком 3 года капитального строения, инв. №400/С-92074 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание административно-хозяйственное), арендуемой площадью 92,6 кв. м по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 6А |
| **Начальная цена продажи** | 351,88 р. (триста пятьдесят один рубль восемьдесят восемь копеек) с учетом НДС |
| **Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды** | 1,0 |
| **Сумма задатка** | 35 р. (тридцать пять рублей) |
| **Условия аукциона** | Целевое назначение арендуемых помещений – для размещения склада, производственного помещения, офиса |
| **Продавец** | УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичская дистанция гражданских сооружений, 225407, г. Барановичи, ул. Вильчковского, 5, тел. 8-0163-42-25-08 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора аренды** | Не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/сч для перечисления задатка** | 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 22 июня 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
- *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
- *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
- физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**
**Последний день приема заявлений – 19 июня 2017 г. до 15.00**
**Телефон для справок 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
*http://grodnoino.by/*

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск №19 (366)

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню
Напачатку было Слова

# СКАРЫНА — ЧАЛАВЕК ДАСКАНАЛЫ

## Вобраз першадрукара, намаляваны студэнтамі

**Час постмадэрну скінуў помнікі і ідалы з п'едэстала. У сучасным мастацтве, літаратуры, культуры ўвогуле кожны мае права на самавыяўленне і можа сказаць сваё слова ў той манеры, у якой яму зручней. Гэта кепска? Думаю, зусім не. Разам з разбурэннем пантэонаў да творцаў прыйшло разуменне блізкасці і чалавечнасці тых, хто раней лічыўся толькі бронзавай фігурай. Думаецца, менавіта гэтую ідэю яшчэ раз засведчыла Міжнародная выстаўка сучаснай візуальнай творчасці студэнтаў «Грані творчасці», што адкрылася ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі. Яна прысвечана 500-годдзю беларускага кнігадрукавання і мае сваім дэвізам словы «Францыск Скарына. Чалавек дасканалы». У якасці арганізатараў праекта выступілі Міністэрства адукацыі, Нацыянальная бібліятэка і Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Намаляваць партрэт першадрукара літарамі ў сучаснай тэхніцы лэтэрынгу — лёгка. Паэксперыментаваць з буквіцай — калі ласка. Дастаць з паліцы самую старую кнігу і ўпісаць яе ў сучасны кантэкст — з задавальненнем. Знайсці ў сучаснасці повязь з мінулым і па-мастацку яе абыграць — што можа быць прасцей. Здаецца, студэнты, чые работы прадстаўлены на экспазіцыі, сапраўды натхніліся вобразам першадрукара і яго спадчынай, таму і водгукі, што прагучалі падчас адкрыцця выстаўкі, былі ў большасці станоўчымі. Так, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры і навуцы Таццяна ЯКУБОВІЧ зазначыла:

— Пяць стагоддзяў таму наш асветнік Францыск Скарына сваімі справамі на ўсю Еўропу заявіў, што ёсць такі народ — беларусы. І наша задача развіваць, захоўваць спадчыну. На гэтай выстаўцы прадстаўлены работы студэнтаў 32 ВНУ краіны. Адметна, што не ўсе з іх навучаюцца па спецыяльнасцях, звязаных з мастацкай творчасцю і дызайнам, але змаглі праявіць крэатыўнасць.

А вось намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі, кандыдат культуралогіі Алесь СУША разважаў так:

— Я бачу сапраўдную культурную рэвалюцыю, якая адбываецца сёння ў стаўленні да нашай спадчыны і нашых найважнейшых персон. Быў перыяд, калі мы ўзвялі высокія помнікі выдатным дзеячам; быў час, калі былі напісаныя грунтоўныя манаграфіі, прысвечаныя ім; быў час, калі творчасць апявалася ў высокай паэзіі. Але сёння ўсё змяняецца, і мы маем справу з новым пераасэнсаваем мінуўшчыны, спробамі звязаць сябе са спадчынай, традыцыямі, перастварыць і пераадкрыць іх для сябе, паказаць, што ў іх ёсць патэнцыял для развіцця. Сённяшняя выстаўка — найлепшы доказ гэтаму.

У Нацыянальнай бібліятэцы выстаўка «Грані творчасці» гасцюе да 10 жніўня, затым яна выправіцца ў вандроўку па краіне. Абяцаюць, што экспазіцыя на некаторы час прыпыніцца ў кожнай вобласці Беларусі.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Начное жыццё

# Цёмныя залы пастаянных экспазіцый

## Пара святкаваць Сусветны дзень музеяў

**Такія часы: мастацтва адзначаецца прыкметнымі рухамі ў бок вуліцы, вольных прастораў, звычайнага чалавека. Тэндэнцыя на скарачэнне разрыву паміж «акадэмічнай» культурай і далёкім ад высокіх матэрый простым спажыўцом знаходзіць шляхі для самарэалізацыі і адпаведна новыя формы ўвасаблення. Беларуская прастора тут далёка не навічок, бо «Сцвярджальнікі новага мастацтва» (УНОВИС) у Віцебску распачыналі гэты рух яшчэ стагоддзе таму. Пэўныя падзеі адкінулі нас ад аздаблення паўсядзённасці мастацтвам і прымусілі рэфлексаваць на катастрофы. І вось, нарэшце, краіна вяртаецца да свайго натуральнага, павольна ўцягваецца ў сусветную плынь, расслабляецца, размывае межы, мастацтва цяпер — не элітарная недасягальная, а даступная кожнаму рэч. І сённяшняя Ноч музеяў, да якой варта прычыніцца, — адзін з найярчэйшых гэтаму доказаў.**

Дзіўна, музейная прастора можа выкарыстоўвацца як метафара акадэмічнага, высакароднага, першагатунковага і ў гэты ж час можа стаць пляцоўкай гучнай начной тусоўкі. Можна прыйсці ў навіслую цішыню, калі паміж заламі мерна праходжваецца пара стомленых візіцёраў, а можна трапіць у гушчу падзей — амаль у карнавал з музыкамі, танцорамі, касцюміраваным шоу. Праўда, сёння кожны прапануе нешта сваё, адметнае і не абавязкова карнавальнае — музеі сталіцы, абласных і маленькіх гарадоў імкнуцца падтрымаць сусветную акцыю «Ноч музеяў».

**Можна прыйсці ў навіслую цішыню, калі паміж заламі мерна праходжваецца пара стомленых візіцёраў, а можна трапіць у гушчу падзей — амаль у карнавал з музыкамі, танцорамі, касцюміраваным шоу.**

Першая адбылася ў Берліне ў 1997 годзе, сёлета Беларусь становіцца ўдзельнікам акцыі ўжо трынаццаты раз. Некаторыя ўстановы, напрыклад Мірскі замак, прапанавалі свае праграмы непасрэдна ў Міжнародны дзень музеяў, то-бок 18 мая, асноўная ж маса перанесла святкаванне на выхадныя, значыць, на сёння. І яшчэ: назва акцыі гучыць прыгожа, але правесці ў музеях цэлую ноч наўрад ці атрымаецца, калі толькі вы не застанецеся тут да раніцы выпадкова. Большасць мяркуе скончыць свята ўжо ў адзінаццаць ці дванаццаць гадзін ночы, тады можна перанакіравацца ў іншае месца, якое плануе сваю праграму даўжэйшай.

Самі музеі па традыцыі прапануюць наведвальнікам шмат гульняў, квэстаў, танцаў, фільмаў, канцэртаў, майстар-класаў. Як звычайна, арганізатары складаюць цэлыя канцэпцыі ці абапіраюцца на культурныя здабыткі мінулага, як, напрыклад, Нацыянальны мастацкі музей, які прыгадаў Хуліа Картасара з яго творам «Гульня ў класікі». Асаблівасць рамана ў тым, што яго часткі можна чытаць у любой паслядоўнасці, так і музей падрыхтаваў для наведвальнікаў тры шляхі. Можна паглядзець пастаянную экспазіцыю і выстаўкі, што праходзяць зараз у Нацыянальным мастацкім (а гэта значыць, убачыць беларускае мастацтва XII—XX стагоддзяў, Рускае мастацтва XVIII — пачатку XX, мастацтва Еўропы XVI—XX, мастацтва краін Усходу XIV—XX, выстаўку гравюр Рэмбранта і іншае). Можна сканцэнтравацца на адмысловых мерапрыемствах Ночы музеяў і атрымаць магчымасць рабіць рэчы, якія, магчыма, не давядзецца паўтарыць ніколі ў жыцці, напрыклад, паглядзець экспазіцыю ў цёмных залах з дапамогай толькі ліхтара. Трэцім магчымым варыянтам будзе сумяшчэнне гэтых двух шляхоў.

**Што датычыцца корпуса НЦСМ, што на праспекце Незалежнасці, то ён у Ноч музеяў стане кінапляцоўкай, дзе два кінафестывалі — Cinema Perpetuum Mobile і Vagrant Film Fest — пакажуць свае праграмы.**

Праграма Нацыянальнага цэнтра сучаснага мастацтва звяртаецца да вулічнага мастацтва, якое засвойвае музейную прастору, — тут пройдзе конкурс скетчаў ад вулічных мастакоў, шэраг перформансаў (а гэта, напэўна, адна з самых прыцягальных для абываценя формаў мастацтва), майстар-клас па стварэнні арт-работ са смецця, інсталяцыя нямецкага мастака Мануэля Шрэдэра, DJ-сэты і іншае. Што датычыцца корпуса НЦСМ, што на праспекце Незалежнасці, то ён у Ноч музеяў стане кінапляцоўкай, дзе два кінафестывалі — Cinema Perpetuum Mobile і Vagrant Film Fest — пакажуць свае праграмы.

Не менш цікавую кінапраграму прапануе Музей гісторыі беларускага кіно — айчынныя кароткаметражныя фільмы ў падборцы «DIY. Архіў за 10 гадоў». Тут жа адбудзецца конкурс-дэфіле на адпаведную тэматыку і шэраг лекцый.

Да Ночы музеяў далучаюцца таксама музей «Краіна міні», Музей займальных навук «Квантум», Музей Якуба Коласа, Літаратурны музей Максіма Багдановіча, музей марожанага «Белы полюс», Лошыцкая сядзіба, Лінія Сталіна — карацей, у гэтую ноч для наведвальніка сапраўды адчыненыя дзверы на любы густ.

Дарэчы, калі ўжо пайшоў «замут» на сучасныя праявы мастацтва, якое выходзіць на вуліцы, то працягнуць ноч культурна можна завітаўшы на Кастрычніцкую вуліцу з яе грандыёзнымі графіці ці на плошчу Якуба Коласа, дзе цяпер выстаўляецца трыццаць пяць сучасных мастакоў з калекцыі Нацыянальнага цэнтра сучаснага мастацтва. Карацей, гуляць можна «ўсю ноч да раніцы».

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

■ Міжнародны кантэкст



**Наталля ШАРАНГОВІЧ:**

# «Мы ўліліся ў мэйнстрым, і наша мастацтва стала адкрытым»

## Венецыянскае біенале і Нацыянальны павільён Беларусі распачалі сваю работу для наведвальнікаў

**На 57-е Венецыянскае біенале, што адкрылася 13 мая ў знакамітых садах Джардзіні, Арсенале і па-за іх межамі, Беларусь прывезла «Стол». Чацвёрты раз мы прадставілі на самым знакамітым і прэстыжным форуме сучаснага мастацтва Нацыянальны павільён і гэтым разам яго ўвасобіў праект Рамана Заслонава ў жанры відэаарта. Мастак стварыў канцэпцыю і прамалёўваў эпізоды, Сяргей Талыбаў стаў рэжысёрам фільма, а Віктар Лабковіч — прадзюсарам праекта. «Стол» быў абраны спецыяльнай камісіяй з васямнаццаці варыянтаў, і з гэтага ўсё закруцілася — пошук пляцоўкі, сотні працэдур падрыхтоўкі да выставы, рэклама, аздабленне павільёна, уласна адкрыццё. Куратар павільёна і дырэктар Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Наталля Шаранговіч ужо вярнулася з Венецыі і ў першую чаргу мы ў яе запыталіся ўласна аб уражаннях, у тым ліку ад выставы найвядомейшага сучаснага мастака Дэм'ена Хёрста.**

— Выстава Дэм'ена Хёрста не з'яўляецца часткай Венецыянскага біенале, але аўтар рыхтаваў свой праект спецыяльна на час яго правядзення і зразумела чаму: за сем месяцаў работы біенале па венецыянскіх арт-маршрутах праходзіць велізарная колькасць людзей (так званы арт-турызм). Дырэкцыя выставы рыхтуе бясплатныя каталогі і карты, з якімі лягчэй арыентавацца і знаходзіць нацыянальныя павільёны, бо шмат краін выстаўляецца па-за межамі садоў Джардзіні. Здымаць памяшканні — нармальная практыка, якая стала асабліва распаўсюджанай са з'яўленнем новых удзельнікаў. Напрыклад, былы павільён Савецкага Саюза ў садах Джардзіні стаў павільёнам Расіі, а Украіна, Азербайджан, Арменія, Беларусь штогод шукаюць пляцоўкі.

Маё галоўнае ўражанне ад сёлетняга біенале звязана з разнастайнасцю поглядаў і трактовак дэвізу («Няхай жыве жывое мастацтва»), якое аказалася, відаць, найбуйнейшым за ўсе часы, што я сюды прыязджаю. Сёлета тут можна ўбачыць вострасацыяльныя рэчы, як, напрыклад, ва ўладальніку Залатога льва павільёне Германіі, які быўператвораны ў своеасаблівы акварыум з двайным дном, шклянымі сценамі і падлогай. Прадстаўленне «Фауст» доўжыцца каля пяці гадзін: пад тваімі нагамі з'яўляюцца людзі ў цёмным адзенні і скураных накаленніках, якія не маюць магчымасці ўстаць у поўны рост і выбрацца на вуліцу — дарогу ім перагароджваюць ахоўнікі і сабакі. У павільёне, які ў 1933 годзе адкрываў Гітлер, створана замкнёная прастора, квінтэсэнцыя несвабоды чалавека, такі імправізаваны канцлагер. Фінскі павільён паказаў гратэскную відэаінсталяцыю, дзе спалучаюцца сатыра на сучасныя расавыя стэрэатыпы і бюракратыю. Мне асабіста больш за ўсё спадабаўся павільён Японіі, якая кожны раз паказвае абсалютна фантастычныя рэчы. Гэтым разам аўтары адлюстравалі, што адбылося з краінай пасля трагедыі ў Фукусіме, але вельмі нечакана: кіруючыся знакамі ты ідзеш не ў парадныя дзверы, а накіроўваешся да лесвіцы, стаіш у чарзе, падымаешся і глядзіш на павільён знізу, праз дзірку ў падлозе. Ты высоўваеш галаву — вакол цябе велізарная колькасць раскіданых тканін і першае ўражанне, нібыта ты знаходзішся ў эпіцэнтры катастрофы, але калі яно праходзіць, ты разумееш, што высунуў галаву з даху павільёна і іншыя наведвальнікі бачаць твой здзіўлены твар. Потым ты заходзіш у павільён з іншага ўвахода і апынаешся сярод тых, хто бачыць гэтыя высунутыя галовы. З аднаго боку, ты ў эпіцэнтры інсталяцыі з яе сэнсам, з другога, атрымліваецца вельмі цікавая гульня, нязмушаны перформанс.



Гледзячы на праекты, што паказваюцца на Венецыянскім біенале ў апошнія гады, можна сказаць, што сучаснае мастацтва патрабуе высокіх тэхналогій, яно існуе на стыку з навукай, адыходзячы ад традыцыйных жанраў мастацтва. Другая асаблівасць, якая выяўляецца на біенале, у тым, што сучаснае мастацтва ідзе ад жадання ўражваць — велізарнасцю, колерам, тэхналогіямі (сёлета некаторыя ўдзельнікі нават разбіралі дахі сваіх павільёнаў, каб умясціць інсталяцыі). Наш павільён не выключэнне, бо мы таксама выкарыстоўваем тэхналогіі, а маляўнічасць і яркасць выдатна зробленага відэаарта Рамана Заслонава спыняе на сабе погляд.

***— У нейкай размове вы сказалі, што гэты праект «вельмі беларускі». Што вы мелі на ўвазе?***

— Фільм уяўляе сабой набор вялікай колькасці міні-сцэн, якія адбываюцца за адным вялікім сталом. Камера нібыта рухаецца ўздоўж стала, і гэта працягваецца бясконца. Па-першае, Раман Заслонаў запрасіў здымацца вядомых беларускіх акцёраў. Па-другое, мы бачым бытавыя моманты з нашымі, беларускімі, адчуваннем жыцця і менталітэтам, якія ў рэальным жыцці не заўважаем, — як чалавек зранку п'е каву, як сядзіць за сталом з нацюрмортам з прадуктаў, як дыктар чытае прагноз надвор'я, як людзі размаўляюць адно з адным, як перажываюць некаторыя рэчы, як слухаюць радыё. Гэтыя сцэны для нас блізкія, цёплыя і знаёмыя, бо тут нашы атмасфера, жыццё, паўсядзённасць. Раман Заслонаў жыве ў Парыжы, але вельмі часта бывае ў Беларусі, і яму ўдалося заўважыць характэрныя рысы беларускага асяроддзя як бы з боку. Калі глядзіш гэтыя сцэны, з'яўляецца адчуванне, што ты зайшоў у родны дом і зараз ты ў ім жывеш. Да Венецыі фільм быў паказаны замежным крытыкам і мастацтвазнаўцам, каб зразумець, наколькі адлюстраванне беларускага менталітэту цікава замежніку, і аўтары ўпэўніліся, што гэта звяртае ўвагу. Важна, што відэаарт як жанр дазваляе гледачу далучыцца да прагляду ў любы момант: сцэны не звязаны паміж сабой сюжэтам. Бо які б выдатны ні быў праект, наведвальнік падчас біенале звычайна не затрымліваецца ў павільёне больш за дзесяць-пятнаццаць хвілін. Таму было важна знайсці форму, якая б зачапіла ўвагу гледача хай сабе нават на пяць хвілін, і Раману Заслонаву гэта ўдалося. Калі міжнароднае журы прыйшло ў наш павільён, гэта было на маіх вачах, яно зрабіла кароткую, але прыемную адзнаку. Раману як куратару было сказана, што яго праект вельмі эмацыянальны. Журы далёка не заўсёды агучвае каментарыі, а значыць, праект «Стол» іх зачапіў.

***— Беларусь не мае свайго павільёна на Венецыянскім біенале. Што гэта значыць у арганізацыйным плане і якіх высілкаў нам каштуе ўдзел у форуме?***



— Гэта каштуе вялікіх высілкаў пры падрыхтоўцы і вялікіх фінансавых выдаткаў. Удзел у біенале фінансуе Міністэрства культуры, адгукнуўся і «Белэксімгарант» у якасці спонсара. Мінкульт забяспечвае арэнду памяшкання і цэлы цыкл працэдур, неабходных для работы павільёна. Недастаткова проста знайсці пляцоўку: трэба давезці творы да Венецыі і вярнуць іх назад, сем месяцаў даглядаць павільён, адкрываць і закрываць дзверы, сачыць за тэхнікай, прыбіраць памяшканне, забяспечваць рэкламу. Дарэчы, заяўляць Нацыянальны павільён мае права толькі Міністэрства культуры краіны і больш ніхто. Дырэкцыя біенале пасля таго, як краіна заявіла Нацыянальны павільён, дае доступ да картатэкі, дзе сабраны памяшканні, рэкамендаваныя для арэнды. Па просьбе Заслонава мы знайшлі памяшканне ў пяці хвілінах хады ад садоў Джардзіні — мастацкую галерэю ў доме 1640 года пабудовы, які ў свой час маляваў знакаміты італьянскі пейзажыст Каналета. Наш павільён выходзіць на канал, а з другога боку — на сады Джардзіні. Нам трэба было зрабіць знешняе аздабленне, і Раман Заслонаў знайшоў спосаб вылучыцца і адначасова натуральна ўпісацца ў венецыянскае асяроддзе. Справа ў тым, што італьянцы беражліва захоўваюць старажытную напаўразбуранасць, а наш павільён знаходзіцца ў вельмі старым доме, і Раман гэта выкарыстаў. Вокны ў нас закрыты бачнымі здалёк плакатамі з кадрамі з фільма, а на драўляным порціку над уваходам велізарнымі кірылічнымі літарамі стылізавана напісана слова «стол». Калі ідзеш па вуліцы, у першы момант нават не разумееш, як нелацінскае слова з'явілася ў гэтым асяродзі.

***— Праект, што будзе прадстаўляць краіну на Венецыянскім біенале, адбірае спецыяльная камісія. Наколькі яна ўлічвае крытэрый, звязаны са складанай сістэмай тэндэнцый сучаснага мастацтва, каб беларускі павільён не быў аўтсайдарам, а ўліўся ў агульную плынь?***

— Звычайна менавіта гэта і ўлічваецца. Камісія ацэньвае, наколькі сучасны, канцэптуальны падыход у куратара, ці ёсць тут еўрапейская афарбоўка і наколькі праект прачытаецца замежным гледачом (падчас работы камісіі імёны аўтараў зашыфраваны). Улічваецца, наколькі моцная кураторская канцэпцыя, важна, каб праект быў падпарадкаваны адной ідэі і знаходзіўся ў суладдзі з дэвізам выставы. У гэтым сэнсе «Стол» Рамана Заслонава быў абраны амаль аднагалосна, бо камісія ўбачыла ў ім завершаную еўрапейскасць і ў той жа час выразную беларускасць. Сёлета немагчыма было нават адгадаць аўтара, той жа Заслонаў, вядомы даволі традыцыйным жывапісам, нечакана прапанаваў відэаарт.

***— Беларусь прадстаўляе Нацыянальны павільён на Венецыянскім біенале чацвёрты раз, чаму нам важна працягваць удзел у форуме?***

— Нельга абмяжоўвацца сваёй тэрыторыяй. Нам важна звярнуць на сябе ўвагу (прычым напачатку да цябе ставяцца крытычна) і прымусіць выказацца міжнародную крытыку, а ёй цікава параўнанне, якое яна можа зрабіць менавіта на Венецыянскім біенале. Форумаў, дзе краіна можа прадставіць сваё мастацтва, вельмі мала, і звычайна яны ўключаюць праекты, абраныя галоўным куратарам, як на выставе сучаснага мастацтва «Дакумента» ці Стамбульскім біенале. Нацыянальныя павільёны можна арганізаваць толькі ў Венецыі, гэта самы стары і знакаміты форум. Галоўнае, што краіна паказвае сваё мастацтва і атрымлівае магчымасць стаць цікавай на міжнароднай прасторы. Дарэчы, пра беларускае мастацтва пачынаюць пісаць: у мінулыя два гады ў артыкулах вельмі важных выданняў згадваўся беларускі павільён. Гэта значыць, што мы ўліліся ў гэты мэйнстрым і наша мастацтва стала адкрытым.

**Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Вяртанне

# СОНЕЧНЫЯ ФАРБЫ АДКРЫЦЦЯ

## Галоўны літаратурны музей краіны зноў працуе

**Адбылася доўгачаканая падзея: у Дзень музеяў, 18 мая, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры пасля доўгага перапынку адчыніў дзверы для наведвальнікаў. Капітальны рамонт будынка, аднак, не стаўся прычынай поўнай ізаляцыі: увесь час установа ладзіла мерапрыемствы на іншых сваіх пляцоўках, сярод якіх найперш вылучаецца музей Максіма Багдановіча. Гэтаксама працягваўся праект «Літаратурныя падарожжы».**


**Фёдар КІСЯЛЁЎ падчас адкрыцця выстаўкі на фоне сваіх акварэляў, прысвечаных знакавым беларускім мясцінам.**

Насамрэч гэтае адкрыццё сталася нечаканым. Раней дырэктар музея Зміцер Яцкевіч паведамляў СМІ, што яно мусіць адбыцца да 30-годдзя музея, то-бок, сёлета увосень. «Аднак будынак прастойвае, у той час як столькі прасторы гатова да актыўнай выставачнай работы. І мы вырашылі пачаць раней», — тлумачыць Зміцер Лявонцьевіч. «Зараз вяртаецца ў актыўны рэжым каля 90% музейнай прасторы. Што да поўнага вяртання, гэта працэс працаёмкі і доўгі... Між тым можна лічыць, што музей цалкам вярнуўся ў рабочы стан. Нашы супрацоўнікі правялі велізарную работу, чым я вельмі ўсцешаны».

Запатрабаванасць музея пацвярджаецца поспехам яго выставак за мяжой. Спадар Зміцер распавёў, што нядаўна ён вярнуўся з Эстоніі, дзе прайшло адкрыццё выстаўкі, прысвечанай Васілю Быкаву. І для многіх беларусаў Эстоніі, не толькі карэннага насельніцтва, яна сталася навіной, расказвае пра ўсім вядомага аўтара невядомае.

«Часам нават просяць працягнуць тэрмін дзеяння выязной выстаўкі, — кажа Зміцер Яцкевіч. — Бо для людзей, адарваных ад Радзімы, гэта магчымасць вярнуцца дадому, пачуць беларускую мову, убачыць, што яны не адны на гэтым свеце. З той жа нагоды, дарэчы, просяць, каб выстаўкі адкрывалі нашы супрацоўнікі».


Фота Надзеі БУЖАН.

**За гэтым сталом Кандрат Крапіва вырашаў свае складаныя партыі — шахматныя і літаратурныя.**

Падрыхтоўка да адкрыцця супала з падрыхтоўкай да Ночы музеяў. Цяпер наведвальнікаў не проста запрашаюць у свет рэліквій і зашклёных скарбаў: гасцей чакае зала экслібрысаў з магчымасцю самім стварыць памятны адбітак, чакае багатая музычная праграма, а таксама квэст, прымеркаваны да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Ён уключыць заданні па ўсіх адкрытых залах, а гэта — згаданыя ўжо экслібрысы, экспазіцыя па творчасці Кандрата Крапівы, выстаўка «Ад матчынага парога», прысвечаная Рыгору Барадуліну, выстаўка «Залатая раніца», у межах якой прадстаўлены партрэты рэпрэсаваных пісьменнікаў, створаныя навучэнцамі мастацкага каледжа імя Глебава. Яркім акцэнтам сталася і экспазіцыя «Бялее ветразь адзінокі» з фондаў маскоўскага Дзяржаўнага літаратурнага музея, прысвечаная жыццю і творчасці Міхаіла Лермантава.

Азначана мастацтвам і самое вяртанне музея: першая імпрэза ў яго сценах — адкрыццё акварэльнай выстаўкі Фёдара Кісялёва. Назва яе — «У глыбінях зямлі нашых душ карані...» — і ёсць ключ разумення інсталяцыі, у якой спалучаныя мастацтва і літаратура. Фёдар Кісялёў прапануе для агляду работы, напісаныя ў межах «літаратурных» цыклаў: кожная акварэль — мастацкае пераўвасабленне мясцін, што падарылі нам Уладзіміра Караткевіча, Янку Купалу, Васіля Быкава, Адама Міцкевіча. Асабліва блізкія мастаку пісьменнікі роднага Пасожжа: Віктар Карамазаў (дарэчы, удзельнік імпрэзы), Аляксей Пысін і Міхась Стральцоў.

Акрамя літаратурных матываў, гучаць гістарычныя, зноў жа, праз адлюстраванне знакавых для Беларусі мясцін: Навагрудак, Сынкавічы, Варшаўская шаша — сімвал тысяч зламаных лёсаў, беларускага раздарожжа, на якім разгараліся ваенныя віхуры.

Не раз адзначалася, што гэтая імпрэза — тройчы святочная: адкрыццё ўласна музея гісторыі беларускай літаратуры, міжнародны Дзень музейных супрацоўнікаў і прэзентацыя выстаўкі (дарэчы, асобныя работы нідзе раней не выстаўляліся).

«Гэта сапраўды вялікае свята, — выказаўся старшыня Саюза мастакоў Беларусі Рыгор Сітніца. — Калі ёсць у краіны музей — значыць, ёсць нацыя, якая мае скарбы, і іх трэба зберагаць для нашчадкаў. Захаванне скарбаў нацыі ў вечнасці — гэта яднае мастакоў і музеі. Мы працуем, сцвярджаючы свой дар і сплочваючы доўг перад Вышнім. Такімі Ён нас стварыў, і менавіта на гэтай зямлі, і мастак — такі, як Фёдар Кісялёў — не проста робіць прыгожую рэч: ён талентам сваім сцвярджае беларускасць».

Вядома, «дзень нараджэння» не застаўся без падарунка: Фёдар Кісялёў перадаў у дар музею работу «Зіма ў Навагрудку».

**Уладзімір ГОРЫНЬ**

белагропромбанк
традиции будущего

# ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 ЯНВАРЯ 2017 г.

Форма 1

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2016 год | 2015 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 5.1.1 | 136 576 | 138 725 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 5.1.2 | 271 | 256 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 5.1.3 | 308 605 | 247 400 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 5.1.4 | 372 007 | 290 740 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 5.1.5 | 2 930 159 | 1 512 680 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 5.1.6 | 4 982 411 | 6 378 206 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 5.1.7 | 1 109 | 129 |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | | - | - |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 5.1.8 | 30 163 | 27 293 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 5.1.9 | 427 146 | 420 289 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 5.1.10 | 10 078 | 11 462 |
| 14 | Отложенные налоговые активы | 1111 | 5.1.11 | 27 | - |
| 15 | Деловая репутация | | | - | - |
| 16 | Прочие активы | 1112 | 5.1.12 | 184 333 | 176 142 |
| 17 | ИТОГО активы | 11 | 7 | 9 382 885 | 9 203 322 |
| 18 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 19 | Средства Национального банка | 1201 | 5.1.13 | 2 007 | 392 794 |
| 20 | Средства банков | 1202 | 5.1.14 | 1 410 533 | 1 376 020 |
| 21 | Средства клиентов | 1203 | 5.1.15 | 5 743 446 | 5 390 459 |
| 22 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 5.1.16 | 877 460 | 606 723 |
| 23 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 5.1.17 | 1 393 | 230 |
| 24 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | 5.1.18 | 995 | 4 264 |
| 25 | Прочие обязательства | 1207 | 5.1.19 | 51 029 | 75 793 |
| 26 | ВСЕГО обязательства | 120 | 7 | 8 086 863 | 7 846 283 |
| 27 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 28 | Уставный фонд | 1211 | 5.1.20 | 707 966 | 810 359 |
| 29 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 30 | Резервный фонд | 1213 | 5.1.21 | 100 669 | 98 445 |
| 31 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 5.1.22 | 167 635 | 155 593 |
| 32 | Накопленная прибыль | 1215 | 5.1.23 | 315 670 | 281 766 |
| 33 | Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации | | | 1 291 940 | 1 346 163 |
| 34 | Доля неконтролирующих акционеров | | 5.1.24 | 4 082 | 10 876 |
| 35 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 1 296 022 | 1 357 039 |
| 36 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 9 382 885 | 9 203 322 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА 2016 ГОД

Форма 2

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2016 год | 2015 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 5.2.2 | 1 241 823 | 1 161 731 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 5.2.2 | 805 823 | 945 787 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 5.2.2 | 436 000 | 215 944 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 5.2.3 | 141 645 | 119 629 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 5.2.3 | 54 031 | 26 175 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 5.2.3 | 87 614 | 93 454 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 5.2.4 | 56 | 303 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 5.2.5 | 8 467 | (2 250) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 5.2.6 | 23 715 | 57 821 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 5.2.7 | (5 177) | 6 540 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 5.2.8 | 117 496 | 133 471 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 5.2.9 | 95 320 | 153 600 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 5.2.10 | 292 329 | 295 760 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 5.2.11 | 22 622 | 29 509 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 5.2.12 | 213 548 | 66 672 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 5.2.13 | 2 583 | 29 393 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 210 965 | 37 279 |
| 18 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | | - | - |
| 19 | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | | - | - |
| 20 | ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | | | 210 965 | 37 279 |
| 21 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации | | | 210 624 | 36 575 |
| 22 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | | 341 | 704 |
| 23 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 24 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | 5.2.14 | 0,0521 | 0,0100 |
| 25 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | 5.2.15 | - | - |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ СОБСТВЕННОГО КАПИТАЛА ЗА 2016 ГОД

Форма 3

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей собственного капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего собственный капитал, принадлежащий головной организации | доля неконтролирующих акционеров | всего собственный капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2015 г. | 3011 | 680 359 | - | 93 882 | 253 877 | 154 035 | 1 182 153 | 10 214 | 1 192 367 |
| 1.1 | В том числе: результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| 2 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | 130 000 | - | 4 563 | 27 889 | 1 558 | 164 010 | 662 | 164 672 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | X | X | X | 36 575 | 2 029 | 38 604 | 707 | 39 311 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | X | 4 563 | (4 563) | X | - | X | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | 130 000 | - | X | (7 420) | X | 122 580 | X | 122 580 |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 130 000 | - | X | X | X | 130 000 | X | 130 000 |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | X | X | X | (7 420) | X | (7 420) | X | (7 420) |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | X | X | X | X | - | X | - |
| 2.7 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 452 | (452) | - | - | - |
| 2.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | 2 845 | (19) | 2 826 | (45) | 2 781 |
| 2.9 | приобретение дочернего юридического лица | 30127 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| 3 | Остаток на 1 января 2016 г. | 3013 | 810 359 | - | 98 445 | 281 766 | 155 593 | 1 346 163 | 10 876 | 1 357 039 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2016 г. | 3011 | 810 359 | - | 98 445 | 281 766 | 155 593 | 1 346 163 | 10 876 | 1 357 039 |
| 5 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | (102 393) | - | 2 224 | 33 904 | 12 042 | (54 223) | (6 794) | (61 017) |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | X | X | X | 210 624 | 12 625 | 223 249 | 341 | 223 590 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | X | 2 217 | (2 217) | X | - | X | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | (102 393) | - | X | (200 227) | X | (302 620) | X | (302 620) |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | X | X | X | - | X | - |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | X | X | X | (200 227) | X | (200 227) | X | (200 227) |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | (102 393) | X | X | X | X | (102 393) | X | (102 393) |
| 5.7 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 741 | (741) | - | - | - |
| 5.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | 7 | 24 983 | 158 | 25 148 | (7 135) | 18 013 |
| 5.9 | приобретение дочернего юридического лица | 30127 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| 6 | Остаток на 1 января 2017 г. | 3013 | 707 966 | - | 100 669 | 315 670 | 167 635 | 1 291 940 | 4 082 | 1 296 022 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЕ СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ ЗА 2016 ГОД

Приложение к консолидированному отчету об изменении собственного капитала

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2016 год | 2015 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль (убыток) | 301211 | | 210 965 | 37 279 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода | 301212 | | 12 625 | 2 032 |
| 2.1 | В том числе: переоценка основных средств, объектов незавершенного строительства и оборудования к установке | 3012121 | | 21 | 9 |
| 2.2 | переоценка нематериальных активов | 3012122 | | | |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | 12 604 | 2 023 |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | | |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | | |
| 3 | ИТОГО совокупный доход | 30121 | 5.3 | 223 590 | 39 311 |
| 4 | Доля в совокупном доходе, принадлежащая головной организации | | | 223 249 | 38 604 |
| 5 | Доля неконтролирующих акционеров в совокупном доходе | | | 341 | 707 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ЗА 2016 ГОД

Форма 4

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2016 год | 2015 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 1 337 986 | 1 080 577 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (803 958) | (952 892) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 141 452 | 121 691 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (56 271) | (26 722) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | 56 | 303 |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | 72 | (1 631) |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 21 201 | 54 526 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | (4 998) | 5 296 |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 285 442 | 144 175 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (295 631) | (284 218) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (5 559) | (25 064) |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах – итого | 701 | | 619 792 | 116 041 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | 70 079 | 209 507 |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | (2 392) | (213 777) |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | (1 408 713) | (139 919) |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | 1 201 494 | 25 887 |
| 24 | Базовая прибыль на простую акцию | | 19 | 0,0012 | 0,0029 |
| 25 | Разводненная прибыль на простую акцию | | | - | - |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЕ СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ ЗА 2016 г.

Наименование банка ОАО «БНБ-Банк» (в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2016 год | 2015 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль (убыток) | 301211 | 22 | 3 359 | 7 963 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода | 301212 | 21 | 558 | 555 |
| | В том числе: | | | | |
| 2.1 | переоценка основных средств | 3012121 | | 487 | 555 |
| 2.2 | переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования | 3012122 | | - | - |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | 71 | |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| | Доля в совокупном доходе, принадлежащая головной организации | | | 3 917 | 8 518 |
| | Доля неконтролирующих акционеров в совокупном доходе | | | | - |
| 3 | ИТОГО совокупный доход | | | 3 917 | 8 518 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ СОБСТВЕННОГО КАПИТАЛА ЗА 2016 г.

Наименование банка ОАО «БНБ-Банк» (в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей собственного капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего собственный капитал, принадлежащий головной организации | доля неконтролирующих акционеров | всего собственный капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2015 г. | 3011 | 11 074 | - | 4 427 | 15 778 | 8 775 | 40 054 | | 40 054 |
| 1.1 | В том числе: результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - | | | - |
| 2 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | (1) | | 1 941 | 6 054 | 523 | 8 517 | | 8 517 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 7 963 | 555 | 8 518 | | 8 518 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 1 941 | (1 941) | x | - | - | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | - | - | x | - | x | - | - | - |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - | - | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - | - | - |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | (1) | x | x | x | x | (1) | | (1) |
| 2.7 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 32 | (32) | | | - |
| 2.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | - | - | | | - |
| 3 | Остаток на 1 января 2016 г. | 3013 | 11 073 | - | 6 368 | 21 832 | 9 298 | 48 571 | - | 48 571 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2016 г. | 3011 | 11 073 | - | 6 368 | 21 832 | 9 298 | 48 571 | | 48 571 |
| 5 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | 2 | - | 32 | 3 347 | 538 | 3 919 | | 3 919 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 3 359 | 558 | 3 917 | | 3 917 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | | x | | | - | - | | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | - | - | x | - | x | - | | - |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - | | - |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - | | - |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | 2 | x | x | x | x | 2 | | 2 |
| 5.7 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | | - | 32 | (12) | (20) | - | | - |
| 5.8 | прочие изменения | 30126 | | | | | | - | | - |
| 5.9 | Приобретение дочернего юридического лица | | - | - | - | - | - | - | | - |
| 6 | Остаток на 1 января 2017 г. | 3013 | 11 075 | - | 6 400 | 25 179 | 9 836 | 52 490 | | 52 490 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ЗА 2016 г.

Наименование банка ОАО «БНБ-Банк» (в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2016 г. | 2015 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 42 497 | 36 222 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (18 785) | (20 742) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 8 829 | 8 405 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (2 516) | (1 790) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | - | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 8 920 | (1 059) |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | - | 51 |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 3 532 | 3 040 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (16 596) | (12 176) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (699) | (4 155) |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах, итого | 701 | | 25 182 | 7 796 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | 41 213 | 22 248 |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | (2 059) | 1 775 |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | (39 313) | - |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (23 267) | (15 719) |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | 305 | (24) |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | 8 084 | (4 680) |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов, итого | 702 | | (15 037) | 3 600 |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | (6 051) | (3 795) |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | 26 699 | (36 669) |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | (15 024) | 56 917 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | 17 458 | - |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | (34 427) | 13 376 |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | (3 637) | (4 170) |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств, итого | 703 | | (14 982) | 25 659 |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | (4 837) | 37 055 |
| 29 | ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (7 063) | (2 953) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 15 | 7 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | - |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | (372 947) | - |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | 348 177 | - |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | (31 818) | (2 946) |
| 37 | ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | - | - |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | 2 | 1 |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | - | - |
| 42 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | 2 | 1 |
| 43 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | 2 135 | 6 256 |
| 44 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | 31 | (34 518) | 40 367 |
| 45 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | | x | 84 201 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | | 49 683 | x |

Генеральный директор К. Церетели

Главный бухгалтер Н.П. Шнип

Дата подписания 29 апреля 2017 года

EY Совершенствуя бизнес, улучшаем мир

Ernst & Young LLC
Klary tsetkin st., 51A, 15th floor
Minsk, 220004, Republic of Belarus
Tel. +375 (17) 240 4242
Fax +375 (17) 240 4241
www.ey.com/by

ООО «Эрнст энд Янг»
Руспублика Беларусь, 220004, Минск,
ул. Клары Цеткин, 51А, 15-й этаж
Тел. +375 (17) 240 4242
Факс +375 (17) 240 4241

# АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ

**независимой Аудиторской организации ООО «Эрнст энд Янг» по годовой консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «БНБ-Банк», его дочерней организации как банковского холдинга, подготовленной по итогам деятельности за 2016 год**

Г-ну Церетели Константину

Генеральному директору ОАО «БНБ-Банк»

Акционерам, Совету директоров, Аудиторскому комитету и Правлению ОАО «БНБ-Банк»

Национальному банку Республики Беларусь

Мы провели аудит прилагаемой годовой консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности (далее – «консолидированная финансовая отчетность») Открытого акционерного общества «Белорусский народный банк», его дочерней организации как банковского холдинга (далее – «Банк»), состоящей из:
- ► Консолидированного бухгалтерского баланса Банка на 1 января 2017 года (Форма 1);
- ► Консолидированного отчета о прибылях и убытках Банка за 2016 год (Форма 2);
- ► Консолидированного отчета об изменении собственного капитала Банка за 2016 год (Форма 3);
- ► Консолидированного отчета о движении денежных средств Банка за 2016 год (Форма 4);
- ► Примечаний к годовой консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности.

Указанная консолидированная финансовая отчетность была подготовлена руководством Банка в соответствии с Законом Республики Беларусь от 12 июля 2013 г. №57-З «О бухгалтерском учете и отчетности», Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 12 декабря 2013 года №728 «Об утверждении Инструкции об организации ведения бухгалтерского учета и составления бухгалтерской (финансовой) отчетности в Национальном банке Республики Беларусь, банках и небанковских кредитно-финансовых организациях Республики Беларусь», Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года №511 «Об утверждении Инструкции по составлению консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности банковских групп, банковских холдингов», Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 24 января 2007 года №15 «Об установлении форм отчетности для головных организаций банковских групп, банковских холдингов и утверждении Инструкции о порядке осуществления надзора за банковской деятельностью на консолидированной основе», и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки консолидированной финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде (далее «законодательство Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности»).
Согласно критериям, определенным Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года №511 «Об утверждении Инструкции по составлению консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности банковских групп, банковских холдингов», консолидированная финансовая отчетность Банка как банковского холдинга на 1 января 2017 года включает финансовую информацию Открытого акционерного общества «Белорусский народный банк» и его дочерней организации Общества с ограниченной ответственностью «БНБ-Лизинг».

*Обязанности руководства аудируемого лица по подготовке консолидированной финансовой отчетности*
Руководство аудируемого лица несет ответственность за составление и представление консолидированной финансовой отчетности, прилагаемой на 62 листах, в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности и организацию системы внутреннего контроля, необходимой для составления консолидированной финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие недобросовестных действий или ошибок.

*Обязанности Аудиторской организации*
Мы несем ответственность за выраженное нами аудиторское мнение о достоверности консолидированной финансовой отчетности, основанное на результатах проведенного аудита.
Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» от 12 июля 2013 года №56-З и национальных правил аудиторской деятельности, утвержденных Министерством финансов Республики Беларусь. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной консолидированной финансовой отчетности.
В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры, направленные на получение аудиторских доказательств, подтверждающих значения показателей консолидированной финансовой отчетности Банка, а также другую раскрытую в ней информацию. Выбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения консолидированной финансовой отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения консолидированной финансовой отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля Банка, необходимая для составления консолидированной финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы. Аудит также включал оценку применяемой учетной политики, обоснованности учетных оценок и общего содержания консолидированной финансовой отчетности Банка.
Мы полагаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

*Аудиторское мнение*
По нашему мнению, консолидированная финансовая отчетность достоверно, во всех существенных аспектах, отражает финансовое положение Банка по состоянию на 1 января 2017 года, финансовые результаты его деятельности и изменения его финансового положения (движение денежных средств) за год по указанную дату в соответствии с Законом Республики Беларусь от 12 июля 2013 года №57-З «О бухгалтерском учете и отчетности», Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 12 декабря 2013 года №728 «Об утверждении Инструкции об организации ведения бухгалтерского учета и составления бухгалтерской (финансовой) отчетности в Национальном банке Республики Беларусь, банках и небанковских кредитно-финансовых организациях Республики Беларусь», Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года №511 «Об утверждении Инструкции по составлению консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности банковских групп, банковских холдингов», Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 24 января 2007 года №15 «Об установлении форм отчетности для головных организаций банковских групп, банковских холдингов и утверждении Инструкции о порядке осуществления надзора за банковской деятельностью на консолидированной основе» и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки консолидированной финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде.

*Прочие вопросы*
Прилагаемая консолидированная финансовая отчетность не имеет своей целью представление финансового положения и результатов деятельности в соответствии с принципами или методами бухгалтерского учета и подготовки отчетности, общепринятыми в странах, помимо Республики Беларусь. Соответственно, консолидированная финансовая отчетность не предназначена для лиц, не знакомых с принципами, процедурами и методами бухгалтерского учета и подготовки отчетности, принятыми в Республике Беларусь.
Мы проводили аудит соответствия консолидированной финансовой отчетности Банка требованиям Национальных стандартов финансовой отчетности только в части положений, регламентирующих представление и раскрытие информации в консолидированной финансовой отчетности.

Лащенко Павел Анатольевич
Директор ООО «Эрнст энд Янг»

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь №0000738 от 14 мая 2003 года, без ограничения срока действия;

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям и требованиям к деловой репутации, предъявляемым к аудиторам, оказывающим аудиторские услуги в банках, банковских группах и банковских холдингах №8 от 27 октября 2004 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования 21 октября 2014 года).

Станкевич Иван Вячеславович
Директор по аудиту

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь №0002137 от 2 октября 2013 года, без ограничения срока действия;

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям и требованиям к деловой репутации, предъявляемым к аудиторам, оказывающим аудиторские услуги в банках, банковских группах и банковских холдингах №74 от 15 января 2014 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования 28 декабря 2016 года).

Ярмакович Ольга Михайловна
Начальник отдела методологии аудита

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь №0002233 от 10 октября 2014 года, без ограничения срока действия;

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям и требованиям к деловой репутации, предъявляемым к аудиторам, оказывающим аудиторские услуги в банках, банковских группах и банковских холдингах №87 от 26 ноября 2014 года, без ограничения срока действия.

Дата аудиторского заключения: 11 мая 2017 года.

Место выдачи аудиторского заключения: г. Минск, Республика Беларусь.

Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом: 11 мая 2017 года.

Генеральный директор ООО «Эрнст энд Янг» П.А. Лащенко

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта БНБ-Банка:
**http://bnb.by/o-banke/finansovye-pokazateli/bukhgalterskaya-otchetnostj/godovaya-otchetnostj/konsolidirovannaya-otchetnostj.html**

**Открытое акционерное общество «Белорусский народный банк»**

Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь №10 от 7 июня 2013 г.
УНП 100513485

■ Юныя творцы

# НАСТУПНЫ КРОК — ПУСЦІЦЬ У ВЫТВОРЧАСЦЬ

## Вызначаны пераможцы Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу «Млын моды»



**Усяго ў конкурсе ўдзельнічала 450 калекцый. У фінал прайшлі 100 найлепшых. Арганізатары XXVI Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу моды і фота «Млын моды» адзначаюць, што з кожным годам цікавасць да мерапрыемства расце.**
**Як і прафесіяналізм удзельнікаў.**


Фота Надзеі БУЖАН.

— Некаторыя калекцыі ўжо можна прапаноўваць на продаж, гэта дастаткова насібельнае маладзёжнае адзенне, — лічыць **старшыня журы конкурсу Святлана ГНЯДЗЁНАК.** — 26 фестываляў — гэта вялікі перыяд часу. Хочацца, каб дызайнеры здзіўлялі і эпаціравалі публіку. Мы не задаём канкрэтную тэму для творчасці — гэта значыла б спыніць паток ідэй. Якія тэндэнцыі назіраюцца ў калекцыях юных дызайнераў? Адчуваецца футурызм, фольк, моладзь выкарыстоўвае складаныя прынты.

Конкурс носіць адукацыйны характар, таму на працягу года для ўдзельнікаў праводзілі семінары па стылі, дызайне адзення, фатаграфіі.

Вызначаць найлепшых былі запрошаны беларускія і міжнародныя эксперты з Латвіі, Іспаніі, Польшчы, Расіі. **Член журы Руслан ХВАСТАЎ** — украінскі мадэльер і мастак па касцюмах — прызнаецца, што заўсёды цікавіўся беларускім дызайнам. «Я з'яўляюся арганізатарам фестывалю Ukrainian International Fashion Fest. І калі да нас прыязджалі беларусы, яны займалі прызавыя месцы. Гэта заўсёды было крэатыўна. Вашы мадэльеры выкарыстоўваюць нечаканыя матэрыялы, умеюць абыгрываць элементы фольку, — дзеліцца назіраннямі эксперт. — Мне здаецца, беларусы за апошнія гады ў плане моды змяніліся ў лепшы бок. Здорава, што ў вас падтрымліваюць айчынных вытворцаў».

Крыніцы натхнення ў сёлетніх удзельнікаў былі самыя розныя. Папулярны серыял «Гульня тронаў», афрыканскія маскі, медузы і нават Прэзідэнт Беларусі (майку з партрэтам кіраўніка дзяржавы на подыум выпусціла мадэльер з Барысава). Юныя дызайнеры спаборнічалі ў дзвюх намінацыях. У катэгорыі «Школа моды» найлепшую калекцыю адзення для дзяцей прадставіла Наталля Рубанава (Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі «Ювента» Светлагорска), для падлеткаў — Настасся Тарасава (Інстытут сучасных ведаў імя Шырокава), для мужчын — Аляксандра Ляхавец (Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт), для жанчын — Надзея Малафей (Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў). Пераможцам у намінацыі «Майстар моды» стала мінчанка Наталля Касцова.

— Галоўны прыз — удзел у міжнародных творчых майстэрнях. Летась нашы дызайнеры наведвалі Прагу, Варшаву, Кракаў. Пачуць досвед сваіх аднагодак, іх педагогаў, майстроў у галіне моды — гэта важна. Вядома, хацелася б, каб калекцыі канкурсантаў ішлі ў вытворчасць. Будзем працаваць у гэтым кірунку, — кажа **дырэктар Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Надзея ВАСІЛЬЧАНКА.**

У рамках «Млына моды» прайшоў таксама конкурс сярод фатографаў. Сёлета ён змяніў фармат. Удзельнікам трэба было прадставіць сацыяльны рэпартаж у стылі fashion. У фінал выйшла 11 работ. Юныя аўтары выбралі тэмы экалогіі, бяздомных жывёл, залежнасці дзяцей ад сацыяльных сетак. У выніку першае месца ў намінацыі «Фота» заняла Алена Марозава з Бабруйскага дзяржаўнага каледжа імя Ларына.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# ГОРАДУ — САД

## Аднаўленне гістарычнага аб'екта — старадаўняга парку — пачынаецца ў Брэсце

**Праграма падрыхтоўкі Брэста да 1000-гадовага юбілею, які мы адзначым у 2019 годзе, уключае ў сябе будаўніцтва і рэканструкцыю многіх аб'ектаў. І хоць Гарадскі сад, на жаль, не ўвайшоў у названы пералік, у кантэксце будучага святкавання гэты аб'ект асаблівы як у цэлым для горада, так і для ўсіх яго жыхароў. Па-першае, гэта яшчэ адзін парк, глыток свежага паветра, якому не спрыяе сучасны рытм жыцця, а па-другое, часцінка гісторыі, якую мы маем магчымасць ушанаваць як годныя нашчадкі.**

Гісторыя брэсцкага саду сапраўды вартая памяці. У 30-я гады XIX стагоддзя па імператарскім указе пачалі ўзводзіць крэпасць. Для гэтага прыгожы і самабытны старажытны Брэст знеслі, зруйнавалі, а крыху далей адбудавалі новы, што на афіцыйнай мове гучала як «перанеслі горад на іншае месца». І, відаць, у тым ліку каб крыху дагадзіць незадаволеным перасяленнем жыхарам, заклалі для іх месца адпачынку — Казённы сад. Так ён спачатку называўся і размяшчаўся на рагу Кветкавага бульвара і вуліцы Шасэйнай (цяпер адпаведна вуліца Леніна і праспект Машэрава). Месца для саду было выбрана не выпадкова. Тут, аказваецца, знаходзіўся помнік старажытнасці — курган старадаўняга капішча. Праўда, да нашых часоў слядоў ад таго помніка фактычна не захавалася.

Засталіся звесткі аб тым, што сад быў надзвычай прыгожы. Здзіўляла разнастайнасць дрэў і кустарнікаў, сустракаліся нават экзатычныя віды. Квітнелі бэз і акацыя, ружы, півоні. Летам заўжды гучала музыка. Выступалі і аркестры, і асобныя выканаўцы. Напрыклад, у 1914 годзе, перад самай вайной, у драўляным тэатры саду даў канцэрт кампазітар Сяргей Рахманінаў.

У 1938 годзе частка тэрыторыі трапіла пад будаўніцтва ЦЭЦ. У 40-м годзе сад наогул закрылі для наведванняў, бо ён стаў санітарна-ахоўнай зонай водазабора, у ім размяшчаліся артэзіянскія свідравіны. Дарэчы, прабіў першую свідравіну і здабыў чыстую ваду на гэтай тэрыторыі яшчэ купец Шапавалаў.

Доўга гэты сад быў закінутай, забытай усімі мясцінай. І вось, здаецца, прыйшоў яго час. Ініцыятарам адраджэння былой славутасці стаў мэр горада Аляксандр Рагачук. Канцэпцыю аднаўлення Гарадскога саду, закладзенага ў 30-я гады пазамінулага стагоддзя, стварылі інжынеры і архітэктары ААТ «Брэстжылпраект». Аўтарскі калектыў перадаў прэзентацыйныя матэрыялы на разгляд Брэсцкага гарвыканкама. Нядаўна атрымалі прынцыповае «дабро». **Дырэктар «Брэстжылпраекта» і кіраўнік аўтарскага калектыву Таццяна МАРОЗ** гаворыць, што стваральнікі канцэпцыі захавалі філасофію архітэктараў-папярэднікаў. У аснову пакладзены паважлівыя адносіны як да прыроды, так і да наведвальнікаў, тых, хто прыйдзе ў гэты парк. Сад мае стаць зонай ціхага адпачынку, без шумных забаўляльных мерапрыемстваў і адпаведных аб'ектаў.

— Да гэтага найперш абавязвае памяць. Ёсць звесткі, што менавіта тут пахаваныя ахвяры вайны 1812 года, а таксама Першай і Другой сусветных войнаў. Таму спецыялісты бачаць гарадскі сад найперш як месца сузірання, спакойнага роздуму, стасункаў з прыродай, — працягвае Таццяна Мароз.

**Галоўны інжынер праекта Наталля МАРЫЛАВА** дадае, што, паводле задумкі, сад складуць тры часткі або тры ўзроўні: верхні сад з алеяй Закаханых, сад бесперапыннага цвіцення і набярэжная ракі Мухавец.

Парк выходзіць менавіта на бераг ракі. І гэта грэх было б не выкарыстаць. Тым больш што іншага парку з арганізаваным выхадам да вады ў горадзе няма. На набярэжнай маглі б, напрыклад, «прапісацца» мастакі. Апошняе стала б «фішкай» горада. І тады можна было б гаварыць, што парк служыць эстэтычнаму выхаванню гараджан, спрыяе выхаванню культуры, лічаць аўтары канцэпцыі.

— У Гарадскім садзе паявіцца сучасная зручная інфраструктура, — расказвае Наталля Марылава. — Гаворка ідзе пра кавярні, летні тэатр, эстраду, альтанкі. Будзе шмат розных лавак, ліхтароў у стылі рэтра. Абапал веладарожак і пешаходных дарожак установяць пітныя бюветы. Прадугледжаны водаправод і зона Wi-Fi. Так што на лужку можна будзе паляжаць з кніжкай альбо планшэтам, — працягвае Наталля Леанідаўна. — З боку ЦЭЦ думаем узвесці сцяну з каменя, аплеценую раслінамі. Яна стане своеасаблівым фонам для ўсяго саду. А ў старой воданапорнай вежы размесціцца невялікі музей вады.

— Нашы архітэктары бачаць у якасці наведвальнікаў людзей розных узроставых груп, якім патрэбны адпачынак ад гарадской мітусні, прыемныя стасункі з прыродай, месца для асэнсавання быцця, — дапаўняе Таццяна Мароз. — Да распрацоўкі канцэпцыі мы падышлі з любоўю, з душой, хацелася б, каб гэты парк атрымаўся эксклюзіўным і яго палюбілі гараджане. Аўтарскі калектыў, у яго яшчэ ўвайшлі Анатоль Патоцкі, Юлія Грыднева пры ўдзеле Ірыны Хілюк, вельмі рады таму факту, што іх бачанне супадае з поглядам на названы аб'ект старшыні Брэсцкага гарвыканкама Аляксандра Рагачука. Менавіта ён паспрыяў раскрутцы гэтай кампаніі. Мэр узначаліў некалькі суботнікаў па ачыстцы тэрыторыі гістарычнага саду. А цяпер прынцыпова падтрымаў канцэпцыю архітэктараў «Брэстжылпраекта». Курыруе ўсю падрыхтоўчую работу галоўны архітэктар Брэста Мікалай Уласюк.

Вельмі хочацца спадзявацца, што праз нейкія два гады мы зможам прайсціся па старым новым Гарадскім садзе, удыхнуць глыток чыстага паветра, а можа, і паслухаць добрую музыку, як тады, сто і болей гадоў таму. І адчуць нейкую загадкавасць, імкненне да бясконцага спасціжэння новага, як і задумвалі архітэктары: «В городском саду — флейты да валторны, капельмейстеру хочется взлететь...»

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*



**Краявіды Гарадскога саду на старых паштоўках.**

■ Подыум

# Падарожжа ў мінулае

## Што прапануюць насіць дызайнеры Belarus Fashion Week?

**Пакуль мы радуемся сонечным дзянькам, на Беларускім тыдні моды прадставілі калекцыі наступнага сезона восень-зіма. На сталічным подыуме прайшло 27 паказаў жаночага, мужчынскага і дзіцячага адзення.**

Многія айчынныя дызайнеры гэты раз натхняліся модай мінулых эпох. Так, Алёна Гарэцкая звярнулася да 70-х. Сукенкі з валанамі і расліннымі прынтамі, касцюмы і паліто з аксамітным аздабленнем, трыкатажныя блузы на люрэксавай ніці, верхняе адзенне з аб'ёмнымі мехавымі гаржэткамі... Галоўны аксесуар — павязка на галаву. Час рабіць рэвізію ў шафах і шукаць, ці не заляжалася на дальніх паліцах штосьці падобнае.



bfw.by

Брэнд NELVA (Брэст) натхнілі не толькі 70-я, але і стрыманая арыстакратычная Англія канца XIX — пачатку XX стагоддзя і эпоха Адраджэння. Акрамя класічных базавых колераў, стваральнікі калекцыі зрабілі стаўку на слівавы і балотны. А неабходнай рэччу гардэроба кожнай модніцы абвясцілі блузу з яркім узорам, якая нават у самы строгі вобраз дадасць нотку ўрачыстасці.

Мадэльер Наталля Корж вырашыла здзейсніць падарожжа ў 30-я гады. Для ўбораў калекцыі «Шанхайскі экспрэс» былі выбраны аксаміт, карункі, шоўк, а асноўнымі колерамі сталі аліўкавы, фіялетавы, «хакі». Дапоўніць вобразы дам пачатку мінулага стагоддзя дапамаглі капялюшыкі, ажурныя калготкі і пальчаткі.

Дызайнер Юлія Гілевіч выбрала для сваёй калекцыі натуральныя тканіны: шоўк, віскозу, баваўну. На яе думку, сучаснай дзелавой жанчыне не абысціся без касцюмаў са штанамі і сукенак-кашуль. Іскрынкай калекцыі стаў асіметрычны крой. А дапаўняць вобраз стыльнай гараджанкі мадэльер раіць празрыстымі міні-сумачкамі на масіўным ланцужку.

У халодную пару года (сёлетняя вясна паказала, што ў гэты перыяд можна смела ўключаць і май) адзенне павінна быць перш за ўсё цёплым. Менавіта таму дызайнер Ірына Бойцік прадставіла рэчы з воўны, кашаміру, махеру і полівіскозы. Асноўныя адценні — шэры, халодны чырвоны, аранжавы, чорны, белы. А вось мадэльер Таццяна Яфрэмава выбрала для восені больш яркую палітру. Напрыклад, колеры фуксія і залаты. Любімы матэрыял дызайнера — футра, таму ён шырока выкарыстоўваецца ў калекцыі, прычым не толькі ў верхнім адзенні.

Сваё бачанне моды і нацыянальнай тэматыкі ў ёй прадставілі маладзёжныя брэнды UND і Honar. Першы стварыў калекцыю ва ўрбаністычным стылі і змясціў на адзенні меткі, прасканаваўшы якія мабільнай праграмай можна даведацца больш пра мінскія славутасці. Другі вырашыў паказаць інтэрпрэтацыю слуцкіх паясоў і паклаў іх узоры і кампазіцыю ў аснову калекцыі «Персіяна».

Увагу мужчынскай модзе ўдзяліла дызайнер Людміла Тараканава. Пад уплывам графічных работ Марка Шагала, фатаздымкаў Першай сусветнай вайны і архітэктуры канструктывізму мадэльер стварыла чорна-белую калекцыю. Ужо не першы раз Людміла Тараканава прапануе моцнай палове пераадзецца ў сукенкі і спадніцы. Але ёсць рэчы і для мужчын, пакуль не гатовых да эксперыментаў: аб'ёмныя паліто і курткі, тунікі і кашулі.

Што да дзіцячага адзення, то стыльныя ўборы для самых маленькіх на подыуме прадставілі каля 30 дызайнераў і брэндаў. Традыцыйна Kids' Fashion Days BFW носяць дабрачынны характар. Сёлета ўсе сродкі ад продажу білетаў былі накіраваныя на дапамогу падапечным РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# ПОБАЧ З ДАБРЫНЁЙ



**Гродзенскія прыгажуні выступілі перад выхаванцамі дзіцячых дамоў.**

На конкурсе «Каралева прыгажосці. Міс Гродна-2017» узнавілі традыцыю дабрачыннасці. Фіналісткі спявалі, расказвалі вершы, байкі і нават малявалі. У конкурсу знайшліся спонсары, дзякуючы якім і адбылася гэта акцыя. Яны падрыхтавалі дзецям падарункі, а прыгажуні ў сваю чаргу прадэманстравалі свае творчыя здольнасці ў намінацыі «Міс Талент».

Да акцыі далучылася і вядомая беларуская прыгажуня Святлана Крук-Кузняцова. Гродзенка мае тытулы «Міс Беларусь», «Місіс Сусвет», а ў мінулым годзе заваявала яшчэ і карону «Місіс Зямны шар». Цяпер Святлана жыве ў Маскве, але часта прыязджае з дзецьмі да сваіх бацькоў у Гродна. Маці трох дзяцей не проста ганарыцца сваімі тытуламі, але і з'яўляецца паслом Добрай волі. Яна ўдзельнічае ў многіх дабрачынных акцыях, прапагандуе сямейныя каштоўнасці, дапамагае дзецям-сіротам. І гэтым разам прывезла падарункі — мяккія цацкі і салодкія прысмакі.

У рэпертуары гродзенскіх удзельніц «Міс Гродна» знайшлося месца беларускай творчасці. Верш Пімена Панчанкі прачытала Таццяна Міхно, якая цяпер вучыцца і працуе ў Гродне. Аб конкурсе яна даведалася ад свайго сябра і вырашыла прыняць удзел у кастынгу, які сабраў больш за 60 прэтэндэнтак. Таццяне пашанцавала, і яна трапіла ў лік 16 фіналістак. Кажа, што верш беларускага паэта адпавядае яе лірычнаму настрою і заклікае да спагадлівасці, што вельмі важна паміж людзьмі.

— Раней у нас не было такой намінацыі, як «Міс Талент», але некалькі гадоў таму мы вырашылі яе ўвесці, — паведаміў арганізатар конкурсу Ігар Ляговіч. — Мы бачым, што дзяўчатам ёсць што паказаць, акрамя фізічных даных. Ды і дзеткі, якім мы робім падарункі, больш запомняць гэты дзень. Сёлета ўпершыню мы сабралі ўсіх дзетак у гродзенскай гімназіі, дзе нашы фіналісткі паказалі свае таленты.


Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

## Даты Падзеі Людзі

**20 МАЯ**

**1617** год — князем Янушам Радзівілам заснавана Слуцкая гімназія. Выкладаліся лацінская, старажытнаяўрэйская, старажытнагрэчаская, нямецкая і польская мовы, асновы логікі, рыторыкі, права, гісторыя, матэматыка, фізіка, музыка, фехтаванне, гімнастыка, спевы. Практыкаваліся дыспуты, арганізоўваліся тэатральныя пастаноўкі. Гімназія мела цесныя сувязі з універсітэтамі Кёнігсберга, Берліна, Франкфурта-на-Одэры, Эдынбурга і Оксфарда (туды пасылалі на вучобу самых лепшых выпускнікоў). У гімназію прымалі дзяцей усіх саслоўяў і веравызнанняў. Сярод выхаванцаў гімназіі былі вядомыя прадстаўнікі беларускай, рускай і польскай культуры. Гімназія дзейнічала да 1918 года.



**1742** год — расійскі палярны даследчык Сямён Іванавіч Чалюскін, праехаўшы на сабачых запрэжках больш за 6 тысяч кіламетраў, дасягнуў паўночнай ускраіны Еўразіі. У 1843 годзе гэты мыс быў названы яго імем.

**1902** год — нарадзіўся (в. Каралішчавічы, цяпер у Мінскім раёне) Язэп Пушча (Іосіф Паўлавіч Плашчынскі), беларускі паэт. Адзін з заснавальнікаў літаратурных аб'яднанняў «Маладняк» і «Узвышша». У 1930 годзе быў рэпрэсаваны. Рэабілітаваны ў 1956-м. Аўтар паэтычных зборнікаў «Дні вясны», «Песні на руінах», паэм «Песня вайны», «Крывавы плакат» і інш. На яго словы напісана шмат песень. На беларускую мову пераклаў аповесць А. Талстога «Дзяцінства Мікіты». Памёр у 1964 годзе.

**1925** год — нарадзіўся Аляксандр Андрэевіч Тупалеў, савецкі авіяканструктар, акадэмік РАН, Героя Сацыялістычнай Працы. Кіраваў стварэннем шэрагу ваенных і грамадзянскіх самалётаў. Пад яго кіраўніцтвам створаны звышгукавы стратэгічны бамбардзіроўшчык-ракетаносец Ту-160, сярэднемагістральны пасажырскі лайнер Ту-204. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Ленінскай прэміі.

**1962** год — нарадзіўся (г. Ваўкавыск) Аляксандр Дзядзюшка, акцёр тэатра і кіно. Здымаўся ў фільмах «Псеўданім «Албанец», «Афіцэры», «Сармат», «Вадзіцель для Веры», «Спецназ», «Брыгада» і іншых. Загінуў разам з сям'ёй у аўтамабільнай катастрофе ў 2007 годзе.

### Было сказана

**Георгій МАРЧУК, пісьменнік, публіцыст:**
*«Калі твае пакуты ператвараюцца ў пакуты іншых — час паміраць».*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.59 | 21.14 | 16.15 |
| Віцебск — | 4.42 | 21.10 | 16.28 |
| Магілёў — | 4.49 | 21.04 | 16.15 |
| Гомель — | 4.53 | 20.53 | 16.00 |
| Гродна — | 5.16 | 21.28 | 16.12 |
| Брэст — | 5.24 | 21.21 | 15.57 |

### Месяц

*Апошняя квадра 19 мая.*
*Месяц у сузор'і Рыбы.*

### Імяніны

***Пр.*** *Антона, Давыда, Зянона, Івана, Іосіфа, Міхаіла, Ніла, Сідара, Сцяпана, Фадзея.*
***К.*** *Вікторыі, Івоны, Хрысціны, Аляксандра, Базыля, Бернардзіна, Тодара.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Люся вельмі баіцца віскі з колай.**
**Таму што пасля віскі з колай Люся ўжо нічога не баіцца.**

— Як сказаць адным словам па-англійску «Жонка і цешча з'ехалі на дачу і ўзялі з сабой дзяцей»?
— Yes!

**Пяцігадовы хлопчык на пытанне «Кім ты хочаш стаць, калі вырасцеш?» адказваў шчыра: «Халасцяком, як дзядзька Анатоль».**
**Многія дзівіліся. Але больш за ўсіх дзівілася жонка дзядзькі Анатоля.**

— Як ты ставішся да сексу?
— Ды я яму жыццём абавязаны!



Малюнак Міколы ГІРГІЛЯ.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынга — 284 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1833.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 19 мая 2017 года.